

ШКОЛЬНІКАМ АБ ПРАВАСЛАЎНАЙ ВЕРЫ

Па благаславенні
Высокапраасвяшчэннейшага Філарэта,
Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага,
Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

Ф.А. Палачанін

Школьнікам аб праваслаўнай веры

Мінск
«Беларусь»
2006

УДК 37.034 : 271.2
ББК 74.200.51
П14

Палачанін, Ф.А.

П14 Школьнікам аб праваслаўнай веры / Ф.А. Палачанін. — Мінск, Беларусь, 2006. — 104 с.: іл.
ISBN 985-01-0675-1.

Кніга прысвечана надзённым пытанням праваслаўнай веры. Яна складаецца з пяці частак. У першую ўключаны пачатковыя звесткі аб праваслаўнай веры, у другую — цікавыя факты пра святых людзей, у трэцюю — пра іконы, чацвёртая частка прысвечана малітвам, пятая — пастам і святам.

Прапануецца вучням сярэдняга школьнага ўзросту, іх бацькам, настаўнікам, выхавацелям, выкладчыкам курсаў па рэлігіязнаўству.

УДК 37.034 : 271.2
ББК 74. 200.51

© Палачанін Ф.А., 2006
© Афармленне. УП «Выдавецтва «Беларусь», 2006

ISBN 985-01-0675-1

АД АЎТАРА

Апошнім часам у школьнікаў з'явілася цікавасць да рэлігіі. Хлопчыкі і дзяўчынкі часта наведваюць храмы, звяртаюцца да бацькоў і настаўнікаў з рознымі пытаннямі, якія іх хвалююць. Але, на вялікі жаль, яны не заўсёды знаходзяць патрэбныя адказы. Шматгадовае атэістычнае мінулае зрабіла сваю справу — зацямніла або заблытала шлях да ісціны не аднаму пакаленню людзей. І хоць хмары атэізму даўно развеяліся, але яшчэ не ўсе ўбачылі святло ісціны.

Жыццё пацвярджае народную мудрасць, што збіцца з дарогі лягчэй, чым на яе патрапіць. Асабліва цяпер, калі існуе многа розных дэструктыўных сект, кожная з якіх не толькі сцвярджае аб ісцінасці сваёй веры, але і актыўна праводзіць «захоп душ».

Толькі добра дасведчаны ў рэлігійных пытаннях чалавек сам не трапіць у гэты палон і дапаможа іншаму выйсці на правільны шлях. Такая падрыхтоўка вельмі патрэбная для тых, хто робіць першыя крокі ў самастойнае жыццё. Безумоўна, галоўным скарбам на жыццёвай дарозе з'яўляюцца веды, набытыя ў школе. Але без духоўнай падтрымкі юнакі і дзяўчаты часта збіваюцца з абранага імі шляху. Тут патрэбны дадатковыя і больш надзейныя арыенціры, якія дапамагалі б чалавеку на працягу ўсяго яго жыцця.

Надзейным арыенцірам з'яўляецца шчырая вера ў Бога. Менавіта яна дапамагае кожнаму выхаваць высокія маральныя якасці, неабходныя ў нашым грамадстве, перадолець розныя жыццёвыя цяжкасці.

Шлях да Бога няпросты. Хтосьці не можа адважыцца першы раз пайсці ў царкву. Нехта адчувае страх, няёмкасць, сорам... І зусім невыпадкова, што ў нас накапілася столькі незразумелага, многа пытанняў. Усе іх адразу задаць і пачуць адказы немагчыма. Адсюль нерашучасць і няўпэўненасць, а часам і бездапаможнасць у першых кроках да Госпада.

Чалавек, сэрца якога напоўнена нязгаснай любоўю да Бога, па-іншаму глядзіць на сябе, на людзей, на Радзіму. Для яго духоўныя арыенціры больш важныя за матэрыяльныя. Яму Радзіма заўсёды будзе даражэй, чым нейкія часовыя замежныя матэрыяльныя выгоды ці каштоўнасці.

ПАЧАТКОВЫЯ ЗВЕСТКІ АБ ПРАВАСЛАЎНАЙ ВЕРЫ

Дай, Божа, нам розум, жаданне
Паверыць, што толькі з Табой
Магчыма знайсці ратаванне
І справіцца з нашай бядой.

Айцец Іаан Міцько

ПРА СВЕТ

Усім нам падабаецца родная прырода. Яе непаўторнае хараство і прыгажосць праяўляюцца ва ўсе поры года. У кожнага чалавека ёсць свая любімая пара года, з якой ён штогод з нецярпеннем чакае сустрэчы.

Углядаючыся ў блакіт неба, мы назіраем, як плывуць воблакі і рухаецца сонейка. Вечарам ім на змену прыходзяць карагоды зорак і месячык. Цікава, што ўсё гэта адбываецца паміма волі чалавека. Як бы мы ні любілі які-небудзь час сутак або пару года, але запаволіць ці прыспешыць іх прыход не можам. Усё адбываецца па сваіх законах, якія нельга адмяніць.

А ці задумваліся вы, хто стварыў тыя законы і ўсю гэту прыгажосць, якая акружае нас? І не толькі нас. Мы ведаем, што ёсць шмат іншых краін, блізкіх і далёкіх, якія адрозніваюцца сваёй прыродай. На зямлі ёсць высокія горы, глыбокія моры, вялікія рэкі і азёры. Зямны свет цудоўны сваёй прыгажосцю. Усё ў ім напоўнена жыццём. Немагчыма злічыць усе расліны і жывыя істоты, якія насяляюць зямлю. Яны жывуць усюды: на сушы, у вадзе, у паветры, у глебе і нават глыбока пад зямлёй.

Адкуль узялося ўсё жывое на нашай цудоўнай зямлі? Хто стварыў залатое сонейка, сярэбраны месяц, прывабныя зоркі, сінія моры, бурлівыя рэкі, ціхія азёры, высокія горы? Ці праўда, што ўсё на свеце ўтварылася само па сабе? Вядома, не. Кніга ж не можа напісацца сама або дом пабудавацца. Кнігу напісаў пісьменнік, дом паставіў будаўнік, так і акаляючы нас свет мае свайго Тварца. Такім Тварцом Сусвету з'яўляецца Бог. Ён не толькі стварыў свет, але і напоўніў яго жыццём, устанавіў дзіўную гармонію, у адпаведнасці з якой усе расліны і жывёлы расселены на зямлі. Каму чым належыць харчавацца, тым і харчуюцца. Усяму дадзена пэўная і разумная мэта. Усё ў свеце нараджаецца, расце, старэе і

памірае — адно змяняецца другім. Усяму Бог даў свой час, месца і прызначэнне.

Бог надзяліў чалавека розумам, бессмяротнай душой і вялікім дарам — свабоднай воляй выбару паміж дабром і злом. Таму кожны чалавек адказвае за свае справы, учынкі, за сваё жыццё. Сэнс чалавечага жыцця — пазнаваць Бога, славіць яго, дзякаваць і прыпадабняцца Яму. Гэта значыць станавіцца ўсё лепш, наследаваць Жыццё Вечнае.

Пра Бога

Многіх цікавіць пытанне: «Ці бачыў хто Бога?» Бог адкрыў нам пра Сябе, што Ён — бесцялесны і нябачны Дух. Мы не можам убачыць думкі, любоў, надзею і многае іншае. Усё гэта духоўныя паняцці. Мы не бачым і паветра, але адчуваем яго дзеянне і праяўленне: вецер мае моцную сілу, якая здольна рухаць вялікія караблі і складаныя машыны. Мы ведаем, што дыхаем паветрам і без яго не можам жыць. Так і Бога мы не бачым, але Яго дзеянні і праяўленні, мудрасць і сілу, любоў і клопат мы бачым усюды ў свеце і адчуваем у саміх сабе. Але нябачны Бог па прычыне любові іншы раз з'яўляецца некаторым праведным людзям.

Бог сказаў Майсею: «Чалавек не можа ўбачыць Мяне і застацца жывым». Калі сонца нас асляпляе сваім бляскам і мы не можам глядзець на гэта Божае тварэнне, каб не аслепнуць, то тым больш на Бога, які стварыў яго. Бо «Бог ёсць святло, і няма ў Ім ніякай цемры», і жыве Ён у святле непрыступным.

Вялікая тайна, якую адкрыў нам Бог пра Сябе, — тайна Святой Тройцы. Бог адзін, але ў трох Іпастасях: Бог Айцец, Бог Сын і Бог Дух Святы. Усе тры Іпастасі маюць аднолькавую Божую годнасць. Няма паміж Імі ні старшага, ні малодшага. Адрозніваюцца Яны толькі тым, што Бог Айцец ні ад каго не нараджаецца і не паходзіць, Сын Божы нараджаецца ад Бога Айца, Дух Святы паходзіць ад Бога Айца. Усе тры Іпастасі Прасвятой Тройцы — Айцец, Сын і Святы Дух — вечна знаходзяцца паміж сабой у без-

упыннай любові і складаюць адну Сутнасць. Бог ёсць найбольш удасканаленая Любоў.

Бога мы называем Тварцом, таму што Ён стварыў усё, бачнае і нябачнае. Стваральнік свету нябачны, але ў нас перад вачыма Яго незлічоныя тварэнні. Бог стварыў увесь свет з нічога, адным Сваім Словам. Ён усё можа зрабіць, што пажадае.

Бога мы таксама называем Усявышнім, Уладыкам і Царом, таму што Ён Сваёй усёмагутнай воляй усё, створанае Ім, трымае ў Сваёй сіле і ўладзе, над усім уладарыць і царствуе, усім кіруе.

Бог заўсёды гатоў даць нам усялякае дабро. Ён клапоціцца пра нас больш, чым самыя добрыя бацькі пра сваіх дзяцей. Таму Бог называецца найміласэрнейшым. І мы нызываем Бога нашым Айцом Нябесным.

Богу няма роўнага нідзе — ні на зямлі, ні на небе. Мы, людзі, сваім розумам поўнасцю спасцігнуць Яго не можам. Але мы павінны быць удзячнымі Яму за ўсё: за светлую раніцу, за дождж і сонца, за радасць жыць.

ІСУС ХРЫСТОС — НАШ ЗБАВІЦЕЛЬ

Ісус Хрыстос, Сын Божы, славу нябёсаў пакінуў, каб кожны, хто ў Яго паверыць, меў жыццё вечнае і не загінуў. Нарадзіўся Ён ад Прачыстай Дзевы Марыі і жыў на зямлі як чалавек 33 гады.

Да 30 гадоў Ісус жыў у галілейскім горадзе Назарэце разам з Маці Сваёй Марыяй і Яе абручнікам Іосіфам. Іосіф быў цесляром. Ісус дапамагаў яму ў гэтай рабоце і нават сам цяслярыў.

З'явіўся Ісус на раку Іардан, дзе прыняў хрышчэнне ад Іаана Прадцечы. Пасля хрышчэння Ён правёў у пустыні ў посце і малітве 40 дзён. Там вытрымаў Ён спакусу ад д'ябла і адтуль з'явіўся ў свет з пропаведдзю пра тое, як нам жыць і што рабіць, каб увайсці ў Царства Нябеснае. Пропаведзь і ўсё зямное жыццё Ісуса Хрыста суправаджаліся шматлікімі цудамі. Нягледзячы на гэта, людзі, якіх Ісус выкрываў за іх беззаконнае жыццё, узненавідзелі Яго. Нянавісць вырасла да таго, што пасля шматлікіх пакут Ісус Хрыстос

быў распяты на Крыжы паміж двума разбойнікамі. У той час не было пакарання больш пакутнага і ганебнага.

Ісус Хрыстос, прыняўшы ўсе пакуты, памёр на Крыжы, быў пахаваны і на трэці дзень Уваскрэс, як і было прадказана прарокамі. Яго слаўнае Уваскрасенне стала сімвалам вечнасці вучэння, якое Ён прапаведаваў.

Пасля Уваскрасення на працягу 40 дзён многа разоў з'яўляўся Ісус Хрыстос вернікам і раскрываў ім тайны Царства Божага. На саракавы дзень у прысутнасці Сваіх вучняў Ён узняўся на неба, а на пяцідзесяты — паслаў Духа Святога ахрысціць іх і надаць сілу для прапаведавання Евангелля.

Ісус Хрыстос — наш Збавіцель. Яго пакуты і смерць на Крыжы былі добраахвотнай ахвярай за грахі людзей. Сваёй любоўю Ісус Хрыстос асвечвае нам шлях у Царства Нябеснае.

ПРА СВЯТЫХ АНГЕЛАЎ

Спачатку, калі яшчэ не было ні свету, ні чалавека, Бог стварыў Ангелаў. Гэта істоты разумныя, бесцялесныя, нябачныя і бессмяротныя. Бог адарыў іх сіламі і здольнасцямі вышэйшымі, чым сілы чалавека. Розум Ангелаў больш дасканалы, чым наш. Яны заўсёды радасна выконваюць Божую волю.

Бог стварыў іх незлічоную колькасць. Ангелы адрозніваюцца паміж сабой па ступені дасканаласці і па роду свайго служэння. Усяго ёсць дзевяць ангельскіх чыноў: Серафімы, Херувімы, Прастолы, Гасподзьствы, Сілы, Уладарствы, Пачаткі, Архангелы, Ангелы.

Ангелы многа разоў з'яўляліся ў вобразе прыгожых юнакоў у беласнежным, ззяючым адзенні, падпяразаным залатымі паясамі. Бог пасылае іх да людзей, каб праз іх апавясціць Сваю волю. Само слова «ангел» азначае «вястун».

Кожнаму хрысціяніну ў час хрышчэння Бог дае Ангела-ахоўніка, які нябачна ахоўвае чалавека на працягу яго зямнога жыцця ад бед і напасцей, перасцерагае ад грахоў, засцерагае ў страшны час смерці, не пакідае і пасля яе.

Ці заўсёды Ангелы-ахоўнікі знаходзяцца з намі? Слова царкоўнае сцвярджае: «Да кожнага веруючага Ангел прыходзіць, калі толькі мы самі злымі справамі не аддалім яго ад сябе».

А вось яшчэ доказ, што нашы грахі аддаляюць ад нас нашага Ангела-ахоўніка.

— Чаму ты стаіш тут і плачаш? — спытаў аднойчы прападобны Ніфант юнака, які стаяў у дзвярах аднаго дома і плакаў.

— Я Ангел, — адказаў юнак. — Гасподзь паслаў мяне на захаванне чалавека, які прабывае ўжо некалькі дзён у гэтым непрыстойным доме. Стаю тут таму, што не магу наблізіцца да грэшніка. Плачу таму, што трачу надзею прывесці яго на шлях пакаяння.

Спадзяюся, што вы пераканаліся ў той ісціне, што Ангелы-ахоўнікі пакідаюць нас, калі мы вядзём грахоўнае жыццё. Ведаючы гэта, будзем пазбягаць грахоў, як згубнай язвы, і не будзем імі абражаць і аддаляць ад сябе нашых нябачных сяброў, абаронцаў і заступнікаў. Будзем плаціць ім любоўю за любоў. Гэту любоў выявім перад імі перайманнем чысціні і святасці, пастаянным узнясеннем да іх розуму і сэрца нашага.

На іконах Ангелы выяўляюцца ў выглядзе прыгожых юнакоў у знак іх духоўнай прыгажосці. Яны крылатыя ў знак іх прабывання ў Царстве Нябесным.

ПРА ГРЭХ

Грэх або зло — парушэнне волі Божай. Іншымі словамі, грэх — гэта дрэнныя, няўгодныя Богу думкі і ўчынкі.

Як людзі сталі грашыць? Хто першы парушыў волю Божую?

Усе ангелы былі створаны добрымі. Бог даў ім поўную свабоду. Адзін з самых светлых і моцных ангелаў, самае любімае Божае тварэнне, не захацеў любіць Бога і выконваць волю Божую. Гэты ангел перастаў слухацца Бога, ва ўсім стаў праціўіцца Яму, зрабіўся ворагам Божым. Ён уцягнуў за сабой і некаторых іншых ангелаў.

За такое супраціўленне Богу гэтыя ангелы пазбавіліся дадзенага ім святла і радасці, зрабіліся злымі, цёмнымі духамі. Усе цёмныя,

злыя духі называюцца цяпер чарцямі, дэманамі і д'ябламі. Самы галоўны д'ябал — сатана.

Д'ябал навучыў і першых створаных Богам людзей — Адама і Еву — не слухацца Свайго Тварца, грашыць. За сваё непаслушэнства Адам і Ева былі выгнаны з цудоўнага райскага саду Эдэма. Перадаючыся з пакалення ў пакаленне, грэх завалодаў людзьмі і ўсіх падпарадкаваў сабе. Усе людзі — адны больш, другія менш — грэшныя.

У апошні час шмат людзей, у тым ліку і школьная моладзь, вераць у розныя забабоны. Нават сродкі масавай інфармацыі часта навязваюць нам «шчаслівыя» і «нешчаслівыя», «цяжкія» і «лёгкія» дні. Многія вераць усялякім прыкметам, снам, тлумачаць іх, варожаць на іх, даходзяць да стану душэўнай хваробы і зацямнення розуму.

Забабоны засталіся ад далёкіх продкаў-язычнікаў. Гэтыя «традыцыі», нягледзячы на тысячагадовае існаванне хрысціянства, укараніліся ў свядомасці людзей. Чалавек так заблытваецца ў д'ябальскіх сетках, што часам не ведае, як яму адтуль выбрацца.

Асабліва распаўсюджана сярод людзей вера ў лёс. Кожны праваслаўны хрысціянін павінен ведаць, што на ўсё ёсць воля Божая. Гасподзь кожнаму прадвызначыў лёс яго ў цяперашнім часовым і ў будучым вечным жыцці на аснове таго, як чалавек, які валодае свабоднай воляй, будзе паводзіць сябе ў зямным жыцці.

Грэх выкарыстоўваць і заклінанні, якія прапануюцца нам праз розныя нецаркоўныя газеткі і часопісы акультнага накірунку, а таксама «магічныя» кніжкі.

Грахом лічыцца прыпісванне звышнатуральнай сілы розным прадметам (талісманам), якія не могуць мець ніякага ўплыву на дабрабыт чалавека. У праваслаўнага хрысціяніна ёсць надзейныя ахоўнікі ад няшчасця. Гэта нацельны крыжык і частая засцярога сябе знакам крыжа, гэта святая ікона, малітоўная думка пра Ангела-ахоўніка.

Хрысціянін павінен вызваляцца ад забабонаў, прыкмет, бо гэта грэх супраць першай запаведзі Закона Божага. Сваімі сіламі мы не заўжды можам перамагчы грэх. Цяжка чалавеку, які трапіў у балота, выцягнуць сябе за валасы. Дапамагчы нам пазбавіцца ад грахоў можа толькі Той, Хто стварыў нас. Вось для гэтага Бог Айцец і паслаў на зямлю свайго Сына Ісуса Хрыста — нашага Збавіцеля. Каб людзям лягчэй было вызваліцца ад граху, Ісус Хрыстос устанавіў на зямлі Сваю Святую Царкву.

ПРА КРЫЖ І ЗНАК КРЫЖА

З таго часу, як бязгрэшны Ісус Хрыстос памёр на Крыжы і на трэці дзень уваскрэс, Крыж стаў прадметам вялікай пашаны ў хрысціян, сімвалам перамогі Хрыстовай над грахом і смерцю. Так Сын Божы Крыжам Сваім — пакутамі і смерцю на Крыжы за грахі ўсіх людзей свету — перамог не толькі грэх, але і саму смерць.

Насіць нацельны крыжык — не толькі абавязак праваслаўнага хрысціяніна, але і асаблівая яго заслуга і гонар. Калі мы з просьбай у малітве звяртаемся да Бога, то павінны перахрысціцца. Для гэтага трэба скласці тры пальцы правай рукі разам, а два астатнія — прыгнуць да далоні. Тры пальцы, складзеныя разам, паказваюць нашу веру ў Бога Айца, Бога Сына і Бога Духа Святога, як Адзінародную і непадзельную Тройцу. Два пальцы, прыгнутыя да далоні, азначаюць дзве сутнасці Ісуса Хрыста — Божую і чалавечую. Складзенымі так пальцамі мы дакранаемся да лба для асвячэння розуму, затым — да сярэдзіны жывата для асвячэння нашых унутраных пачуццяў, а пасля — да правага і левага пляча — для асвячэння нашых сіл цялесных.

Знак крыжа дае нам вялікую сілу адганяць і перамагаць зло, тварыць дабро. Хрысціцца трэба ў пачатку малітвы, у час яе і пасля заканчэння, а таксама пры набліжэнні да ўсяго святога: калі ўваходзіш у храм, калі пакланяешся Крыжу, іконе і т.п. Хрысціцца трэба і ва ўсіх важных выпадках нашага жыцця: у небяспецы, у горы, у радасці і г.д.

Калі мы хрысцімся, то ў думках прагаворваем: «У імя Айца, і Сына, і Святога Духа. Амінь», выражаючы гэтым нашу веру ў Прасвятую Тройцу і наша жаданне жыць на славу Божую. Слова «амінь» азначае «сапраўды, хай будзе так».

ПРА ХРАМ

Храм — Божы дом, у якім адпраўляюцца Богаслужэнні. У храме прысутнічае асаблівая міласць Божая. Яна падаецца нам праз свяшчэннікаў, якія адпраўляюць Богаслужэнне.

Знешні выгляд храма адрозніваецца ад звычайнага будынка архітэктурай. Храм завяршаецца купалам, над якім ставіцца Крыж у славу Ісуса Хрыста. Над уваходам у храм звычайна размяшчаецца званіца, г. зн. вежа, на якой вісяць званы. Праваслаўныя храмы часта будаваліся ў форме карабля: свет — бурнае жыццёвае мора, храм — карабель, у якім можна яго пераплыць. Многа ёсць храмаў у форме крыжа— асновы нашага збаўлення. Сустракаюцца храмы і ў форме круга — сімвала вечнасці.

Пры ўваходзе ў храм знадворку прыбудоўваецца цвінтар. Усярэдзіне храм раздзяляецца на тры часткі: прытвор, сярэдняя частка храма, дзе стаяць вернікі, і алтар. Самая галоўная частка храма — алтар. Там святарамі і свяшчэннаслужыцелямі адпраўляюцца Богаслужэнні і знаходзіцца самае святое месца ва ўсім храме — святы прастол, на якім адпраўляецца Таінства святога Прычашчэння.

У храме ўсё ўладкавана так, каб дапамагаць людзям маліцца, абуджаць духоўныя, узвышаныя пачуцці. На сценах многа ікон, на якіх выяўляюцца Ісус Хрыстос, Прасвятая Багародзіца, Ангелы, Святыя. Пасярод храма стаіць аналой — пераносны высокі столік з прыгожым пакрывалам. На ім у святочныя дні знаходзіцца ікона свята, а ў звычайны дзень — ікона храма.

Перад алтаром — іканастас, гэта сімвал Неба. Дзверы ў цэнтры іканастаса называюцца Царскімі Варотамі, таму што праз іх Сам Ісус Хрыстос нябачна праходзіць у святых дарах. Таму праз Царскія Вароты нікому не дазваляецца праходзіць, акрамя свяшчэннаслужыцеляў. Верх іканастаса ўвенчаны Крыжам, які азначае злучэнне ўсіх хрысціян з Хрыстом і паміж сабой.

Паводзіны ў храме

Праваслаўны храм — святое месца, гэта дом Цара Нябеснага. Мы павінны ўваходзіць у храм ціха і з глыбокай пашанай, тройчы перахрысціўшыся і пакланіўшыся, з малітваю. Паводзіць сябе ў храме трэба прыстойна, так, каб не абразіць вялікасць святыні, не наклікаць на сябе гнеў Божы.

Прыходзіць на службу патрэбна загадзя, за 5—10 хвілін. Пры ўваходзе мужчыны здымаюць галаўныя ўборы. У храме звычайна мужчыны стаяць з правага боку, а жанчыны — з левага. Жанчыны ўваходзяць у храм з пакрытай галавой і апранутыя адпаведна свайму полу, на твары ніякай касметыкі. Хрысціянін заўсёды павінен насіць нацельны крыжык.

У час Богаслужэння нельга размаўляць, а тым больш смяяцца. Нельга паварочвацца спіной да алтара. Кожны павінен стаяць на сваім месцы і не пераходзіць з аднаго месца на другое. Нельга трымаць рукі ў кішэнях, нешта жаваць.

Ставіць свечкі і прыкладвацца да ікон трэба так, каб не перашкодзіць іншым вернікам.

Прыйшоўшы ў храм з дзецьмі, нельга дазваляць ім бегаць і смяяцца. Калі дзіця расплакалася, трэба пастарацца супакоіць яго, а калі гэта не ўдаецца, неабходна выйсці з ім з храма.

Прысесці і адпачыць у храме дазваляецца толькі ў выпадку нездароўя або моцнай стомленасці. Калі ўсе вернікі становяцца на калені, трэба далучыцца да іх.

На царкоўным цвінтары нельга курыць.

Нельга ўваходзіць у храм з жывёламі або птушкамі.

Недапушчальна хадзіць і размаўляць у час чытання Евангелля, спявання «Херувімскай» — Еўхарыстыйнага канона на літургіі. У гэты час таксама непажадана ставіць свечкі і прыкладвацца да ікон.

Трэба заставацца ў Царкве да заканчэння Богаслужэння. Адыходзіць раней часу можна толькі пры недамаганні або па сур'ёзнай неабходнасці.

Пасля заканчэння літургіі патрэбна падысці і прыкласціся да Крыжа, які дае веруючым святар каля алтара. Выходзячы з храма, трэба тры разы перахрысціцца і пакланіцца.

Свечка

Немагчыма ўявіць сабе праваслаўны храм, у якім не запальваюць свечак. З маленькай васковай свечкі пачынаецца наша далучэнне да хрысціянскага абраду.

Тлумачальнік літургіі блажэнны Сімяон Салунскі (XV ст.) гаварыў, што чысты воск азначае чыстату людзей, якія яго прыносяць. Ён прыносіцца ў знак нашага раскаяння ва ўпартасці і самавольстве. Мяккасць і падатлівасць воску гавораць пра нашу гатоўнасць пакарыцца Богу. Гарэнне свечкі азначае абпальванне чалавека, яго пераўтварэнне ў новую якасць дзеяннем агню Божай любові.

Свечка — гэта сведчанне веры, дачынення чалавека да Божага святла. Яна перадае полымя нашай любові да Госпада, Прасвятой Багародзіцы, Ангелаў або Святых. Нельга ставіць свечку фармальна, з халодным сэрцам. Знешняе дзеянне павінна быць дапоўнена малітвай, хоць бы самай простай, сваімі словамі.

Запаленая свечка прысутнічае на царкоўных службах. Яе трымаюць у руках пры здзяйсненні Таінства Хрышчэння і Таінства Шлюбу. Сярод мноства запаленых свечак адпраўляецца чын адпявання. Прыкрываючы аганёк свечкі ад ветру, вернікі ідуць на хрэсны ход.

Няма абавязковых правіл, куды і колькі ставіць свечак. Іх набыццё — малая ахвяра Богу, добраахвотная і няцяжкая. Вялікая свечка зусім не лепш за маленькую.

Тыя, хто спраўна наведваюць храм, стараюцца кожны раз паставіць некалькі свечак: да святочнай іконы, якая ляжыць на аналоі пасярод царквы; да вобраза Збавіцеля або Багародзіцы — за здароўе сваіх блізкіх; да Распяцця на прамавугольны столік-падсвечнік — за спачын памерлых. Калі жадае сэрца, можна паставіць свечку любому святому ці святым.

Калі-небудзь здараецца так, што ў падсвечніку перад іконай няма свабоднага месца, усё занята запаленымі свечкамі. Тады не варта дзеля ўласнай свечкі гасіць іншую, лепш папрасіць служыцеля паставіць яе ў зручны час. І не трэба хваляваца, што вашу недагарэўшую свечку патушылі пасля заканчэння службы — ахвяра ўжо прынята Богам.

Не трэба слухаць размовы пра тое, што свечку належыць ставіць толькі правай рукой; што, калі яна пагасла — значыць, будзе няшчасце; што аплаўляць ніжні канец свечкі для ўстойлівасці ў лунцы — смяротны грэх, і г.д. Каляцаркоўных забабонаў многа, і ўсе яны бессэнсоўныя.

Сама па сабе свечка не вызваліць ад грахоў, не злучыць з Богам. Яна мае сімвалічнае значэнне, але нас збаўляе не сімвал, а сапраўдная сутнасць — Боская ласка.

Кадзіла пахучае

Кадзіла — адзін з сімвалаў праваслаўнага Богаслужэння. З апостальскіх часоў адбываецца каджэнне ў час малітвы. У металічную кадзільніцу на распаленыя вугалі кладзецца духмяная смала ўсходніх дрэў — ладан. Згараючы, ён утварае пахучы дым — фіміям.

Традыцыя спальвання ахвяры перад Богам з'явілася на Зямлі ў старажытныя часы. Дастаткова ўспомніць ахвяру праведнага Авеля. Сам Гасподзь у Старым Запавеце загадаў Майсею зрабіць у скініі асобы ахвярнік для свяшчэннага курэння араматычных рэчываў. Мудрацы, якія прыйшлі пакланіцца Хрысту, сярод іншых дароў паднеслі Богадзіцятку ладан. Евангеліст Іаан Багаслоў бачыў у Адкрыцці Ангела ў Нябесным храме. Ангел прымаў залатую кадзільніцу.

Як тлумачаць Святыя Айцы, агонь, як рэчыва, якое спальвае і саграваe, уяўляе сабой Бажаство. Таму агонь кадзільных вугалёў азначае Божае паходжанне Хрыста, само рэчыва вугалю — Яго чалавечае паходжанне, а ладан — людскія малітвы Богу. Кадзільніца — вобраз Багародзіцы. У многіх малітвах Прачыстая называецца кадзілам пахучым.

Перад пачаткам каджэння свяшчэннік вымаўляе малітву: «Кадило Тебе приносим, Христе Боже наш, в воню (запах) благоухания духовного, еже прием в пренебесный мысленный Твой жертвенник, возниспосли нам благодать Пресвятаго Твоего Духа». Дым кадзіла азначае нябачную прысутнасць Боскай ласкі, якая духоўна ўмацоўвае душы вернікаў.

Богаслужэбнае каджэнне бывае поўным, калі ахоплівае ўвесь храм, і малым, калі кадзяць алтар, іканастас і людзей, што стаяць каля амбона. Калі адбываецаа каджэнне ікон, храма, яно адносіцца да Бога. Яму аддаюць належную пашану і хвалу. Калі кадзіла накіроўваецца на людзей, гэтым сведчыцца, што Дух Святы спускаецца на ўсіх вернікаў, якія носяць у сабе вобраз Божы. Па традыцыі ў адказ на каджэнне прынята кланяцца.

Як рыхтавацца да Святога Прычашчэння

Да Таінства Святога Прычашчэння неабходна падрыхтаваць сябе малітвай, постам, пакорнымі па-хрысціянску паводзінамі і настроем, а таксама споведдзю.

Той, хто жадае дастойна прычасціцца Святых Хрыстовых Тайнаў, павінен за два-тры дні малітоўна падрыхтаваць сябе да гэтага: больш маліцца дома раніцай і вечарам, наведваць царкоўныя Богаслужэнні. Напярэдадні Прычашчэння трэба абавязкова быць на вячэрняй службе. Дома прачытаць каноны: пакаянны Госпаду Ісусу Хрысту, малебны да Прасвятой Багародзіцы, Ангелу-ахоўніку, а таксама Паследаванне да Святога Прычашчэння.

З малітвай спалучаецца ўстрыманне ад скаромнай ежы — мяса, яек, малака і малочных прадуктаў, а ў строгі пост — і ад рыбы.

Той, хто жадае прычасціцца, павінен, лепш за ўсё напярэдадні вячэрняга Богаслужэння, да яго або пасля шчыра пакаяцца ў сваіх грахах, чыстасардэчна раскрываючы перад свяшчэннікам сваю душу. Перад споведдзю трэба абавязкова памірыцца са сваімі крыўдзіцелямі, а таксама з тымі, каго пакрыўдзіў сам, пакорліва папрасіць прабачэння.

На споведзі лепш не чакаць пытанняў свяшчэнніка, а выказаць яму ўсё, што ёсць на сумленні, ні ў чым сябе не апраўдваючы і не перакладваючы віну на іншых. Ні ў якім выпадку на споведзі нельга асуджаць каго-небудзь або расказваць пра чужыя грахі.

Калі няма магчымасці паспавядацца вечарам, трэба зрабіць гэта да пачатку літургіі, у крайнім выпадку — да Херувімскай песні. Без споведзі ніхто, акрамя дзяцей да 7 гадоў, не можа быць дапушчаны да Святога Прычашчэння.

Ёсць добры звычай — пасля споведзі і да Святога Прычашчэння не есці, не піць і не курыць. Безумоўна, гэта забараняецца пасля поўначы. К Прычашчэнню трэба падыходзіць строга нашча, склаўшы рукі накрыж (правую на левую). Да Чашы трэба падыходзіць з глыбокай пашанай і страхам Божым. З верай і любоўю да Хрыста прычасціцца Яго Святых Цела і Крыві, пацалаваць спод Чашы, але не хрысцячыся і асцярожна, каб выпадкова не штурхнуць яе, затым адысці да століка і запіць Прычашчэнне цеплатай. Пасля Прычашчэння трэба паслухаць або прачытаць з увагай падзячныя малітвы.

Благаславенне святара

Кожны раз, калі вам належыць пачаць важную справу (пачатак навучальнага года, экзамен, лячэнне, пераезд і інш.), папрасіце благаславення ў бацюшкі.

Благаславенне — гэта асяненне нас знакам Крыжа Самім Госпадам Ісусам Хрыстом праз святара. Калі святар благаслаўляе нас, ён складвае пальцы так, каб яны ўяўлялі сабой літары ІС. ХС (г. зн. Ісус Хрыстос). Благаславенне святара мы павінны прымаць з глыбокай пашанай.

Калі мы ў храме чуем словы благаславення «мір усім», у адказ на іх павінны пакланіцца. А каб атрымаць асобна для сябе благаславенне ад епіскапа або святара, трэба скласці рукі накрыж — правую на левую, далонямі ўверх. Атрымаўшы благаславенне, мы цалуем руку, якая нас благаславіла, — нібы нябачную руку Самога Хрыста Збавіцеля.

Чаму мы называемся праваслаўнымі хрысціянамі

Слова «праваслаўе» абазначае правае, правільнае Богапазнанне. Мы называемся праваслаўнымі хрысціянамі таму, што верым у Бога так, як навучыў нас верыць Сам Сын Божы, Гасподзь наш Ісус Хрыстос. Мы верым так, як выкладзена ў «Сімвале веры» (гэта кароткі і дакладны выклад ісцін хрысціянскай веры). Мы належым да заснаванай на зямлі Самім Збавіцелем Адзінай, Святой, Саборнай і Апостальскай Царквы, якая пад кіраўніцтвам Духа Святога нязменна правільна і слаўна захоўвае вучэнне Ісуса Хрыста, гэта значыць, належым да Праваслаўнай Хрыстовай Царквы.

Благадатны Агонь Велікодны

Па амаль ужо двухтысячагадовай традыцыі напярэдадні Вялікай Суботы перад Вялікаднем гасяцца ўсе агні ў храме Уваскрасення Хрыстова, што ў Іерусаліме. У дзень Вялікай Суботы, каля гадзіны дня, Іерусалімскі Патрыярх уваходзіць у пячору Жываноснай Труны Гасподняй з пучком з трыццаці трох незапаленых свечак і адпраўляе малітву. Праз некалькі хвілін, а іншы раз і гадзін з неба спускаецца Благадатны Агонь. Спачатку ён з'яўляецца ў выглядзе бела-жоўта-блакітных бісерынак, якія з'яўляюцца на Труне Гасподняй. У адзін момант запальваюцца лампады ў пячоры.

Ад Нябеснага Агню Патрыярх запальвае свечкі і перадае яго багамольцам, якія запаўняюць храм. Агонь гэты незвычайны, бо адразу пасля дзівоснага сыходжання ён зусім не апякае (ім «мыюцца», вылечваюць раны, запальваюць паходныя лампады). Гэты цуд працягваецца каля 10—15 хвілін. Потым агонь становіцца такім, які апякае. Увесь храм у гэтыя свяшчэнныя хвіліны знаходзіцца ў стыхіі Велікоднага Агню. Маланка, раса́, гром, незвычайны прыемны пах, свежая прахалода, свячэнне ікон — усё гэта бачаць штогод тысячы паломнікаў, якія збіраюцца ў Іерусаліме з усяго свету.

Аднойчы іншаверцы вырашылі завалодаць Благадатным Агнём, а праваслаўных не дапусцілі да Труны Гасподняй. Яны стаялі і маліліся каля храма. І вось, калі іншаверцы некалькі гадзін чакалі цуда на Труне Гасподняй, Благадатны Агонь неспадзявана з'явіўся з калоны храма, дзе маліліся праваслаўныя, і запаліў свечкі Патрыярха і людзей. Па сённяшні дзень кожны наведвальнік храма Уваскрасення Хрыстова ў Іерусаліме можа асабіста пераканацца ў гэтым цудзе.

Благадатны Агонь Велікодны — адзін з бясспрэчных доказаў Божага знака праўдзівасці праваслаўнай веры. Гэты Агонь спускаецца толькі па малітве праваслаўнага Патрыярха.

Тысячы праваслаўных жыхароў Беларусі былі ўдзельнікамі перанясення Благадатнага Агню з Іерусалімскага храма ў кафедральны Свята-Духаў сабор горада Мінска. Там ён гарыць як наглядны доказ праўдзівасці Святой Праваслаўнай Царквы. Штогадовая асветніцкая экспедыцыя падарожнічае па Беларусі, пераносячы па храмах у лампадзе Благадатны Агонь ад Труны Гасподняй.

ЧАМУ ПРАВАСЛАЎНЫЯ БОГАСЛУЖЭННІ ВЯДУЦЦА НА ЦАРКОЎНАСЛАВЯНСКАЙ МОВЕ

На нашай зямлі праваслаўныя Богаслужэнні вядуцца на мове святых Кірылы і Мяфодзія. Гэта мова святой Еўфрасінні Полацкай, святых Кірылы Тураўскага і Афанасія Брэсцкага, Францішка Скарыны і нашых прадзедаў.

Царкоўнаславянская мова лепш перадае пульс рэлігійнага жыцця, больш глыбока выказвае малітоўныя пачуцці, чым сучасныя мовы. Яна больш прыстасавана для выказвання з'яў і дынамікі духоўнага жыцця. Гэта першая і галоўная прычына захоўвання царкоўнаславянскай мовы ў праваслаўным Богаслужэнні.

Другая прычына — цяжкасць перакладу. Богаслужэбныя тэксты — шэдэўры свяшчэннай паэзіі асобага тыпу і парадку. Перакладчык павінен адначасова мець глыбокую філалагічную падрыхтоўку і валодаць выдатным паэтычным дараваннем. Без гэтага пераклад богаслужэбных кніг будзе абясколерным і празаічным перакладам вялікіх паэм. Акрамя таго, перакладчыку неабходна ведаць багаслоўе святых Айцоў Царквы, каб зразумець глыбокія па дагматычнаму зместу літургічныя тэксты. І нарэшце, самае галоўнае, перакладчык павінен мець жывую веру, царкоўнасць і рэлігійную інтуіцыю, якая дала б магчымасць адчуць і перажыць кожную фразу, кожнае слова перакладаемага тэксту.

Трэцяя прычына — традыцыя, якая з'яўляецца крышталізацыяй гісторыі. Гэта актуалізацыя быцця мінулага ў цяперашнім. Любоў і павага да мінулага дазволілі захаваць да нашых дзён старажытныя саборы і храмы ў іх першапачатковай велічы, іконы і фрэскі дзівоснай духоўнай глыбіні. Жывая традыцыя данесла да нас дзіўнае, непаўторнае праваслаўнае Богаслужэнне. Гэта бясцэнны скарб, вялікі патэнцыял духоўных сіл і энергіі, якія мы павінны захаваць не толькі для сябе, але і для будучых пакаленняў.

Святня

О колькі іх, братоў, сясцёр,
Жыццё за Госпада аддалі,
У Божы храм святы Хрыстоў
Свае каменьчыкі паклалі.

А. Дылюк

Пра святых

Святымі называюць людзей, якія, жывучы на зямлі, дагадзілі Богу сваім праведным жыццём. Святымі яны сталі з Боскай ласкі Святога Духа, якую набылі. Але як можна набыць тое, чаго не бачыш? Сапраўды, Боскую ласку нельга ўбачыць, таксама як Духа Святога, Які пастаянна зыходзіць ад нябачнага Бога Айца. Але можна адчуць незвычайную ціхую радасць, шчасце... Словамі гэта цяжка перадаць. Такі стан бывае ў нас, грэшных, у час шчырай малітвы. Але гэта працягваецца нядоўга. А ў святых Боская ласка Святога Духа знаходзіцца пастаянна і асвячае не толькі пачуцці, думкі, але і цела. Таму іх мошчы нятленныя.

Выконваючы самую галоўную запаведзь: палюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім і ўсёй душою тваёю... і бліжняга твайго, як самога сябе, праведнікі станавіліся «зямнымі Ангеламі і Нябеснымі чалавекамі...»

У адпаведнасці са сваім служэннем святыя маюць розныя назвы: пракокі, апосталы, свяціцелі, мучанікі, прападобныя, дабраверныя, праведнікі, блажэнныя, бяссрэбранікі.

Пракамі называюцца святыя, якія па ўнушэнні Святога Духа прадказвалі будучае, пераважна пра Збавіцеля. Яны апавяшчалі волю Божую, вучылі людзей праўдзівай веры і набожнасці, рабілі розныя знакі і цуды. Жылі прарокі да прышэсця Збавіцеля на зямлю.

Апосталы — найбліжэйшыя вучні Ісуса Хрыста, якіх Ён у час Свайго зямнога жыцця пасылаў на прапаведзь і якія пасля сашэсця на іх Святога Духа прапаведавалі па ўсіх краінах хрысціянскую веру. Спачатку іх было дванаццаць, а потым яшчэ семдзесят.

Свяціцелямі называюцца галоўныя духоўныя кіраўнікі Праваслаўнай Царквы (епіскапы, архіепіскапы, мітрапаліты, патрыярхі),

якія неслі людзям праваслаўную веру і дагадзілі Богу сваім праведным жыццём.

Мучанікі — хрысціяне, якія за веру ў Ісуса Хрыста прынялі страшэнныя мукі і нават смерць.

Прападобныя — праведныя людзі, якія аддаліліся ад мірскога жыцця і дагадзілі Богу, прабываючы ў нявіннасці (гэта значыць не ўступаючы ў шлюб), посце і малітве, жывучы ў пустынях і манастырах.

Дабраверныя — знатныя людзі царскага або княжага паходжання, якія дагадзілі Богу сваім праведным жыццём.

Праведныя — хрысціяне, якія вялі праведнае, угоднае Богу жыццё, жывучы, падобна нам, у свеце, будучы сямейнымі людзьмі.

Блажэнныя — людзі, якія добраахвотна выбралі асобы шлях выратавання душы. Прабываючы ў безупыннай малітве, яны пакорна цярпелі голад, холад і прыніжэнне.

Бяссрэбранікі — святыя, якія атрымалі ад Бога дар ацалення ад хвароб і служылі бліжнім дармовым лячэннем.

Усе святыя, прабываючы на Небе, моляцца за нас Богу, дапамагаюць тым, хто жыве на зямлі.

Святы прарок Ілія

З юных гадоў святы прарок Ілія прысвяціў сябе Богу, жыў, як Ангел, бязгрэшны душой і целам. Ён знаходзіў сабе ціхае месца, дзе падоўгу маліўся Госпаду. Не раз Гасподзь міласціва гутарыў з Іліёй, які заўсёды атрымліваў ад Бога тое, што прасіў.

У той час у Ізраілі ўладарыў самы бязбожны цар Ахаў. У яго была жонка-язычніца Іезавель. Яна пераканала мужа пакланяцца ідалу Ваалу (Сонцу), пабудаваць яму храм і знішчыць людзей, якія пакланяліся праўдзіваму Богу.

Ілія быў сведкам таго, як ізраільцяне пакінулі жывога Бога, як пачалі пакланяцца мёртвым ідалам. За гэта Гасподзь пасылаў кару. Ілія абуджаў пакаянне ў сэрцах людзей. Ён заклікаў усіх вярнуцца да жывога Бога. Ілія прыйшоў да Ахава і ад імя Збавіцеля аб'явіў:

«За твае грахі ў гэтыя гады не будзе ні дажджу, ні расы, пакуль я не вымалю іх у Госпада».

Так і здарылася. Пачалася страшная засуха, нават трава загінула, і настаў голад. Ахаў шукаў Ілію і хацеў яго пакараць. Гасподзь сказаў Іліі, каб асцерагаўся ўладара Ізраіля. Збавіцель падказаў Іліі месца, дзе ён павінен схавацца. Гэта была пустыня каля ручая. Бог загадаў груганам прыносіць прароку хлеб і мяса штодня раніцай і вечарам. Смагу ён праганяў вадою з ручая.

Калі ручай высах, Гасподзь загадаў прароку ісці ў язычніцкі горад Сарэпту Сідонскую да беднай удавы і жыць у яе. Удава жыла са сваім сынам, і ў яе заставаліся толькі жменя мукі і трохі масла. Прыйшоўшы ў Сарэпту, Ілія сказаў удаве, каб спякла для яго праснак, і паабяцаў, што мукі і масла не будзе меншаць, пакуль не дасць Гасподзь дажджу на зямлю. Жанчына паверыла прароку Божаму і зрабіла так, як ён сказаў. Мука і масла ў яе не змяншаліся. Неўзабаве ў гэтай удавы захварэў сын і памёр. Прарок Ілія тройчы памаліўся над ім Богу, і хлопчык ажыў.

Тры з паловай гады працягвалася засуха. Ілія па загаду Божаму зноў прыйшоў да Ахава. Гарачай пропаведдзю і вялікімі цудамі схіліў аблудны народ і самога Ахава да пакаяння. Тады па малітвах Іліі неба зрабілася цёмным ад хмар, і пайшоў вялікі дождж. Голад закончыўся.

Ілія па ўказанні Госпада памазаў у прарокі Елісея, які потым стаў вучнем яго. Аднойчы, калі яны ішлі разам, Ілія сказаў Елісею:

— Пакуль Я з табою, прасі Мяне, аб чым хочаш.

— Дух, які ў Табе, няхай будзе на Мне ўдвайне,— адказаў Елісей.

— Многа ты просіш, але калі ўбачыш, як Я буду ўзяты ад цябе, то атрымаеш, — сказаў Ілія.

Яны пайшлі далей. Раптам з'явілася вогненная калясніца. Ілія памчаўся ў віхры на неба. Елісей, убачыўшы гэта, усклікнуў:

— Айцец мой, айцец мой, калясніца Ізраіля і конніца яго!

Словы прарока Елісея азначалі, што святы прарок Ілія сваімі малітвамі абараняў царства Ізраільскае ад ворагаў лепш, чым усё войска ізраільскае — калясніцы і конніца яго. У гэты момант да ног Елісея ўпала верхняя вопратка Іліі. Елісей падняў яе і атрымаў двайны дар прароцтва.

Святы апостал Андрэй Першазваны

Святы апостал Андрэй Першазваны спачатку быў вучнем Іаана Прадцечы. Пасля Хрышчэння Госпада ён пакінуў Іаана Хрысціцеля і першым з апосталаў зрабіўся паслядоўнікам і вучнем Хрыста.

Пасля Уваскрасення Хрыста і сашэсця Святога Духа на апосталаў святы Андрэй адправіўся ў розныя краіны і гарады прапаведаваць Евангелле. У кожным горадзе яго чакалі смутак і пакуты, але, падмацаваны ўсёмагутнай Боскай ласкай, ён цярпеў усё гэта з радасцю.

Паводле царкоўнага падання, святы апостал Андрэй прапаведаваў і на Рускай зямлі. Прыйшоўшы на месца, дзе цяпер стаіць Кіеў, ён благаславіў Рускую зямлю і ўстанавіў крыж, сказаўшы: «На гэтых гарах заззяе ласка Божая; вялікі горад будзе тут, і Гасподзь збудуе многа цэркваў і прасвяціць святым хрышчэннем усю Рускую зямлю».

Святы апостал Андрэй, прайшоўшы яшчэ многія краіны, адправіўся ў грэчаскі горад Патры і ўсіх яго жыхароў павярнуў да Хрыста, здзейсніўшы пры гэтым многа дзівосных ацаленняў. Але мясцовы правіцель, схапіўшы апостала, стаў яго мучыць, прымушаючы адрачыся ад Госпада. Святы Андрэй славіў Бога. Тады валадар загадаў распяць яго на крыжы, прывязаўшы за рукі і ногі. Але святы Андрэй і з крыжа павучаў народ. Раптам на вачах ва ўсіх заззяў нябесны свет вакол святога так, што немагчыма было глядзець. Гэта ззянне працягвалася з паўгадзіны, пакуль святы апостал не памёр.

Збылося прадказанне святога Андрэя. Русь прасвяцілася Святым Хрышчэннем і не забыла свайго першага апостала.

Святыя першавярхоўныя апосталы Пётр і Павел

Апосталы Пётр і Павел называюцца першавярхоўнымі за асабліва руплівае распаўсюджванне веры Хрыстовай.

Апостал Пётр — адзін з дванаццаці апосталаў, блізкі вучань Ісуса Хрыста. Сапраўднае імя святога Пятра Сімон. Ісус даў яму новае імя Кіфа, або Пётр, гэта значыць камень, на якім Збавіцель абяцаў заснаваць Сваю Царкву. Сімон першым прызнаў Ісуса Месіяй, Сынам Божым.

Апостал Пётр прапаведаваў слова Божае ў розных краінах і пры гэтым здзяйсняў вялікія цуды: уваскрашаў мёртвых, вылечваў хворых словам і нават ценем сваім. Па ўнушэнні Духа Святога напісаў два Саборныя Пасланні, якія ўвайшлі ў Біблію. Апостал Пётр быў першым рымскім епіскапам і першым, хто хрысціў язычнікаў у імя Ісуса Хрыста. За веру Хрыстову ён быў распяты на крыжы (па яго просьбе — уніз галавой).

Справу святога апостала Пятра прадоўжыў святы апостал Павел. Яго называюць апосталам язычнікаў за тое, што ён павярнуў да Хрыста мноства людзей з розных краін. Святы Павел ад нараджэння меў яўрэйскае імя Саўл і рымскае Павел. Саўл атрымаў выдатную адукацыю ў школе знакамітага яўрэйскага рабіна (настаўніка) Гамаліїла і меў рымскае грамадзянства.

У юнацкім узросце Саўл быў ганіцелем Хрыстовай Царквы. Тады ён думаў, што хрысціяне памыляюцца, ілжыва гавораць пра Хрыста. І ён, дыхаючы нянавісцю супраць хрысціян, паспяшаўся ў Дамаск, каб там, знайшоўшы тых, хто вызнаваў Хрыста, хапаць іх і заключаць у турмы, а затым аддаваць на жудасную смерць.

Але калі Саўл наблізіўся да Дамаска, нечакана яго азарыла святло з Неба, і ён упаў, пачуўшы голас: «Саўл, Саўл, што ты Мяне ганіш?» Тады Саўл спытаў: «Хто Ты, Госпадзі?» Голас адказаў: «Я Той, Якога ты ганіш. Цяжка табе ісці супраць ражна...Устань і ідзі ў Дамаск, і там табе сказана будзе ўсё, што прызначана табе рабіць». І сапраўды, калі Саўл прыйшоў у Дамаск, апостал Ананія, які знаходзіўся тады ў горадзе, па загаду Збавіцеля прыйшоў да Саўла і выканаў над ім Таінства Святога Хрышчэння. З таго моманту Саўл стаў апосталам і гарачым прапаведнікам Евангелля Хрыстова.

Так пачалося новае жыццё Паўла, поўнае пакут і нягод у імя Госпада. У якасці апостала язычнікаў святы Павел прапаведаваў

Слова Божае ў Сірыі, Малой Азіі, Грэцыі, Італіі. Па ўнушэнні Духа Святога ён напісаў чатырнаццаць Пасланняў, якія ўвайшлі ў Біблію. Паводле падання, апостал Павел быў абезгалоўлены ў Рыме ў час каравання імператара Нерона.

Свяціцель Мікалай Цудатворац

Свяціцель Мікалай нарадзіўся ў багатай сям'і. Яго бацькі былі набожнымі людзьмі. З дзяцінства святы Мікалай меў вялікія поспехі ў вывучэнні Свяшчэннага Пісання. Днём ён не выходзіў з храма, а ўначы маліўся і чытаў кнігі. Яго дзядзька епіскап Патарскі (Патары — горад, у якім нарадзіўся будучы пастыр) радаваўся духоўным поспехам і высокай набожнасці пляменніка. Ён надаў юнаку сан свяшчэнніка. Служачы Госпаду, юны Мікалай гарэў духам, а вопытнасцю ў пытаннях веры быў падобны старцу, чым выклікаў глыбокую павагу веруючых.

Пасля смерці архіепіскапа Мір Лікійскіх Мікалай па волі Госпада быў выбраны яго пераемнікам. Збылося прадказанне дзядзькі, які бачыў у пляменніку новае сонца, што ўзыходзіла над зямлёю і абяцала суцяшэнне ўсім, хто смуткуе.

Падчас ганенняў, калі цараваў імператар Дзіяклецыян, святы Мікалай разам з іншымі хрысціянамі трапіў у цямніцу, дзе падтрымліваў зняволеных, угаворваў іх цвёрда пераносіць катаванне і мукі. Пасля ўступлення на прастол раўнаапостальнага імператара Канстанціна свяціцель быў вызвалены.

Свяціцель Мікалай норавам быў пакорлівы і незлаcлівы, духам — спакойны, апранаўся проста, еў звычайную ежу. Для сірот ён быў бацькам, для жабракоў — літасцівым падаўцам, для тых, хто плача, — суцяшальнікам, для пакрыўджаных — памочнікам і для ўсіх — вялікім дабрадзеем.

Многа цудаў і добрых спраў зрабіў свяціцель Мікалай. Па яго малітвах горад Міры быў выратаваны ад голаду. Святы пазбавіў ад смерці несправядліва асуджаных. Не раз Мікалай Цудатворац выратоўваў людзей, якія маглі загінуць у моры.

Свяцілель Кірыла, епіскап Тураўскі

Свяцілель Кірыла, епіскап Тураўскі, нарадзіўся ў 30-ых гг. XII ст. у горадзе Тураве на рацэ Прыпяці. Яго бацькі былі багатымі людзьмі. З малых гадоў святы Кірыла старанна чытаў Свяшчэнныя кнігі і дасягнуў глыбокага разумення іх. Ён вучыўся не толькі ў мясцовых настаўнікаў, але і ў грэкаў.

З маленства святы Кірыла далучыўся да багацця візантыйскай культуры пад кіраўніцтвам настаўніка-грэка, вывучаў грэчаскую мову, рыторыку, сусветную гісторыю і чытаў творы айцоў Царквы.

Дасягнуўшы паўналецця, магчыма, пасля смерці бацькоў, юнак вырашыў адмовіцца ад свецкага марнага жыцця і зямнога багацця, поўнасцю аддаць сябе служэнню Госпаду. Ён аддаліўся ў Тураўскі Барыса-Глебскі манастыр, стаў паслушнікам, потым — манахам, быў нарачоны імем Кірыла і нарэшце прыняў святарскі сан.

Каля 1145 г. Кірыла сам ужо зрабіўся настаяцелем манастыра. У хуткім часе ён прыняў подзвіг стоўпніцтва, пераняўшы подзвіг айцоў Бліжняга Усходу і Візантыі, якім заўсёды стараўся наследаваць як ідэальным ўзорам манаскай набожнасці.

Манахі будавалі келлі ў высокіх вепсах (слупах), каб нават фізічна аддаліцца ад грэшнай зямлі з яе спакусамі і нягодамі. Тут, у стаўпе, Кірыла «многа Божественна Писаниа изволи». Да гэтага ж часу, відаць, адносіцца і складанне Кірылам цыкла келейных малітваў на ўвесь тыдзень.

Натхнёнымі словамі, а найболей — праведным жыццём святы Кірыла стаў неўзабаве «славен... по всей стране той». Прыблізна ў 1159 г. адбылася хіратонія Кірылы ў епіскапа Тураўскага. Прычым пад яго кіраўніцтвам епархія стала самастойнай. Свяціцель умела кіраваў ёю, клапаціўся аб царкоўным добраўпарадкаванні, наглядаў за гарадскімі манастырамі, але сэнс сваёй дзейнасці бачыў у ацаленні чалавечых душ, служэнні народу. У сваіх пропаведзях Кірыла павучаў словам Хрыстовым месцічаў, баяр і святароў, змагаўся з перажыткамі і забабонамі, заклікаючы ўсіх: «не чтем огня, не работаем солнцу, не даем трэбы горам ни кладязем с источники». Замест «Зараліка», «Сонніка», «Траўніка» і іншых адрачоных кніг прасіў прыхаджан «часто послушати святых книг и в церквах и в домах», часцей хадзіць у храм, папракаў тым, што яны не хочуць нават малой часіны ахвяраваць Нябеснаму Уладару.

Свяціцель Кірыла любіў адзіноту. Да 1182 г. ён пакінуў кафедру, поўнасцю прысвяціўшы сябе напісанню духоўных твораў. Найбольш поўны збор твораў свяціцеля Кірылы Тураўскага быў выдадзены епіскапам Мінскім і Тураўскім Яўгеніем (Шарашылавым) у 1880 г.

Памёр свяціцель Кірыла каля 1183 г. Ад сучаснікаў ён атрымаў празванне «рускі Залатавуст».

Неўзабаве пасля смерці святога Кірылы, у XII ці на пачатку XIII ст., пачалося яго царкоўнае шанаванне, якое працягваецца і цяпер. Храмы ў імя свяціцеля Кірылы ёсць у вёсцы Баяры, што на Піншчыне, і ў вёсцы Глаўсевічы Слонімскага раёна. На радзіме свяціцеля Кірылы ў горадзе Тураве яму ўстаноўлены помнік.

Святы велікамучанік і лекар Панцеляімон

Святы Панцеляіман жыў у Нікадзіміі пры цары Максімільяне, які быў бязлітасным катам хрысціян. У юнацкім узросце Панцеляіман атрымаў выдатную свецкую адукацыю. Ён вылучаўся не толькі розумам, але і прыгажосцю. Цар заўважыў Панцеляімана, і той ужо рыхтаваўся паступіць да яго на службу. Але тут літасцівы Гасподзь, які жадаў выратаваць юнака, звёў яго са свяшчэннікам Ермалаем. Свяшчэннік расказаў Панцеляіману пра вучэнне Хрыста, і будучы лекар стаў пастаянна наведваць яго для духоўных гутарак.

Аднойчы, убачыўшы на вуліцы мёртвае дзіця і побач змяю, якая яго ўкусіла, Панцеляіман даў зарок хрысціцца, калі ён зможа ўваскрасіць дзіця. Будучы святы шчыра памаліўся Госпаду — і адбыўся цуд: дзіця ажыло, а змяя развалілася папалам. Верны свайму зароку, Панцеляіман прыняў хрышчэнне.

Пасля гэтага святы раздаў сваю маёмасць бедным і пачаў рабіць добрыя справы. Яму быў дадзены Богам дар ацалення, і ён бясплатна вылечваў усякія хваробы, прызываючы імя Ісуса Хрыста.

Па даносу зайздросных урачоў Панцеляімана жорстка катавалі за хрысціянскую веру. Павесілі на дрэве і сталі стругаць жалезнымі кіпцюрамі, абпальваючы рэбры свечкамі. Святы, які цярпеў жу-

дасныя мукі, усклікнуў: «Гасподзь Ісус Хрыстос! З'явіся мне ў гэту мінуту і дай цярпенне да канца вытрымаць мукі». І адразу рукі катаў нібы амярцвелі. Тады цар загадаў растапіць волава ў вялікім катле і кінуць туды мучаніка. Панцеляіман жа маліўся Богу, і Гасподзь зноў з'явіўся яму. Агонь адразу пагас, і волава астыла.

Многа яшчэ нацярпеўся мучанік за веру Хрыстову, пакуль Гасподзь не пазваў яго да Сябе.

Прападобны Сергій Радaнежскі, цудатворац

Прападобны Сергій (свецкае імя Варфаламей) нарадзіўся ў горадзе Растове ў сям'і набожных людзей Кірылы і Марыі. У сямігадовым узросце хлопчыка аддалі вучыцца, але вучоба давалася яму з цяжкасцю, бо меў дрэнную памяць.

Аднойчы, гуляючы ў дуброве, Варфаламей убачыў манаха, які маліўся. Хлопчык, нізка пакланіўшыся, стаяў і чакаў заканчэння малітвы. Памаліўшыся, манах спытаў: «Што хочаш, дзіця?» Варфаламей адказаў: «Айцец, аддалі мяне вучыцца чытаць, але ніяк не магу зразумець нічога з таго, чаму вучыць мяне настаўнік мой. Таму смуткую і не ведаю, што рабіць. Памаліся Госпаду за мяне, каб наставіў на розум святымі тваімі малітвамі». Манах, памаліўшыся, благаславіў Варфаламея і сказаў: «З гэтага часу, дзіця, дарує табе Бог разуменне, якое просіш, каб мог і іншых вучыць».

З таго часу будучы святы пачаў спасцігаць кніжныя прамудрасці без намагання. Неўзабаве яго бацькі перасяліліся ў Раданеж. Яны прынялі манаскі пострыг і з мірам адышлі да Госпада.

Застаўшыся адзін, Варфаламей раздаў усю сваю спадчыну і пайшоў у пустыню, дзе пабудаваў сабе хаціну. У дваццаць тры гады ён прыняў манаскі пострыг, і дадзена было яму імя Сергій.

Дзівоснае жыццё пражыў гэты святы. Сам свяціцель Алексій, мітрапаліт Маскоўскі, карыстаўся парадамі прападобнага і бачыў яго сваім пераемнікам. Вялікі князь Дзмітрый (Данскі) не аднойчы

наведваў святога, быў ім натхнёны і благаславёны на бітву з татарамі, у якой атрымаў перамогу на Куліковым полі.

У аднаго набожнага селяніна быў адзіны сын, які цяжка захварэў. Селянін з надзеяй панёс дзіця да прападобнага. Пакуль ігумен рыхтаваўся да адпраўлення малітвы, хлопчык памёр. Злітаваўся ўгоднік Божы над бацькам. Пакуль той хадзіў па труну для пахавання сына, прападобны ўпаў на калені каля хлопчыка. Ён яшчэ не закончыў сваёй малітвы, як дзіця ажыло і працягнула ручкі да малітвенніка. Калі прыйшоў бацька хлопчыка, ігумен сустрэў яго словамі: «Дарэмна ты, чалавеча, не разглядзеўшы, так моцна расхваляваўся: відаць, хлопец твой зусім не паміраў». Калі бацька стаў пераконваць, што сын яго быў мёртвы, прападобны строга сказаў яму: «Калі ты асмелішся расказаць пра гэта каму-небудзь, то зусім страціш сына».

Колькасць брацііі ўзрастала, і вады ў манастыры ўжо не хапала на ўсіх. Прападобны ўзяў з сабой аднаго з брацііі, пайшоў з ім у лясны яр паблізу манастыра, знайшоў там крыху дажджавой вады і шчыра памаліўся аб тым, каб Гасподзь падараваў крыніцу. Ледзь толькі закончыў ён малітву і перахрысціў тое месца, як з-пад зямлі прабіўся шчодры струмень халоднай вады. Ад гэтай вады, па малітвах, бывалі выпадкі вылечвання хворых. Крыніца атрымала назву «Сергіева рака».

Пакорлівы цудатворац, даведаўшыся пра гэта, паклікаў да сябе найстарэйшых з брацііі і строга забараніў ужываць гэтую назву: «Гасподзь літасцівы суцешыў нас... Пры чым тут я, грэшны?»

За сваё богаўгоднае жыццё прападобны Сергій быў дастойны бачыць Прачыстую Багародзіцу з двума апосталамі — Пятром і Іаанам.

Дажыўшы ў безупынным подзвігу і працы да глыбокай старасці (меў 78 гадоў ад нараджэння), прападобны Сергій ніколі не прапускаў царкоўнай службы. Дні яго працякалі ў безупынным удасканальванні і былі, як прыступкі, што набліжалі да Бога. Прападобны Сергій адышоў да Госпада ў 1392 г. Яго мошчы пакояцца ў Свята-Сергіевай Лаўры, недалёка ад Масквы.

Прападобны Серафім Сароўскі, цудатворац

Прападобны Серафім (свецкае імя Прохар) нарадзіўся 19 ліпеня 1759 г. у старажытным горадзе Курску ў купецкай сям'і. Яго бацькі Ісідор і Агаф'я Мошніны збудавалі велічны курскі Сергіева-Казанскі кафедральны сабор. З дзяцінства Прохар быў пад асаблівым Пакровам Божай Маці. Яна захавала хлопчыка, калі ён упаў з вялікай вышыні. Другі раз, калі Прохар быў невылечна хворы, ён атрымаў вылячэнне па малітвах Божай Маці пасля таго, як Яе цудатворную ікону пранеслі над хворым у час хрэснага ходу.

З дзяцінства ўсе думкі Прохара былі накіраваны да манастыра. На семнаццатым годзе, узяўшы благаславенне ў кіева-пячэрскага старца Дасіфея, ён атрымаў доўгачаканае благаславенне маці, а з ім — вялікі медны крыж, які заўсёды насіў да канца свайго жыцця.

Прыйшоў Прохар у Сароўскі манастыр, што непадалёку ад горада Арзамаса Ніжагародскай губерні. Тут ён стаў паслушнікам: сталяром, поварам, чытальнікам у храме на працягу васьмі гадоў. Потым быў пастрыжаны ў манахі з імем Серафім.

Сардэчная чысціня і гарачая любоў да Госпада вылучалі новапастрыжанага манаха. Яшчэ быўшы дыяканам, у час адпраўлення Боскай Літургіі, убачыў юны манах Госпада Бога нашага Ісуса Хрыста ў вобліку чалавечым, у славе, ззяючага невыказным святлом і акружанага нябеснымі сіламі — Ангеламі.

Адзін з самых цяжкіх подзвігаў Серафіма Сароўскага — маленне на камені, якое працягвалася тысячу дзён і начэй. Прападобнаму служыла ежай завараная трава.

«Радасць мая! Скарб мой! Хрыстос Уваскрэс!» — так святы Серафім сустракаў усіх, хто прыходзіў да яго. А ў яго келлі штодзённа бывалі сотні людзей з усіх канцоў Расіі.

Аднойчы зімой да манастырскай келлі айца Серафіма прывезлі на санях хворую жанчыну і пра гэта далажылі яму. Нягледзячы на мноства людзей, якія тоўпіліся ў сенцах, айцец Серафім папрасіў прынесці хворую да яго. Яна ўся была скурчаная, калені зведзены да грудзей. Жанчыну ўнеслі ў пакой старца і палажылі на падлогу. Айцец Серафім зачыніў дзверы і спытаў:

— Адкуль ты, матушка?

— З Уладзімірскай губерні.

— Ці даўно хворая?

— Тры гады з паловай.

— Якая ж прычына тваёй хваробы?

— Я была спачатку, бацюшка, праваслаўнай веры, але мяне аддалі замуж за старавера. Я доўга не схілялася да іхняй веры і была здарова. Нарэшце мяне ўгаварылі: я змяніла крыж на двухперсце і ў царкву хадзіць перастала. Пайшла я раз вечарам па дамашніх справах у двор. Там адна жывёла здалася мне вогненнай, нават абпаліла мяне. Я ўпала, мяне пачало ламаць і курчыць. Прайшло нямала часу. Дамашнія шукалі мяне. Выйшлі ў двор і знайшлі мяне ляжачай, унеслі ў пакой. З таго часу і хварэю.

— Разумею... — адказаў старац. — А ці веруеш ты зноў у Святую Праваслаўную Царкву?

— Верую зноў, бацюшка, — адказала хворая.

Тады айцец Серафім злажыў па-праваслаўнаму пальцы, перахрысціўся і сказаў:

— Перахрысціся вось так у імя Святой Тройцы.

— Бацюшка, рада б, — адказала хворая, — ды рукамі не валодаю.

Айцец Серафім узяў з лампады перад іконай Божай Маці «Замілаванне» ялею і памазаў грудзі і рукі хворай. Раптам жанчыну пачало выпростваць, нават суставы затрашчалі, і тут жа атрымала яна поўнае ацаленне.

Людзі, якія стаялі ў сенцах, убачыўшы цуд, распавядалі па ўсім манастыры і асабліва ў гасцініцы, як айцец Серафім вылечыў хворую. Калі да айца Серафіма прыйшла адна з Дзівееўскіх сясцёр, ён сказаў:

— Гэта, матушка, не Серафім убогі вылечыў яе, а Царыца Нябесная.

Прападобны Серафім асабліва клапаціўся пра Дзівееўскі жаночы манастыр, які яму даручыла Царыца Нябесная. Дванаццаць разоў у час зямнога жыцця з'яўлялася Прасвятая Дзева пакорліваму старцу.

Прападобны Серафім адышоў да Госпада 2 студзеня 1833 г. Яго імя шануюць як самае дарагое, самае светлае ў ліку рускіх святых.

Прападобная Еўфрасіння, ігуменя Полацкая

Прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая (свецкае імя Прадслава) была праўнучкай у пятым пакаленні святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра і дачкой полацкага князя Георгія Усяславіча. У 12 гадоў яна ўжо мела добрую па тых часах адукацыю. Больш за ўсё Прадслава любіла чытаць Свяшчэннае Пісанне. Чытала яна пра тое, як у старажытныя часы набожныя жанчыны служылі і дапамагалі людзям. Ёй запалі ў душу словы Хрыста пра тое, як дапамагаць бліжнім, і яна вельмі захацела выконваць запавет Збавіцеля.

Маладзенькую князёўну можна было сустрэць паўсюль, дзе толькі былі няшчасныя людзі. Яна даглядала хворых, даставала вопратку і ежу для жабракоў, наведвала асуджаных у турме і прасіла бацьку вызваліць іх. Ціхмяная, сціплая, ласкавая, нібы сонейка, з'яўлялася Прадслава ўсюды, дзе магла дапамагчы людзям.

Слава пра яе мудрасць і прыгажосць разышлася далёка за межы Полацкай зямлі. Многія князі прасілі рукі Прадславы, аднак усе прапановы на шлюб яна адхіляла. Не жадала маладая князёўна выходзіць замуж за незнаёмага, нялюбага чалавека, не вабіла яе багацце. Яна ўжо палюбіла іншае жыццё — дарагімі яе сэрцу былі тыя няшчасныя, якім дапамагала і якім была патрэбна.

Аднойчы, даведаўшыся, што бацькі хочуць заручыць яе са знатным князем, Прадслава тайна, пад покрывам ночы адышла з княжацкіх палацаў у манастыр, дзе была ігуменняй яе цётка Раманія — удава князя Рамана Усяславіча. Здзівіліся ў манастыры жаданню маладой князёўны пастрыгчыся ў манахіні, доўга адмаўлялі. Але князёўна Прадслава засталася цвёрдай у сваім рашэнні.

Нягледзячы на маладосць і прыгажосць пляменніцы, ігумення Раманія не пабаялася гневу яе бацькоў. На досвітку пастрыглі князёўну і далі ёй манаскае імя Еўфрасіння. Па благаславенні епіскапа Полацкага Іліі юная манахіня стала жыць пры Сафійскім саборы, узяўшы прыклад з прабывання Прасвятой Багародзіцы ў Іерусалімскім храме. Удзень яна прыбірала царкву, чытала, а ўначы перапісвала кнігі. У той час кніг было вельмі мала. Маладая манахіня перапісвала Евангелле, іншыя царкоўныя кнігі для самых

бедных храмаў. Калі ёй плацілі грошы за перапісаныя кнігі, яна адразу ж траціла іх на дапамогу бедным.

З усіх канцоў пачалі сыходзіцца да сястры Еўфрасінні хворыя, нямоглыя людзі. Так што часам цесна бывала ў двары Сафійскага сабора, не было дзе прытуліць бедных.

Паводле прадказання Ангела Гасподняга, па благаславенні епіскапа Іліі, дзядзька Барыс Усяславіч перадаў ва ўладаранне Еўфрасінні вёску Сяльцо, на землях якой і быў заснаваны ёю Спаса-Праабражэнскі манастыр. Там была старая царква, якую адрамантавалі. Сястра Еўфрасіння пераехала туды, а ўслед за ёю — усе хворыя, калекі, старыя, жабракі.

У той час у Еўфрасінні былі ўжо памочніцы — маладыя паслушніцы, з якімі яна і пачала наладжваць манастырскае жыццё. Багатыя людзі ахвяравалі на новы манастыр грошы, зямлю. Многія дзяўчаты і ўдовы з багатых сем'яў прасіліся ў памочніцы да Еўфрасінні і разам з ёй працавалі. А працы было шмат: трэба вучыць дзяцей, лячыць хворых, даглядаць за старымі, шыць вопратку для бедных, карміць жабракоў, перапісваць кнігі.

Паступова, год за годам, Спаса-Праабражэнскі манастыр пашыраўся, колькасць яго насельніц павялічвалася. У свой час тут былі пастрыжаны ў манаства родная сястра прападобнай Еўфрасінні Еўдакія (свецкае імя Градзіслава) і стрыечная сястра Еўпраксія (свецкае імя Звеніслава). Заснаваная святой Еўфрасінняй школа садзейнічала хуткаму росту манастыра. У школе пры манастыры пісалі іконы, працавалі майстры — залатары, сярод якіх быў знакаміты стваральнік Крыжа прападобнай Еўфрасінні Лазар Богша. Крыж быў зроблены ў 1161 г. У святыні знаходзіліся часцінкі дрэва з Крыжа Гасподняга з кропляй крыві Збавіцеля, часцінкі камянёў ад Гроба Гасподняга, часцінкі мошчаў многіх святых.

У 1161 г. стараннасцю прападобнай быў пабудаваны каменны храм у імя Збавіцеля (Спаса), які захаваўся да нашых дзён. У гэты храм прападобная Еўфрасіння і ахвяравала свой Крыж.

Прадметам асаблівай апекі ігуменні Полацкай быў заснаваны ёю Багародзічны мужчынскі манастыр. Для яго святая прасіла Патрыярха Канстанцінопальскага Луку і візантыйскага імператара Мануіла Комніна даслаць ёй спісак з цудадзейнай Эфескай іконы Божай Маці. Ікона была напісана святым евангелістам Лукой з Царыцы Нябеснай непасрэдна ў Эфесе. Эфеская ікона Божай Маці вядома таксама пад назвай Корсуньская.

У школах пры Спаса-Праабражэнскім жаночым і Багародзічным мужчынскім манастырах вучылі не толькі пісаць і чытаць, але і спевам, нотам, лекарству духоўнаму і цялеснаму. Прападобная Еўфрасіння набыла вядомасць як арганізатар асветы ў краі. Акрамя таго, верагодна, яна сама складала малітвы і казанні.

Ігумення Полацкая карысталася вялікім аўтарытэтам як асоба духоўная. Да яе звярталіся за парадамі гараджане і магнаты. Яна выконвала і дыпламатычныя місіі, прымiраючы князёў у міжусобіцах.

На схіле гадоў прападобная Еўфрасіння аддала манастыр пад апеку сястры Еўдакіі, а сама з пляменнікам Давідам, сястрой Еўпраксіяй і слугой Міхаілам здзейсніла паломніцтва ў Святую Зямлю, каб пакланіцца Гробу Гасподню. Увесь манастыр плакаў, развітваючыся з любімай ігуменняй, нібы ўсе адчувалі, што не пабачаць яе больш. І сапраўды, Еўфрасіння не вярнулася дадому. У Іерусаліме яна доўга малілася каля Гроба Гасподняга за сваю зямлю, за ўсіх няшчасных, за ўвесь свет. Усё яе жыццё і апошняя малітва былі за людзей.

Прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая, памерла ў далёкай Палесціне, не пабачыўшы Радзімы. Там яе і пахавалі ў манастыры святога Феадосія. Гэта адбылося 23 мая 1173 г.

Праз пятнаццаць гадоў рускія манахі перавезлі святыя мошчы прападобнай Еўфрасінні ў Кіева-Пячэрскі манастыр. А ў 1910 г. яе мошчы былі ўрачыста перанесены ў Полацк у заснаваны ёю манастыр, дзе знаходзяцца і цяпер.

У канцы XII ст. было створана «Жыціе Прападобнай», напісана яе ікона. Да XVI ст. Еўфрасіння Полацкая ўшаноўвалася як святая Полацкай зямлі. У 1547 г. яна першая з жанчын кананізавана Рускай Праваслаўнай Царквой.

У 1984 г. Еўфрасіння Полацкая была прылічана да Сабора Беларускіх Святых. Храмы ў імя прападобнай Еўфрасінні ёсць у гарадах Саўт-Рывер (ЗША) і Таронта (Канада), у Вільні, а на Беларусі — у Мінску і ў Івянцы Валожынскага раёна Мінскай вобласці.

Святы дабраверны вялікі князь Аляксандр Неўскі

Святы князь Аляксандр Неўскі нарадзіўся 30 мая 1219 г. Яго бацькі — набожныя рускія князі Яраслаў і Феадосія. У маленстве Аляксандр не захапляўся дзіцячымі гульнямі і забавамі. Яго любімымі заняткамі былі чытанне свяшчэнных кніг і шчырая малітва Богу. Царкоўным песнапеннем ён цешыў сваю душу, постам і ўстрыманнем умацоўваў і развіваў цялесныя сілы.

Стаўшы дарослым, Аляксандр пачаў княжыць у Вялікім Ноўгарадзе. Ён княжыў мудра і справядліва, заслужыўшы усеагульную любоў і павагу. Прыбліжаных князь павучаў такімі словамі: «Ад Бога мы атрымалі ўладу над людзьмі Божымі і ў страшны дзень Суда павінны будзем зрабіць справаздачу аб карыстанні гэтай уладай. Караючы вінаватых, не будзьце бязлітаснымі, суразмервайце міласцю пакаранне. Нічога не рабіце ў парыве гневу, злосці і зайздрасці. Не забывайце тых, хто жыве ў нястачы, дапамагайце ўсім, давайце міласціну, каб і сабе заслужыць ласку Божую».

У той час пачалося вялікае нашэсце татар на Русь. Вораг разбураў гарады і сёлы, забіваў жыхароў або забіраў іх у палон, а тых, хто заставаўся, прымушаў плаціць вялікую даніну. Карыстаючыся бядотным становішчам Русі, на яе напалі немцы і шведы.

Падчас бітвы са шведамі 19-гадовы князь Аляксандр меў нешматлікае войска, але ў яго было вялікае спадзяванне на літасць Божую. Увайшоўшы ў царкву Святой Сафіі, ён упаў на калені і пачаў са слязамі маліцца.

Адпаведна «Жыцію», рускаму князю малітоўна дапамагалі ў гэтай бітве яго святыя сваякі — князі, браты-мучанікі Барыс і Глеб. Князь Аляксандр вярнуўся ў Ноўгарад з перамогай. За гэту бітву ён быў празваны Неўскім.

Не прайшло і двух гадоў, як Гасподзь яшчэ раз праславіў Свайго ўгодніка, цяпер ужо ў бітве з нямецкімі рыцарамі на Чудскім возеры. Відавочца расказваў аўтару «Жыція», што бачыў у паветры ангельскі полк Божы, які прыйшоў на дапамогу Аляксандру.

У 44 гады дабраверны вялікі князь Аляксандр Неўскі прыняў манаскі чын і ў хуткім часе адышоў да Госпада.

Святыя праведныя Іаакім і Ганна

Нашчадкі слаўнага цара Давіда святыя праведныя Іаакім і Ганна жылі ў горадзе Назарэце. Бог благаславіў Іаакіма і Ганну багаццем, якое ніколькі не асляпляла іх. Муж і жонка выкарыстоўвалі яго на добрыя справы. Адну частку маёмасці яны ахвяравалі ў храм Божы, другую аддалі на справы міласэрнасці — бедным і вандроўнікам. Астатняя частка падтрымлівала іх уласнае пакорнае жыццё.

Галоўнае духоўнае і спадчыннае багацце гэтай святой пары было ў запавеце Госпада Прабацьку іх Давіду: ад яго племені народзіцца абяцаны Адаму яшчэ ў раі Збавіцель свету.

Спакойна працякалі дні Іаакіма і Ганны. Прайшло пяцьдзесят гадоў іх шлюбу. Сваё духоўнае і фізічнае жыццё яны стараліся ладзіць у адпаведнасці з воляй Божай. Толькі адно трывожыла, што яны былі бяздзетныя. А ў той час бяздзетнасць лічылася Госпадняй карай за цяжкія грахі. Бяздзетныя пары цярпелі ад людзей пагарду і дакор, нават пазбаўляліся некаторых грамадзянскіх правоў. Найбольш цяжка пераносілі бяздзетнасць патомкі Давіда, бо менавіта да іх адносіўся высокі запавет аб нараджэнні Месіі.

Іаакім і Ганна нямала нацярпеліся людскіх папрокаў. Але галоўнае, што за столькі гадоў яны не страцілі ні веры, ні надзеі на благаслаўленне жаданым дзіцяткам. Пастаянна клапаціліся аб ачышчэнні сваіх сэрцаў. З такой верай і надзеяй на Бога, з такой самаахвярнасцю і малітвамі хіба можна быць забытым Госпадам і не атрымаць міласці?! Богу, відаць, пажадана было выпрабаваць іх шматгадовым ачышчальным подзвігам, каб належным чынам падрыхтаваць да найчысцейшага нараджэння благаславёнага дзіцяці.

Аднойчы на вялікае свята Абнаўлення Іерусалімскага храма праведны Іаакім у суправаджэнні сваіх слуг прыйшоў у храм і прынёс ахвяру. Першасвятар, не прыняўшы ад яго ахвяры, строга сказаў: «Ганьба браць з тваіх рук дары, бо ты бяздзетны! Ты не маеш Божага благаславення праз нейкія тайныя грахі. Чаму спакушаеш мяне, прыносячы дары Богу? Ці ведаеш, што ты не варты прыносіць дароў, таму што не пакінуў семені ў Ізраілі?»

Праведны Іаакім засмуціўся несправядлівым ганьбаваннем і, нізка апусціўшы галаву, выйшаў з храма. Адпусціўшы дадому слуг, ён са слязамі на вачах пайшоў у пустыню, дзе пасвіліся яго статкі. Там Іаакім да сваіх слёз далучыў шчырую малітву, а да малітвы — строгі пост. Нечаканна да яго з'явіўся Ангел Гасподні і сказаў,

што Ганна зачне і народзіць Дачку, якую ён назаве Марыяй. Яе нараджэнне будзе радасцю для ўсяго свету.

У той момант, калі Ганна слёзна малілася і дала зарок прысвяціць Богу народжанае дзіця, перад ёй з'явіўся Ангел Гасподні. Ён паведаміў, што Ганна народзіць Дачку Благаславёную, якой узрадуюцца ўсе зямныя народы, бо праз Яе будзе збаўленне ўсяму свету.

Іаакім і Ганна паспяшаліся ў Іерусалімскі храм, каб выказаць Усявышняму падзяку за радасную вестку. Каля Залатых Варот, што пры ўваходзе ў храм, яны неспадзявана сустрэліся і расказалі адзін аднаму пра сваю радасць.

Пасля наведвання храма праведныя Іаакім і Ганна вярнуліся дадому. У хуткім часе ў іх нарадзілася дачка — Прачыстая і Благаславёная Дзева Марыя. Калі Марыі споўнілася тры гады, бацькі ўвялі Яе са славай у храм Гасподні. З таго моманту яе жыццё было прысвечана служэнню Богу.

Радасная вестка

(урывак з драмы Ф.А. Палачаніна «Доўгачаканая радасць»)

КАРЦІНА ПЯТАЯ

Пустыня. Вечарэе. Удалечыні гарыць касцёр. Там статак прыпыніўся на начлег. На авансцэне ў задуменні стаіць Іаакім. Да яго падыходзіць пастух Руфім.

Р у ф і м. У нас ужо вячэра зварылася. Запрашаю гаспадара павячэраць.

І а а к і м. Руфім, я ж табе ўжо казаў, што не вазьму ў рот ежы і не вярнуся ў свой дом.

Р у ф і м. Чалавек не можа жыць без ежы і без дома.

І а а к і м. Слёзы мае будуць мне ежай, а пустыня гэта — домам, пакуль не пачуе мяне Гасподзь і не дасць у старасці плод шлюбу, як некалі даў Аўрааму.

Р у ф і м. Мы гаспадару і месца для начлегу падрыхтавалі, бо аднаму ў пустыні заставацца небяспечна.

І а а к і м (з горыччу). Я, напэўна, самы грэшны перад Богам, калі з'яўляюся прычынай нашага шлюбнага няшчасця. Праз мяне пакутуе Ганна. (Цяжка ўздыхае.) Я гатоў прыняць за свае грахі самую суровую Божую кару. Таму і начаваць застануся адзін.

Р у ф і м. Гаспадар вельмі суровы да сябе.

І а а к і м. Мне здаецца, што я заслужыў больш жорсткіх адносін.

Р у ф і м. Не, гаспадар! За сваё жыццё я многа бачыў розных людзей — і праведнікаў, і вялікіх грэшнікаў. І гаспадароў у мяне было нямала. Скажу шчыра, што лепшых за вас не сустракаў. Усе вашы слугі лічаць, што больш праведных, чым гаспадар і гаспадыня, няма ў цэлым свеце.

І а а к і м. Дзякуй, Руфім, за добрае слова!

Р у ф і м. Гаспадар, не трэба рызыкаваць... Пойдзем да нашага кастра.

І а а к і м. Не, я тут застануся начаваць.

Р у ф і м. Тады я разам з вамі застануся.

І а а к і м. Не, Руфім. Ты павінен сцерагчы статак.

Р у ф і м. Каля статка ёсць два пастухі.

І а а к і м. І ты павінен быць там.

Руфім, пастаяўшы крыху, павольна ідзе да кастра. Цемра атульвае Іаакіма. Чуваць начныя галасы пустыні. Калі пачынае світаць, Іаакім стаіць на каленях і ціха моліцца. На яго шчаках слёзы. Раптам у незвычайным святле перад Іаакімам з'яўляецца Ангел Гасподні.

А н г е л Г а с п о д н і. Не бойся, Іаакім! Я Ангел Гасподні, пасланы да цябе паведаміць, што малітва твая пачута. Бог прыслухаўся да яе і пачуў твой смутак аб несправядлівым ганьбаванні за бяздзетнасць.

І а а к і м (здзіўлена). Ці не сон гэта?!

А н г е л Г а с п о д н і. Ён, Прамудры, зрабіў так, каб бачна было: тое, што народзіцца ад цябе, — ёсць плод Божага даравання.

І а а к і м. Няўжо гэта праўда?!

А н г е л Г а с п о д н і. Сара, першая маці вашага роду, была бясплоднай да васьмідзесяці гадоў. Потым нарадзіла сына Ісаака, на якім пацвердзіўся запавет аб благаславенні ўсіх народаў у семені яго. Таксама і Рахіль, такая праведная перад Богам і любімая Іаакавам, доўга была бясплоднай. Яна нарадзіла Іосіфа, што быў не толькі ўладаром Егіпта, але і вызваліцелем многіх народаў, якія ледзь не загінулі галоднай смерцю. (Пасля невялікай паўзы.) З суддзяў хто быў больш мужны за Самсона? А з прарокаў хто больш праведны за Самуіла?

Іаакім моўчкі паціскае плячыма.

Яны абодва пайшлі ад бясплодных бацькоў.

І а а к і м. Я вушам сваім не веру!

А н г е л   Г а с п о д н і. Калі вопыт навакольны і аддалены не пераконвае цябе ў праўдзівасці маіх слоў, то павер мне, як нябеснаму вестуну.

І а а к і м (ківае галавой). Я веру. Веру...

А н г е л   Г а с п о д н і. Тыя нараджэнні, што былі ў старасці, вельмі цудоўныя. Таму і жонка твая Ганна народзіць табе цудоўную дачку. Ты назавеш яе Марыяй.

Твар Іаакіма азарыўся радаснай усмешкай. Яго вусны шэпчуць: «Марыя! Марыя!»

Вось табе знак ісціны маіх слоў: уваходзячы ў Іерусалім, за Залатымі Варотамі ты сустрэнеш жонку сваю Ганну. І яна цябе таксама абрадуе радаснай весткай.

Ангел Гасподні знікае.

І а а к і м (з радасцю). У нас з Ганнай будзе дачка Марыя!

Зацямненне.

КАРЦІНА ШОСТАЯ

Пакой дома Іаакіма і Ганны. Па пакоі, прыгаломшваючы, ходзіць Ганна.

Г а н н а. Гора мне, самай няшчаснай ва ўсім свеце! Гора мне!

Убягае, засопшыся, Саламія.

С а л а м і я (насцярожана). Гаспадыня, што здарылася? Чаму такі плач?

Г а н н а (выціраючы слёзы). Гэта я па свайму няшчасцю плачу. (Пасля паўзы.) Богам я адпрэчана. Людзі мяне дакараюць. Муж мяне пакінуў... (Садзіцца на канапу.)

С а л а м і я (прысела побач). Нельга ж дзень і ноч праліваць слёзы. Трэба неяк стрымліваць іх.

Г а н н а (трохі супакоіўшыся). Я стараюся, але само плачацца. Вельмі ж многа няшчасця выпала на маю долю. Нават не ведаю, аб чым раней пачаць плакаць. Ці аб удаўстве маім? Ці аб бяздзетнасці? Ці, можа, аб ганьбе сярод Ізраільскіх жонак?

С а л а м і я (рашуча). Найлепш ні аб чым! Гэта ўсё ўжо аплакана. Трэба паберагчы сваё здароўе.

Г а н н а. Мне здаецца, што яно больш не патрэбна. Пакінутая я Богам, мужам і людзьмі. (Цяжка ўздыхае.)

С а л а м і я. Будзе яшчэ свята і на нашай вуліцы! (Пасля паўзы.) Сёння я зноў напякла многа салодкіх ляпёшак. Давай выйдзем і пачастуем імі дзетак. Яны ўжо, чуваць, гуляюць непадалёку і, напэўна, нас чакаюць.

Г а н н а. Я рада, што ім падабаюцца нашы пачастункі. (Крыху падумаўшы.) Але як жа мне выходзіць да дзетак такой заплаканай?! Схадзі пачастуй адна.

С а л а м і я (устае). Добра... Толькі ж глядзі, больш не плач! Лепш выйдзі ў сад ды хоць крыху развей свае сумныя думкі.

Г а н н а (не адразу). Можа, і праўда выйсці ў сад? (Устае.)

С а л а м і я. Схадзі, хоць на трохі...

Ганна і Саламія з ляпёшкамі на падносе выходзяць з дома. Да іх даносіцца вясёлы дзіцячы гоман. Саламія ідзе да дзяцей, а Ганна, цяжка ўздыхнуўшы, — у сад. Ганна, узняўшы ў неба вочы, поўныя слёз, заўважае на дрэве птушынае гняздо, падыходзіць і заглядвае ў яго.

Г а н н а. Птушаняткі!.. Толькі што аперыліся. (Адступае ад гнязда.) Усё ў прыродзе нараджае і пладаносіць. Я адна пазбаўлена гэтай радасці сэрца!.. (Паказвае на гняздо.) Птушкі нябесныя! Вас благаслаўляе Гасподзь: вы суцяшаецеся дзецьмі сваімі. Звяры дуброўныя! І вас не пазбавіў свайго благаславення Тварэц. І вы корміце дзяцей сваіх. Зямля, агульная маці наша, і на табе ёсць таксама благаславенне Божае. На тваім улонні растуць дрэвы і кветкі, і ад даверанага табе іх семя нараджаюцца плады. (Стукае кулаком сабе ў грудзі.) Я, я адна толькі бясплодная на зямлі! (Уздымае ў неба поўныя слёз вочы, распасцірае рукі.) Гасподзь, злітуйся нада мною, як злітаваўся над маці Прарока Твайго Самуіла Адонай! Я прысвячу Табе народжанае мною дзіця!

Перад Ганнай раптоўна з'яўляецца Ангел Гасподні. Жанчына палохаецца, але страх яе хутка мяняецца радасцю.

А н г е л Г а с п о д н і. Не бойся, Ганна! Пачута малітва твая. Уздыханні твае праніклі праз воблакі. Ты зачнеш і народзіш Дачку Благаслаўлёную, больш за ўсіх дочак зямных. Ёй узрадуюцца ўсе зямныя плямёны. Праз Яе дасца збаўленне ўсяму свету. Імя Яе Марыя.

Ганна нізка кланяецца Ангелу Госпадняму, і той знікае. Жанчына з радаснай усмешкай ідзе ў дом і шэпча пачутае імя.

Зацямненне.

Святы праведны Іаан Кармянскі

У наш час яшчэ бытуе меркаванне, што святых добрапамысных людзей немагчыма сустрэць у сённяшнім мітуслівым і жорсткім жыцці. Але Гасподзь заўсёды ўраўнаважвае зло благадаццю, носьбітамі якой з'яўляюцца праведнікі. Сярод такіх падзвіжнікаў — праведны Іаан Кармянскі, протаіерэй Іаан Гашкевіч (1837—1917).

Яшчэ цяжарнай маці святога праведнага Іаана Кармянскага пачула адкравенне ад юродзівага адносна яе будучага дзіцяці: «Хацеў бы я ў яго ўзяць благаславенне, але не дажыву». З гэтых часоў бацькі ведалі Промысел Божы аб дзіцяці, якога назвалі ў гонар апостала любові Іаана Багаслова.

У 1862 г. пасля свята Богаяўлення Іаан Гашкевіч павянчаўся з Марыяй. 24 лютага 1863 г. ён быў рукапаложаны ў іерэі і накіраваўся ў царкву Нараджэння Багародзіцы ў вёску Шарсцін, што на Рагачоўшчыне.

За 14 гадоў жыцця ў праведніка нарадзіліся сыны Міхаіл, Ігнат, Сімяон і дачка Таццяна. У канцы 1876 г. протаіерэй Іаан быў пераведзены ў Свята-Мікольскі храм, які знаходзіўся ў вёсцы Агароддня Добрушскага раёна. Па благаславенні кіева-пячэрскіх старцаў ён пачаў весці манаскі лад жыцця: да смерці не ўжываў мясной ежы, строга пасціў у сераду і пятніцу, пасля вячэрняга богаслужэння прымаў толькі прасвіру і трохі вады.

Святы праведны Іаан меў дар прадбачання. Манахіні Феадосіі, калі яна была яшчэ дзяўчынкай, ён прадказаў, што «як кветачка, будзе Божаньцы служыць». Айцец Іаан вылечваў без грошай, вымольваў ацаленне нават беснаватым. Аднойчы ён аддаў удаве Марыі і яе пяці сіроткам уласную карову, потым дазволіў браць царкоўныя дровы. Айцу Іаану было ўяўленне ў сне Крыжа Гасподняга і прыходу ў храм Божай Маці. Яна была незвычайна апранута, у суправаджэнні жанчын і юнакоў у белым. У хуткім часе царква запусцела.

Пасля адыходу да Госпада праведнік не пакінуў сваіх духоўных дзяцей. Людзі прыходзілі да яго на магілу, дзе таксама адбываліся ацаленні.

У 1956 г. храм Божы, дзе служыў айцец Іаан, быў спалены, а могілкі, дзе ён пахаваны разам з сынам, таксама святарам, — зруйнаваны. На месцы храма зрабілі клуб. Але людзі прыходзілі на

гэта святое месца і атрымоўвалі па сіле сваёй веры вялікія ацаленні.

У 1997 г. былі знойдзены святыя мошчы заступніка зямлі беларускай — айца Іаана Гашкевіча. Яны знаходзяцца ў Свята-Пакроўскім храме вёскі Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. Ікона праведнага Іаана Кармянскага з 1998 г. пашырана ў беларускіх праваслаўных цэрквах.

Святая блажэнная Ксенія Пецярбургская

Святая блажэнная Ксенія нарадзілася ў Санкт-Пецярбургу паміж 1719 і 1732 гг. у набожнай сям'і. Ксенія была замужам за Андрэем Фёдаравічам Пятровым, які служыў у рангу палкоўніка прыдворным пеўчым. Дзяцей у іх не было, але жылі яны ў міры і згодзе. Нечаканая смерць горача любімага мужа стала ўдарам для дваццацішасцігадовай Ксеніі. Цяжкая страта зрабіла такі ўплыў на маладую ўдаву, што яна адразу нібы забылася на ўсё зямное, чалавечае, усе радасці і ўцехі. Ксенія зразумела, наколькі нетрывалае і марнае зямное жыццё. Для дасягнення сапраўднага шчасця на небе яна ўсю сябе прысвяціла хрысціянскаму подзвігу юродства.

Сваю маёмасць Ксенія раздала бедным, дом падарыла сваёй знаёмай, а сама засталася ні з чым. Апрануўшы мужаў касцюм, яна стала ўсіх запэўніваць, што Андрэй Фёдаравіч не памёр, а памерла яго жонка Ксенія Рыгораўна. Потым яна ўжо ніколі не адклікалася на сваё ранейшае імя. Калі ж яе называлі Андрэем Фёдаравічам, заўсёды ахвотна размаўляла. Абураныя сваякі, якія жадалі вярнуць маёмасць, звярнуліся да ўрачоў па заключэнне аб яе вар'яцтве. Але ўрачы, праверыўшы Ксенію, пераканаліся, што ў яе здаровы розум.

У касцюме мужа блажэнная блукала па вуліцах Санкт-Пецярбурга. Пэўнага месца жыхарства ў яе не было. Блажэнная ў асноўным хадзіла ў тым раёне, дзе жылі небагатыя людзі. Дзеці смяяліся з яе, дражнілі. Святая ўсё цярпела: і прыніжэнне, і голад, і холад...

Перад сабой Ксенія заўсёды насіла вобраз Хрыста, вялікага бязвіннага Пакутніка. Як і Ён, юродзівая таксама пакорна цярпела ўсе здзекі.

У любую пару года і ў любое надвор'е блажэнная Ксенія ішла нанач у поле і малілася да ўсходу сонца. Калі дзе-небудзь будаваўся храм, яна ўначы пераносіла цэглу знізу наверх, каб будаўнікі маглі ўжо з раніцы прыступіць да кладкі сцен. Жыхары Санкт-Пецярбурга прывыклі да яе дзіўнага выгляду і забаранілі сваім дзецям крыўдзіць убогую. Многія стараліся запрасіць блажэнную ў дом, накарміць. Але яна не ва ўсіх брала міласціню, а толькі ў набожных. Ад цёплага адзення зімой адмаўлялася і круглы год хадзіла ў лахманах і рваных чаравіках.

За гэты подзвіг Гасподзь паслаў Ксеніі дар вылячэння і прадбачання. Аднойчы блажэнная прыйшла ў госці да купчыхі Крапівінай. Ксенію гасцінна сустрэлі гаспадыня і іншыя людзі, што былі тут. Яна некаторы час гутарыла з усімі, падзякавала гаспадыні за пачастунак, а калі стала развітвацца, указала на Крапівіну і раптам сказала: «Вось зялёная крапіва, а хутка завяне». Ні Крапівіна, ні яе госці не надалі асаблівага значэння гэтым словам. Але ў хуткім часе маладая, квітнеючая купчыха нечакана захварэла і памерла. Тады толькі людзі ўспомнілі словы блажэннай і зразумелі, што яна прадказала блізкую смерць маладой жанчыны.

Блажэнная часта прымала ўдзел у наладжванні жыцця набожных хрысціян. У дамах, куды яна заходзіла, пасяляліся мір і шчасце. Суцешанае ёю хворае дзіця хутка папраўлялася. Гандляры заўважылі, што пасля наведвання і набыцця блажэннай хоць нейкай дробязі пачынаўся добры гандаль. Рамізнікі стараліся хоць некалькі крокаў падвезці Ксенію, таму што тады ў іх цэлы дзень усё ішло выдатна і была добрая выручка.

45 гадоў пасля ўступлення на шлях юродства блажэнная Ксенія прыходзіла на дапамогу кожнаму, хто меў у гэтым патрэбу. Як птушка нябесная, лётала яна па Пецярбургскай старане днём, жадаючы ўсім і кожнаму аказаць якую-небудзь паслугу, а ўначы ўступала ў гутарку з Самім Госпадам Богам. Лагоднасць, пакорлівасць, дабрыня свяціліся на яе знясіленым турботамі твары. Бачна было, што душа блажэннай далёка ад свету, што хоць цела яе знаходзіцца яшчэ на зямлі, але дух — на небе, куды яна няспынна імкнулася.

На семдзесят першым годзе (магчыма, каля 1803 г.) блажэнная Ксенія адышла да Госпада. Пахавана святая на Смаленскіх могіл-

ках у Санкт-Пецярбургу. Паломніцтва да яе магілы было такое вялікае, што па жменьцы двойчы разбіралі насыпаны капец.

У 1902 г. над магілай пабудавалі часоўню. На яе сценах даты, імёны і просьбы «да блажэннай Ксеніі» ад людзей розных узростаў і званняў. І дагэтуль прыходзяць на яе магілу. Людзі і сёння атрымліваюць дапамогу ад угодніцы Божай. Сотні расказаў пра гэта перадаюцца вернікамі з вуснаў у вусны.

Святыя бяссрэбранікі Касьма і Даміян

Святыя Касьма і Даміян былі братамі. Нарадзіліся яны ў Азіі. Маці іх была хрысціянкай. Касьма і Даміян атрымалі ад Бога дар вылечваць хваробы і немачы, выганяць злых духаў. Святыя вылечвалі ад хвароб не столькі лекарскім умельствам, колькі імем Гасподнім. Яны лячылі людзей без платы і ўзнагарод, у выкананне запаведзі Хрыстовай «дарам атрымалі, дарам давайце». Таму Царква ўшаноўвае іх як бяссрэбранікаў.

Аднойчы святыя Касьма і Даміян вылечылі цяжкахворую. Жанчына ў знак удзячнасці прасіла прыняць падарунак — тры яйкі. Браты адмовіліся. Тады жанчына тайна прыйшла к Даміяну і заклікала яго імем Бога, каб ён узяў гэтыя яйкі ў імя Святой Тройцы. Дзеля гэтай вялікай клятвы Даміян прыняў дар. Касьма, пачуўшы пра гэта, моцна засмуціўся і завяшчаў не хаваць яго разам з братам.

Высокі быў подзвіг святых, але Богу было пажадана яшчэ ўзвысіць іх праз пакутніцтва. Яны адпакутавалі з-за зайздрасці ўрача, які некалі быў іх настаўнікам. Гэты чалавек завабіў братоў у горы і там вераломна забіў.

Пасля смерці святых людзі, якія хавалі Даміяна, збянтэжыліся: ці хаваць яго побач з братам. Пакуль яны разважалі, адбыўся цуд: неспадзявана з'явіўся вярблюд і прамовіў чалавечым голасам, каб не сумняваліся і паклалі Даміяна каля Касьмы, бо ён узяў тры яйкі дзеля імені Божага.



Ісус Хрыстос

Ангел-храніцель

Свята-Георгіеўская царква ў вёсцы Сітцы



Святы прарок Ілія

Святы апостал Андрэй Першазваны

Святыя першавярхоўныя апосталы Пётр і Павел

Свяціцель Мікалай Цудатворац

Сьвяціцель Кірыла, епіскап Тураўскі

Святы велікамучанік Панцеляіман



Прападобны Сергій Раданежскі

Прападобны Серафім Сароўскі

Прападобная Еўфрасіння Полацкая



Крыж Еўфрасінні Полацкай

Святы дабраверны вялікі князь Аляксандр Неўскі



Святы праведны Іаан Кармянскі

Святая блажэнная Ксенія Пецярбургская

Святыя бяссрэбранікі Касьма і Даміян



Нерукатворны абраз Збавіцеля

Чанстахоўская ікона Божай Маці

Ікона Божай Маці «Скарапаслушніца»

Мінская ікона Божай Маці

Жыровіцкая ікона Божай Маці

Светлае Хрыстова Уваскрасенне

Раство Хрыстова

Богаяўленне

Стрэчанне Гасподняе

Уваход Госпада ў Іерусалім

Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы

Узнясенне Гасподняе



Святая Троица



Праабражэнне Гасподняе

Успенне Прасвятой Багародзіцы

Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы

Уздвіжанне Крыжа Гасподняга

Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы

Пакроў Прасвятой Багародзіцы

ІКОНЫ

Табе малюся, Божа міласцівы,
Дай мне ўбачыць свет Твой найяснейшы—
Цябе Самога і ўсе ў свеце дзівы
На векі вечны, Божа наймілейшы!

К. Тураўскі

Пра святыя іконы

У храмах і ў дамах веруючых знаходзяцца святыя іконы, перад якімі мы молімся. Іконай, або абразом, называецца выява Самога Бога, Божай Маці, Ангелаў ці святых угоднікаў. Выява абавязкова асвячаецца ў храме святаром. Праз гэтае асвячэнне іконе перадаецца дар Святога Духа. Ікона шануецца ўжо намі, як святая. Бываюць іконы цудатворныя, праз якія дар Божы выяўляе цуды, напрыклад вылечвае хворых.

Сам Збавіцель даў нам Сваю выяву. Аднойчы, памыўшыся, Ён выцер чысцюткі лік Свой ручніком і дзівосна выявіўся на гэтым ручніку для хворага князя Аўгара. Вось якое старажытнае паходжанне мае Нерукатворны абраз Збавіцеля, перад якім мы молімся ў нашых праваслаўных храмах.

Першыя іконы Багародзіцы, паводле царкоўнага падання, напісаў апостал і евангеліст Лука пасля Пяцідзесятніцы ў Сіёнскім храме непасрэдна з Самой Царыцы Нябеснай. Яна, пабачыўшы Сваю святую выяву, прамовіла: «Благадаць Народжанага ад Мяне і Мая з гэтай іконаю будзе».

Мы молімся Маці Божай, таму што Яна бліжэй за ўсіх да Бога і разам з тым блізкая да нас. Дзеля Яе мацярынскай любові і малітваў Бог многа нам дарує і ў многім дапамагае. Багародзіца вялікая і міласэрная заступніца за ўсіх нас!

Калі мы молімся перад іконай, павінны памятаць, што ікона — не Сам Бог або ўгоднік Божы, а толькі выява Бога ці ўгодніка Яго. Таму не іконе мы молімся, а Богу, Багародзіцы ці святому, які на ёй выяўлены.

Святая ікона — тое самае, што і свяшчэнная кніга. У свяшчэннай кнізе мы з глыбокай пашанай чытаем словы Госпада. На святой іконе сузіраем святыя лікі, якія, як і Божае слова, накіраваны да нашага сэрца і розуму. Ікона — гэта радасць для вока, таму што

святыя на абразах увасабляюць унутраны слых і занатаванне пачутага Божага Адкравення. Ад самой святыні зыходзіць святло. Вакол галавы Збавіцеля, Божай Маці, святых угоднікаў і ўгодніц Божых на іконах адлюстроўваецца ззянне, або светлае кола, — сімвал святасці, які называецца німбам.

Нерукатворны абраз Збавіцеля

Царкоўнае паданне сведчыць, што хворы на праказу сірыйскі цар Аўгар паслаў да Ісуса Хрыста свайго мастака Ананію з пісьмом, у якім прасіў Збавіцеля прыйсці ў Эдэсу і вылечыць яго. Калі Збавіцель не зможа прыйсці, Аўгар даручыў мастаку напісаць Яго партрэт.

Ананія прыйшоў у Іерусалім, знайшоў Збавіцеля і аддаў Яму пісьмо Аўгара. Выбраўшы зручнае месца, ён пачаў пісаць выяву Сына Божага. Але гэта ніяк не ўдавалася, таму што лік Збавіцеля ўвесь час мяняўся. Ісус Хрыстос пашкадаваў мастака. Ён папрасіў вады, памыў твар, выцер яго хустачкай, на якой і адбіўся Яго Божы лік.

Збавіцель перадаў гэту хустачку Ананіі з наказам аднесці з пісьмом у адказ таму, хто прыслаў. Ананія ўзяў хустачку з цудоўнай выявай і з глыбокай пашанай даставіў яе цару Аўгару. Той, атрымаўшы святыню і ўбачыўшы жывую выяву Госпада, упаў перад ёю, пацалаваў яе і са слязамі стаў маліцца. Сірыйскі цар адразу адчуў сябе лепш і нарэшце зусім выздаравеў.

Пасля пакут Сына Божага ў Эдэсу прыйшоў для прапаведавання Евангелля апостал Фадзей, адзін з сямідзесяці вучняў Хрыстовых. Апостал пахрысціў цара Аўгара і ўвесь яго дом, а таксама многіх веруючых жыхароў горада.

Аўгар прымацаваў Нерукатворны абраз да дошкі і змясціў у нішы над гарадскімі варотамі, загадаўшы, каб кожны прахожы пакланяўся яму. Над абразом зрабіў надпіс: «Христе Боже, всякий надеющийся на Тебя не постыдится». Гэтым сірыйскі цар садзейнічаў распаўсюджванню хрысціянства сярод свайго народа.

Пасля смерці Аўгара прайшло шмат часу. У горадзе Эдэсе княжыў праправўнук добрапамыснага цара. Ён вярнуўся да язычніцтва і хацеў знішчыць Нерукатворны абраз. Епіскап горада замураваў ікону з запаленай перад ёй лампадай у гарадской сцяне і такім чынам захаваў святыню ад знішчэння. З часам пра месца гэтае забыліся. Але абраз быў знойдзены, калі горад акружыла войска персідскага цара Хазроя ў 544—545 гг.

Нерукатворны абраз знайшоў епіскап Еўлавій непашкоджаным, з лампадай, якая гарэла. Лік Збавіцеля захаваўся і адбіўся на гліне, у якую быў замураваны абраз. Неўзабаве цудадзейная ікона ўратавала горад ад ворагаў. З гэтага часу пачалося яе ўшанаванне. У 944 г. імператар Канстанцін Багранародны ўрачыста перанёс святыню ў Канстанцінопаль. Памяць гэтай падзеі адзначаецца вернікамі штогод 29 жніўня.

Існуе паданне, што ў час заваявання Візантыі крыжаносцамі Нерукатворны абраз быў адпраўлены імі ў Венецыю. Карабель, на якім везлі яго, затануў у хвалях Мармуровага мора. Такая вось сумная гісторыя страты Нерукатворнага абраза.

Чанстахоўская ікона Божай Маці

Царкоўнае паданне сцвярждае, што Чанстахоўскую ікону Божай Маці напісаў евангеліст Лука ў Іерусаліме ў Сіёнскім храме, дзе Ісус Хрыстос здзейсніў Тайную Вячэру з апосталамі перад Сваімі Святымі пакутамі.

У 326 г. у Іерусаліме царыцай Аленай быў знойдзены і ўзведзены Жыватворны Крыж Гасподні. У падзяку за гэта вернікі падарылі святой ікону, якая пазней стала называцца Чанстахоўскай. Царыца прывезла яе ў Царград і паставіла ва ўласнай дамавой капліцы.

Ікона знаходзілася ў Канстанцінопалі каля пяці стагоддзяў. Потым яна асвяціла Балгарыю, Маравію і Чэхію. На землі Вялікага княства Літоўскага ікону прынёс князь Леў, вядомы як заснавальнік Львова.

Шматлікія цуды былі яўлены ад гэтай іконы на Бельскіх землях у праваслаўных святынях. Цудадзейная ікона Чанстахоўская асвяціла і Польскую Карону князя Уладзіслава з Аполля. Калі татара-манголы асадзілі Бельскі замак, цудадзейная ікона Божай Маці была пранесена хрэсным ходам і пастаўлена на гарадской сцяне.

Ворагі, страляючы ў камяніцу, паранілі ікону Багародзіцы. З раны выцекла кроў. Гэта выклікала жах і здзіўленне ва ўсіх. Рабаўнікоў ахапіла нейкая імгла — пошасць, ад якой яны пачалі паміраць сотнямі. Жах прымусіў захопнікаў спыніць асаду замка. Крыжовыя палосы ад раны і цяпер можна ўбачыць на святым абліччы Божай Маці.

Пасля адыходу татараў князь Уладзіслаў пажадаў перанесці цудадзейную ікону Божай Маці ў Сілезію, больш спакойнае месца, і паставіць яе ў сваёй крэпасці ў Аполлі. Але шэсце не зварухнулася. На ўсіх напаў незразумелы страх. Князь укленчыў перад святой іконай і доўга маліўся Царыцы Нябеснай, прасіў адкрыць волю Божую. Ён пачуў голас Божай Маці, якая загадала перанесці ікону на Ясную Гару Чанстахоўскую. Князь пабудаваў на Яснай Гары манастыр і ў 1382 г. перанёс туды цудадзейную ікону.

Таленавіты мастак Іван Венжын з гарадка Саколкі, што ў Беластоцкім краі, вельмі жадаў напісаць копію Чанстахоўскага вобраза Божай Маці для мясцовай царквы. Нягледзячы на сваё шчырае імкненне, цярплівасць і майстэрства, ён ніяк не мог зрабіць гэта. Мастак быў блізкі да адчаю і наракаў на сябе, чаму ён пагадзіўся зрабіць немагчымае. Багародзіца дапамагла яму і пакінула Сваю святую выяву. Калі Іван Венжын увайшоў у майстэрню, абраз быў ужо напісаны з дзіўным майстэрствам і ў поўнай адпаведнасці з арыгіналам. Голас Божай Маці загадаў: «Ва ўзнагароду за тваю стараннасць ікона ўжо напісана. Вазьмі яе і аднясі ў Сакольскі сабор».

Цуды ад святой іконы Багародзіцы запісваліся ў спецыяльнай кнізе Чанстахоўскага манастыра. Вядомы шматлікія выпадкі ацаленняў хворых па малітвах перад святой іконай.

Ікона Божай Маці «Скорапаслушніца»

Мы ўсе неаплатныя грэшнікі перад Богам. Маці Божая выпрасіла асаблівую благадаць дапамогі кожнаму чалавечаму сэрцу. Пра незвычайную сілу міласэрнасці Багародзіцы сведчыць ікона Божай Маці «Скорапаслушніца».

Здарылася гэта ў манастыры на Святой гары Афон. Манах Ніл часта хадзіў у трапезную з запаленай лучынай. Аднойчы ён пачуў голас ад абраза Багародзіцы, што вісеў над дзвярыма. Голас заклікаў не хадзіць у гэтым месцы і не капціць ікону. Ніл падумаў, што гэта жарт аднаго з манахаў, і не звярнуў на словы ніякай увагі. Ён працягваў хадзіць у гэтым месцы з лучынай, якая капціла.

Раптам манах аслеп. Горка раскайваючыся, маліўся Ніл Пасвятой Багародзіцы, прасіў прабачэння. Няспынныя малітвы манаха перад цудадзейнай іконай пачула Багародзіца. Голас Царыцы Нябеснай прамовіў:

— Ніл, пачута твая малітва, табе дасылаецца дараванне. Паведамі брацці, што Я — іх Пакроў і абарона абіцелі. Няхай усе хрысціяне (асабліва праваслаўныя) звяртаюцца да Мяне ў патрэбах, і Я не пакіну нікога. Маленні іх будуць выкананы Сынам і Богам Маім праз Маё хадайніцтва перад Ім. З гэтага часу ікона Мая будзе мець назву «Скорапаслушніца», бо Я буду спрыяць хуткай дапамозе ў здзяйсненні прашэнняў усіх, хто звяртаецца да яе.

Ікона Божай Маці «Скорапаслушніца» яўлена ў X ст. Яна знаходзіцца ў Афонскім Дахіярскім манастыры ў Грэцыі. Пашырана ў беларускіх храмах, ёсць у Свята-Духавым саборы Мінска.

Мінская ікона Божай Маці

Паводле царкоўнага падання, Мінская ікона Божай Маці напісана евангелістам Лукой. Цудадзейная ікона Багародзіцы спалучае ў сабе рысы Адзігітрыі і Царыцы Дзяржаўнай.

У 988 г. святыня была перанесена з Корсуні ў Кіеў у Дзесяцінную царкву Нараджэння Багародзіцы. Праз 500 гадоў падчас нашэс-

ця крымскага хана Махмет-Гірэя адзін татарын, зняўшы з іконы каштоўную шату, кінуў святыню ў Дняпро. 13/26 жніўня 1500 г. цудадзейная ікона з'явілася на водах Свіслачы. Кіяўляне-ўцекачы адразу пазналі сваю святыню.

Цудадзейная ікона была перанесена ў сабор Нараджэння Божай Маці. Пачаліся цуды ад наваяўленай Адзігітрыі Дзяржаўнай. У 1505 г. арда Махмет-Гірэя падышла да Мінска. Пасля пакаяльнага малебна пачалася няроўная бітва. Вораг спаліў горад, узяў у палон 100 тысяч сялян, але замак з цудадзейнай іконай не здолеў захапіць. Беларуска-літоўскае войска вызваліла палонных пад Клецкам і разбіла татар.

Сабор у замку паступова разбураўся. Уніяцкі епіскап Руцкі загадаў перанесці святыню ў Свята-Духаў манастыр у Верхнім горадзе. У канцы XVIII ст. Свята-Духаў храм стаў праваслаўным кафедральным саборам. У 1795—1799 гг. яго асвяцілі ў гонар першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла.

Ікона Багародзіцы захавалася нават пасля моцнага пажару. У 1852 г. жонка мінскага губернатара Шклярэвіча ўпрыгожыла святыню сярэбранай вызалачанай шатай. У гонар іконы быў асвячоны правы прыдзел Петра-Паўлаўскага сабора. Унізе іконы на маленькай дошчачцы змешчана гісторыя Мінскай Адзігітрыі. У кубку, куды кідалі ахвяраванні, некаторыя вернікі пакідалі звесткі пра свае ацаленні.

Летам 1936 г. Петра-Паўлаўскі сабор быў узарваны, а ікона Багародзіцы перададзена ў мастацкі музей. У 1941 г. добрапамысная мінчанка Варвара Слабко выпрасіла ў немцаў святыню. У 1945 г. ікона Божай Маці была перанесена ў Свята-Духаў кафедральны сабор, дзе знаходзіцца і сёння.

Жыровіцкая ікона Божай Маці

Апякунка Беларусі, цудадзейная Жыровіцкая ікона Божай Маці, з'явілася ў 1470 г. у мястэчку Жыровічы Гродзенскага краю. У лесе, які належаў праваслаўнаму літоўскаму вяльможу Аляксандру Солтану, пастухі ўбачылі незвычайна яркае святло. Яно пранікала скрозь

галіны грушавага дрэва, што стаяла над ручаём пад гарой. Пастухі падышлі бліжэй і ўбачылі на дрэве ў прамяністым ззянні ікону Божай Маці, выразаную на камені памерам 43х56 мм. З глыбокай пашанай яны ўзялі ікону і аднеслі гаспадару. Магнат не прыдаў асаблівага значэння паведамленню пастухоў, але ікону ўзяў і замкнуў у куфэрак. Калі да Солтана прыйшлі госці, гаспадар захацеў паказаць ім знаходку. На сваё здзіўленне, ён не ўбачыў іконы ў куфэрку.

Праз нейкі час пастухі знайшлі ікону на тым жа месцы і зноў перадалі Аляксандру Солтану. На гэты раз ён узяў ікону з вялікай пашанай і даў абет узвесці на месцы яе з'яўлення царкву ў гонар Прасвятой Багародзіцы. Каля драўлянага храма хутка з'явілася паселішча і ўтварыўся прыход.

Каля 1520 г. храм згарэў, нягледзячы на намаганні жыхароў патушыць пажар і выратаваць ікону. Усе думалі, што яна загінула. Аднойчы сялянскія дзеці, вяртаючыся са школы, убачылі цудоўнае яўленне: дзева незвычайнай прыгажосці ў прамяністым ззянні сядзела на камені ля былога храма. У руках яна трымала ікону, якая лічылася загінуўшай. Дзеці не асмеліліся падысці да яе, але паспяшаліся расказаць пра цуд родным і знаёмым. Вернікі разам са святаром адправіліся да гары. На камені ля запаленай свечкі стаяла Жыровіцкая ікона Божай Маці, не пашкоджаная агнём. Ікону часова паставілі ў доме святара, а вакол каменя зрабілі агароджу. Калі быў пабудаваны мураваны храм, туды паставілі цудатворную ікону. Потым каля храма ўзнік мужчынскі манастыр.

У 1609 г. манастыр захапілі уніяты, і ён знаходзіўся ў іх руках да 1839 г. Увесь гэты час Жыровіцкая ікона Божай Маці карысталася глыбокай пашанай ва уніятаў і каталікаў. У 1839 г. манастыр вярнулі праваслаўным, і ён стаў першым месцам аднаўлення праваслаўнага Богаслужэння ў Заходнерускім краі.

У час першай сусветнай вайны Жыровіцкую ікону Божай Маці перавезлі ў Маскву, а ў пачатку 1920-ых гг. вярнулі ў манастыр. Цяпер святыня знаходзіцца ў саборы Успення Прасвятой Багародзіцы Жыровіцкага манастыра Мінскай епархіі. Яе глыбока шануюць вернікі за спрыяльную дапамогу. Копіі Жыровіцкай іконы Божай Маці ёсць у кожным праваслаўным храме Беларусі.

Малітвы

Схіліся ў малітве гарачай,
Прасі даравання грахоў —
Душою адчуеш удзячнай,
Што Госпад наш Бог ёсць любоў.

А. Дылюк

ПРА МАЛІТВУ

Малітва — гэта наша размова з Богам. Прыступаючы да малітвы, мы падымаем вочы да Айца нашага Нябеснага. У думках просім прабачэння ў тых, каго пакрыўдзілі, выбачаем усіх, хто пакрыўдзіў нас. Толькі так можна быць годным размовы з Богам — крыніцай любові, ласкі і міласэрнасці. Толькі так мы можам скіраваць думкі свае да Яго і мець надзею, што Ён выслухае нас, прыме нашы малітвы.

Ісус Хрыстос сказаў: «Прасіце, і будзе дадзена вам» (Мц. 7,7); іншым разам сказаў: «І ўсё, чаго будзеце прасіць у малітве з вераю, атрымаеце» (Мц. 21, 22). Прыступаючы да малітвы, трэба цвёрда верыць, што Сын Божы задаволіць добрую просьбу нашу ў належны час, бо Ён лепш ведае, што і калі патрэбна для жыцця, дабра і збаўлення нашага. Таму ў малітве павінны быць вялікая надзея на ласку Збавіцеля, наша любоў да Яго, усведамленне нашых грахоў і правіннасцей, злучанае з пакораю Мытніка, якога Гасподзь Міласэрны апраўдаў ужо за словы: «Божа, будзь міласцівы да мяне, грэшнага» (Лк. 18,13).

Маліцца можна ў любым месцы і ў любы час, але самая моцная малітва — у Царкве, бо там неспасцiжным спосабам прысутнічае Сам Гасподзь. Шчырую, ад чыстага сэрца малітву Ён заўсёды пачуе.

За каго мы павінны маліцца? Найперш за саміх сябе, за сваіх родных — бацькоў, братоў, сясцёр, за айцоў духоўных, за настаўнікаў, сяброў і знаёмых. За ўвесь наш народ беларускі, за нашу маці — Беларусь, за край, дзе жывём. Сам Збавіцель наш плакаў над доляй Іерусаліма і народа, сярод якога Ён нарадзіўся як чалавек.

Малітва будзе сапраўды мілая Богу, калі ніхто не перашкаджае падчас яе. Ніяк нельга выстаўляць яе напаказ або выхваляцца ёю

перад людзьмі. Хрыстос часта маліўся. Тады Ён адыходзіў ад вучняў Сваіх. Тое самае Сын Божы запаведваў і нам: «Ты ж, калі молішся, ідзі ў пакой свой і, зачыніўшы дзверы, памаліся Айцу Свайму тайна, а Ён узнагародзіць цябе яўна» (Мц. 6,6).

Паводле зместу ёсць малітвы хвалебныя, падзячныя, прасіцельныя і пакаянныя. У хвалебных малітвах мы славім Бога, Тварца і Збавіцеля нашага, за бязмежную любоў да нас, за Яго дасканаласць і ўсемагутнасць.

Падзячнымі малітвамі мы чынім нашу падзяку Усявышняму за ўсё: за сваё нараджэнне, за бацькоў, братоў, сясцёр, усіх родных і блізкіх, за кожны добры ўчынак наш, бо ўсё гэта ласка Яго да нас.

У прасіцельных малітвах мы просім Айца Нябеснага паслаць нам падтрымку, дапамогу ці суцяшэнне.

Калі мы зрабілі дрэнную справу (саграшылі), павінны прасіць у Бога прабачэння, пакаяцца. Такія малітвы называюцца пакаяннымі.

Паводле формы ёсць малітвы унутраныя і вонкавыя. Унутранай малітвай мы молімся Збавіцелю ў думках сваіх, не вымаўляючы слоў. Гэтыя малітвы выяўляюць набожны стан нашых душ. У час вонкавай малітвы вымаўляем словы, хрысцімся, становімся на калені.

Паводле часу ёсць малітвы ранішнія, дзённыя і вячэрнія.

Маліцца можна да Айца нашага Нябеснага Ісуса Хрыста, да Прасвятой Тройцы, да Бога Духа Святога, да Прачыстай Маці Божай, да свайго Ангела-ахоўніка і да ўсіх святых, каб яны заступіліся за нас перад Богам. Збавіцель наш любіць усіх, нават грэшнікаў, калі яны са шчырай малітвай звяртаюцца да Яго, просяць дараваць грахі. Але асабліва Ён любіць дзяцей. Аднаго разу сказаў вучням сваім: «Не перашкаджайце дзеткам прыходзіць да Мяне, бо такіх ёсць Царства Нябеснае». І, абняўшы, усклаў на іх рукі Свае і благаславіў (Мк. 19, 14—16).

Маліцца трэба ў радасці і пры ўсякіх поспехах, у горы, бядзе, смутку і клопатах. Маліцца пастаянна за сябе і за іншых, прасіць іншых маліцца за нас, бо «многа можа зрабіць малітва справядлівага» (Як. 5,16).

КАРОТКІЯ МАЛІТВЫ

1. Пачынальная малітва:

ВО ИМЯ ОТЦА, И СЫНА, И СВЯТАГО ДУХА. АМИНЬ.

Малітву трэба вымаўляць перад пачаткам усякай добрай справы, таму яна і называецца пачынальнай.

2. Малітва мытніка:

БОЖЕ, МИЛОСТИВ БУДИ МНЕ ГРЕШНОМУ.

Гэта малітва з прытчы, якую расказаў Ісус Хрыстос.

3. Ісусава малітва:

ГОСПОДИ ИИСУСЕ ХРИСТЕ, СЫНЕ БОЖИЙ, ПОМИЛУЙ МЯ ГРЕШНАГО.

Гэта адна з самых моцных кароткіх малітваў.

4. Самая кароткая малітва да Божай Маці:

ПРЕСВЯТАЯ БОГОРОДИЦЕ, СПАСИ НАС!

5. Малітва святому Ангелу-ахоўніку:

АНГЕЛЕ БОЖИЙ, ХРАНИТЕЛЮ МОЙ СВЯТЫЙ, МОЛИ БОГА О МНЕ.

6. Малітва святому, імя якога ты носіш:

МОЛИ БОГА О МНЕ, СВЯТЫЙ УГОДНИЧЕ БОЖИЙ (имя), ЯКО АЗ УСЕРДНО К ТЕБЕ ПРИБЕГАЮ, СКОРОМУ ПОМОЩНИКУ И МОЛИТВЕННИКУ О ДУШЕ МОЕЙ.

7. Малітва за жывых:

ГОСПОДИ, СПАСИ И ПОМИЛУЙ ОТЦА МОЕГО ДУХОВНАГО (имя священника), РОДИТЕЛЕЙ МОИХ (имена), СРОДНИКОВ МОИХ (имена), НАСТАВНИКОВ (имена), И ВСЕХ ПРАВОСЛАВНЫХ ХРИСТИАН.

8. Малітва аб выздараўленні хворага:

ГОСПОДИ, СПАСИ И ПОМИЛУЙ БОЛЯЩАГО РАБА ТВОЕГО (имя), ПРОСТИ ЕМУ ВСЯКОЕ СОГРЕШЕНИЕ ВОЛЬНОЕ И НЕВОЛЬНОЕ.

9. Малітва за памерлых:

УПОКОЙ, ГОСПОДИ, ДУШИ УСОПШИХ РАБОВ ТВОИХ (имена) И ВСЕХ ПРАВОСЛАВНЫХ ХРИСТИАН. ПРОСТИ ИМ ВСЯ СОГРЕШЕНИЯ ВОЛЬНАЯ И НЕВОЛЬНАЯ И ДАРУЙ ИМ ЦАРСТВИЕ НЕБЕСНОЕ.

10. Трысвятое:

СВЯТЫЙ БОЖЕ, СВЯТЫЙ КРЕПКИЙ, СВЯТЫЙ БЕССМЕРТНЫЙ, ПОМИЛУЙ НАС.

11. Услаўленне Тройцы Адзінароднай і Непадзельнай:

СЛАВА ОТЦУ И СЫНУ, И СВЯТОМУ ДУХУ, И НЫНЕ, И ПРИСНО, И ВО ВЕКИ ВЕКОВ. АМИНЬ.

12. Малітва Святому Крыжу:

ОГРАДИ МЯ, ГОСПОДИ, СИЛОЮ ЧЕСТНАГО ЖИВОТВОРЯЩАГО ТВОЕГО КРЕСТА И СОХРАНИ МЯ ОТ ВСЯКАГО ЗЛА.

13. Малітва перад сном:

В РУЦЕ ТВОИ, ГОСПОДИ ИИСУСЕ ХРИСТЕ, БОЖЕ МОЙ, ПРЕДАЮ ДУХ МОЙ: ТЫ ЖЕ МЯ БЛАГОСЛОВИ, ТЫ МЯ ПОМИЛУЙ И ЖИВОТ ВЕЧНЫЙ ДАРУЙ МИ. АМИНЬ.

РОЗНЫЯ МАЛІТВЫ

1. Перад пачаткам усякай справы:

Малітва Святому Духу

ЦАРЮ НЕБЕСНЫЙ, УТЕШИТЕЛЮ, ДУШЕ ИСТИНЫ, ИЖЕ ВЕЗДЕ СЫЙ И ВСЯ ИСПОЛНЯЯЙ, СОКРОВИЩЕ БЛАГИХ И ЖИЗНИ ПОДАТЕЛЮ, ПРИИДИ И ВСЕЛИСЯ В НЫ, И ОЧИСТИ НЫ ОТ ВСЯКИЯ СКВЕРНЫ, И СПАСИ, БЛАЖЕ, ДУШИ НАША.

2. Пасля заканчэння ўсякай добрай справы:
Хвалебная песнь Багародзіцы

ДОСТОЙНО ЕСТЬ ЯКО ВОИСТИННУ БЛАЖИТИ ТЯ, БОГОРОДИЦУ, ПРИСНОБЛАЖЕННУЮ И ПРЕНЕПОРОЧНУЮ И МАТЕРЬ БОГА НАШЕГО. ЧЕСТНЕЙШУЮ ХЕРУВИМ И СЛАВНЕЙШУЮ БЕЗ СРАВНЕНИЯ СЕРАФИМ, БЕЗ ИСТЛЕНИЯ БОГА СЛОВА РОЖДШУЮ, СУЩУЮ БОГОРОДИЦУ ТЯ ВЕЛИЧАЕМ.

3. Ранішняя:
Малітва святога Макарыя Вялікага

К ТЕБЕ, ВЛАДЫКО ЧЕЛОВЕКОЛЮБЧЕ, ОТ СНА ВОССТАВ, ПРИБЕГАЮ, И НА ДЕЛА ТВОЯ ПОДВИЗАЮСЯ МИЛОСЕРДИЕМ ТВОИМ, И МОЛЮСЯ ТЕБЕ: ПОМОЗИ МИ НА ВСЯКОЕ ВРЕМЯ, ВО ВСЯКОЙ ВЕЩИ, И ИЗБАВИ МЯ ОТ ВСЯКИЯ МИРСКИЯ ЗЛЫЯ ВЕЩИ И ДИАВОЛЬСКАГО ПОСПЕШЕНИЯ, И СПАСИ МЯ, И ВВЕДИ В ЦАРСТВО ТВОЕ ВЕЧНОЕ. ТЫ БО ЕСИ МОЙ СОТВОРИТЕЛЬ И ВСЯКОМУ БЛАГУ ПРОМЫСЛЕННИК И ПОДАТЕЛЬ, О ТЕБЕ ЖЕ ВСЕ УПОВАНИЕ МОЕ, И ТЕБЕ СЛАВУ ВОЗСЫЛАЮ, НЫНЕ И ПРИСНО, И ВО ВЕКИ ВЕКОВ. АМИНЬ.

4. Вячэрняя:
Малітва святога Макарыя Вялікага

ГОСПОДИ БОЖЕ НАШ, ЕЖЕ СОГРЕШИХ ВО ДНИ СЕМ СЛОВОМ, ДЕЛОМ И ПОМЫШЛЕНИЕМ, ЯКО БЛАГ И ЧЕЛОВЕКОЛЮБЕЦ ПРОСТИ МИ. МИРЕН СОН И БЕЗМЯТЕЖЕН ДАРУЙ МИ. АНГЕЛА ТВОЕГО ХРАНИТЕЛЯ ПОСЛИ, ПОКРЫВАЮЩА И СОБЛЮДАЮЩА МЯ ОТ ВСЯКАГО ЗЛА, ЯКО ТЫ ЕСИ ХРАНИТЕЛЬ ДУШАМ И ТЕЛЕСЕМ НАШИМ, И ТЕБЕ СЛАВУ ВОЗСЫЛАЕМ, ОТЦУ, И СЫНУ, И СВЯТОМУ ДУХУ, НЫНЕ И ПРИСНО, И ВО ВЕКИ ВЕКОВ. АМИНЬ.

5. Малітва ў пачатку навучальнага года:

ГОСПОДИ БОЖЕ И СОЗДАТЕЛЮ НАШ, ОБРАЗОМ СВОИМ ПОЧТЫЙ НАС ЧЕЛОВЕКИ, НАУЧИВЫЙ ИЗБРАННЫЯ ТВОЯ, ЯКО ДИВИТИСЯ ВНЕМЛЮЩИМ УЧЕНИЮ ТВОЕМУ, ОТКРЫВЫЙ ПРЕМУДРОСТЬ МЛАДЕНЦЕМ; ИЖЕ СОЛОМОНА И ВСЕХ ВЗЫСКУЮЩИХ УСТЫ РАБОВ ТВОИХ СИХ, ВО

ЕЖЕ ПРИЯТИ СИЛУ ЗАКОНА ТВОЕГО И СО УСПЕХОМ ПОЗНАТИ ПРЕПОДАВАЕМЫЯ ИМ ПОЛЕЗНАЯ УЧЕНИЯ, В СЛАВУ ПРЕСВЯТАГО ИМЕНИ ТВОЕГО, В ПОЛЬЗУ И СОЗИДАНИЕ СВЯТЕЙ ТВОЕЙ ЦЕРКВИ, И РАЗУМЕТИ БЛАГУЮ И СОВЕРШЕННУЮ ВОЛЮ ТВОЮ. ИЗБАВИ ИХ ОТ ВСЯКАГО НАЛОГА ВРАЖИЯ, СОБЛЮДИ ИХ В ПРАВОСЛАВНОЙ ВЕРЕ И ВО ВСЯКОМ БЛАГОЧЕСТИИ И ЧИСТОТЕ ВО ВСЯ ДНИ ЖИВОТА ИХ, ДА ПРЕУСПЕЮТ В РАЗУМЕ И ВО ИСПОЛНЕНИИ ЗАПОВЕДЕЙ ТВОИХ, ДА ТАКО ПРЕДУГОТОВАНИ ПРОСЛАВЯТ ПРЕСВЯТОЕ ИМЯ ТВОЕ И БУДУТ НАСЛЕДНИЦЫ ЦАРСТВИЯ ТВОЕГО. ЯКО ТЫ ЕСИ БОГ СИЛЕН В МИЛОСТИ, И БЛАГ В КРЕПОСТИ, И ТЕБЕ ПОДОБАЕТ ВСЯКАЯ СЛАВА, ЧЕСТЬ И ПОКЛОНЕНИЕ ОТЦУ, И СЫНУ, И СВЯТОМУ ДУХУ ВСЕГДА, НЫНЕ И ПРИСНО, И ВО ВЕКИ ВЕКОВ. АМИНЬ.

6. Перад пачаткам вучобы:

ПРЕБЛАГИЙ ГОСПОДИ, НИЗПОСЛИ НАМ БЛАГОДАТЬ ДУХА ТВОЕГО СВЯТАГО, ДАРСТВУЮЩАГО СМЫСЛ И УКРЕПЛЯЮЩАГО ДУШЕВНЫЯ НАША СИЛЫ, ДАБЫ, ВНИМАЯ ПРЕПОДАВАЕМОМУ НАМ УЧЕНИЮ, ВОЗРАСЛИ МЫ ТЕБЕ, НАШЕМУ СОЗДАТЕЛЮ, ВО СЛАВУ, РОДИТЕЛЯМ ЖЕ НАШИМ НА УТЕШЕНИЕ, ЦЕРКВИ И ОТЕЧЕСТВУ НА ПОЛЬЗУ.

7. Пасля заканчэння вучобы:

БЛАГОДАРИМ ТЕБЕ, СОЗДАТЕЛЮ, ЯКО СПОДОБИЛ ЕСИ НАС БЛАГОДАТИ ТВОЕЯ, ВО ЕЖЕ ВНИМАТИ УЧЕНИЮ. БЛАГОСЛОВИ НАШИХ НАЧАЛЬНИКОВ, РОДИТЕЛЕЙ И УЧИТЕЛЕЙ, ВЕДУЩИХ НАС К ПОЗНАНИЮ БЛАГА, И ПОДАЖДЬ НАМ СИЛУ И КРЕПОСТЬ К ПРОДОЛЖЕНИЮ УЧЕНИЯ СЕГО.

8. Перад ядой:
Малітва Гасподня

ОТЧЕ НАШ, ИЖЕ ЕСИ НА НЕБЕСЕХ! ДА СВЯТИТСЯ ИМЯ ТВОЕ, ДА ПРИИДЕТ ЦАРСТВИЕ ТВОЕ, ДА БУДЕТ ВОЛЯ ТВОЯ, ЯКО НА НЕБЕСИ И НА ЗЕМЛИ. ХЛЕБ НАШ НАСУЩНЫЙ ДАЖДЬ НАМ ДНЕСЬ; И ОСТАВИ НАМ ДОЛГИ НАША, ЯКОЖЕ И МЫ ОСТАВЛЯЕМ ДОЛЖНИКОМ НАШИМ; И НЕ ВВЕДИ НАС ВО ИСКУШЕНИЕ, НО ИЗБАВИ НАС ОТ ЛУКАВАГО.

9. Пасля яды:

БЛАГОДАРИМ ТЯ, ХРИСТЕ БОЖЕ НАШ, ЯКО НАСЫТИЛ ЕСИ НАС ЗЕМНЫХ ТВОИХ БЛАГ; НЕ ЛИШИ НАС И НЕБЕСНАГО ТВОЕГО ЦАРСТВИЯ.

10. Падзяка за ўсякую добрую справу:

СЛАВА ТЕБЕ, БОЖЕ!
СЛАВА ТЕБЕ, БОЖЕ!
СЛАВА ТЕБЕ, БОЖЕ!

САМЫЯ ГАЛОЎНЫЯ МАЛІТВЫ

1. Малітва Гасподня:

ОТЧЕ НАШ, ИЖЕ ЕСИ НА НЕБЕСЕХ! ДА СВЯТИТСЯ ИМЯ ТВОЕ, ДА ПРИИДЕТ ЦАРСТВИЕ ТВОЕ, ДА БУДЕТ ВОЛЯ ТВОЯ, ЯКО НА НЕБЕСИ И НА ЗЕМЛИ. ХЛЕБ НАШ НАСУЩНЫЙ ДАЖДЬ НАМ ДНЕСЬ; И ОСТАВИ НАМ ДОЛГИ НАША, ЯКОЖЕ И МЫ ОСТАВЛЯЕМ ДОЛЖНИКОМ НАШИМ; И НЕ ВВЕДИ НАС ВО ИСКУШЕНИЕ, НО ИЗБАВИ НАС ОТ ЛУКАВАГО.

Гэта малітва называецца Гасподняй, таму што ёй навучыў нас Сам Гасподзь Ісус Хрыстос. Вось як пра гэта сказана ў Евангеллі (Лк. 11.1—4):

Случилось, что, когда Он (Господь) в одном месте молился и перестал, один из учеников Его сказал Ему: «Господи! Научи нас молиться, как Иоанн научил учеников своих».

Он сказал им: «Когда молитесь, говорите «Отче наш», — и научил их этой молитве.

2. Песнь Прасвятой Багародзіцы:

БОГОРОДИЦЕ ДЕВО, РАДУЙСЯ, БЛАГОДАТНАЯ МАРИЕ, ГОСПОДЬ С ТОБОЮ: БЛАГОСЛОВЕНА ТЫ В ЖЕНАХ, И БЛАГОСЛОВЕН ПЛОД ЧРЕВА ТВОЕГО, ЯКО СПАСА РОДИЛА ЕСИ ДУШ НАШИХ.

Песня Прасвятой Багародзіцы ў памяць аб тым, як Ангел паведаміў Дзеве Марыі, што Яна будзе Маці Госпада нашага Ісуса Хрыста.

3. Сімвал веры
(як ён быў складзены)

Вучні Ісуса Хрыста прапаведавалі хрысціянскую веру ў многіх краінах. Спачатку хрысціяне цярпелі жорсткія ганенні, іх кідалі ў цямніцы, забівалі. У IV ст. у Рымскай імперыі пры імператары Канстанціне Вялікім ганенні спыніліся. Многія людзі хрысціліся. Каб усе хрысціяне маглі дакладна ведаць праўдзівы змест веры, Царква павінна была коратка і ясна выкласці сутнасць хрысціянскага вучэння.

У 325 г. быў сабраны Першы Усяленскі Сабор у горадзе Нікеі (на Усяленскія Саборы збіраюцца святчэннікі і настаўнікі Царквы з многіх краін, з усіх канцоў свету). Многія з тых, хто прысутнічаў на Саборы, пацярпелі за сваю веру і прыйшлі знявечаныя, асепленыя, абгарэлыя, але духоўна не зламаныя. Усе разам яны склалі першы раздзел Сімвала веры (Сімвал веры — кароткі і дакладны выклад усіх ісцін хрысціянскай веры).

На Другім Усяленскім Саборы ў 381 г. у Канстанцінопалі быў закончаны другі раздзел Сімвала веры.

На Трэцім Усяленскім Саборы ў 431 г. пастанавілі ніколі не мяняць слоў Сімвала веры.

ПРАВАСЛАЎНЫ СІМВАЛ ВЕРЫ

1. ВЕРУЮ ВО ЕДИНАГО БОГА ОТЦА, ВСЕДЕРЖИТЕЛЯ, ТВОРЦА НЕБУ И ЗЕМЛИ, ВИДИМЫМ ЖЕ ВСЕМ И НЕВИДИМЫМ.

2. И ВО ЕДИНАГО ГОСПОДА ИИСУСА ХРИСТА, СЫНА БОЖИЯ, ЕДИНОРОДНАГО, ИЖЕ ОТ ОТЦА РОЖДЕННАГО ПРЕЖДЕ ВСЕХ ВЕК; СВЕТА ОТ СВЕТА, БОГА ИСТИННА ОТ

БОГА ИСТИННА, РОЖДЕННА, НЕСОТВОРЕННА, ЕДИНОСУЩНА ОТЦУ, ИМЖЕ ВСЯ БЫША.

3. НАС РАДИ ЧЕЛОВЕК И НАШЕГО РАДИ СПАСЕНИЯ СШЕДШАГО С НЕБЕС, И ВОПЛОТИВШАГОСЯ ОТ ДУХА СВЯТА И МАРИИ ДЕВЫ, И ВОЧЕЛОВЕЧШАСЯ.

4. РАСПЯТАГО ЖЕ ЗА НЫ ПРИ ПОНТИЙСТЕМ ПИЛАТЕ, И СТРАДАВША, И ПОГРЕБЕННА.

5. И ВОСКРЕСШАГО В ТРЕТИЙ ДЕНЬ, ПО ПИСАНИЕМ.

6. И ВОЗШЕДШАГО НА НЕБЕСА, И СЕДЯЩА ОДЕСНУЮ ОТЦА.

7. И ПАКИ ГРЯДУЩАГО СО СЛАВОЮ СУДИТИ ЖИВЫМ И МЕРТВЫМ, ЕГОЖЕ ЦАРСТВИЮ НЕ БУДЕТ КОНЦА.

8. И В ДУХА СВЯТАГО, ГОСПОДА ЖИВОТВОРЯЩАГО, ИЖЕ ОТ ОТЦА ИСХОДЯЩАГО, ИЖЕ СО ОТЦЕМ И СЫНОМ СПОКЛОНЯЕМА И ССЛАВИМА, ГЛАГОЛАВШАГО ПРОРОКИ.

9. ВО ЕДИНУ СВЯТУЮ, СОБОРНУЮ И АПОСТОЛЬСКУЮ ЦЕРКОВЬ.

10. ИСПОВЕДУЮ ЕДИНО КРЕЩЕНИЕ ВО ОСТАВЛЕНИЕ ГРЕХОВ.

11. ЧАЮ ВОСКРЕСЕНИЯ МЕРТВЫХ.

12. И ЖИЗНИ БУДУЩАГО ВЕКА. АМИНЬ.

Праваслаўныя пасты і святы

Сёння вера святая — святло сярод ночы!
Паратуе яна, дапаможа ў бядзе.
Той, хто з верай жыве, той ніколі не збоча
З пуцявіны, якая да Бога вядзе.

С. Давідовіч

Аб праваслаўных пастах

Пост — гэта такія дні, калі мы павінны больш думаць пра Бога, пра свае грахі, больш маліцца, каяцца, не раздражняцца, нікога не крыўдзіць, а, наадворот, усім дапамагаць, чытаць Евангелле, Закон Божы і г.д.

Пост — гэта час падрыхтоўкі душы да свята. Як адзенне мы старанна мыем, прасуем, упрыгожваем да свята, так і душу трэба ачысціць ад грахоў шчырым пакаяннем са слязьмі і ўпрыгожыць добрымі справамі.

Духоўны пост звязаны з цялесным. Ад таго, што мы ўжываем у ежу, залежыць не толькі наша здароўе, але і думкі, учынкі. У час посту рэкамендуецца перайсці ад ежы жывёльнага паходжання (мясных, малочных прадуктаў і яек) да раслiннай (жывёльныя бялкі замяняюць гарох, фасоля, грыбы, арэхі, семкі). Прытрымліваючыся посту, мы становімся больш лёгкімі, рухавымі, здольнымі да духоўнага жыцця. Падпарадкоўваючыся царкоўнаму статуту, людзі дысцыплінуюцца, праяўляюць уладу над сваімі звычкамі, умацоўваюць волю. Постам і малітваю душа ачышчаецца ад усялякага зла.

Іаан Златавуст сказаў: «Хто абмяжоўвае пост толькі ўстрыманнем ад ежы, той больш за ўсё ганьбіць яго. Ты пасцішся? Давядзі мне гэта сваімі справамі... Што за карысць, калі мы ўстрымліваемся ад птушак і рыб, а братоў кусаем і з'ядаем?» Так, пост перш за ўсё — гэта духоўнае ўдасканальванне, заснаванае на прынцыпе самакантролю.

Пост — самае старадаўняе царкоўнае правіла. Пасціліся старазапаветныя праведнікі, пасціўся Іаан Прадцеча, які хрысціў у водах Іардана Самога Збавіцеля. І, урэшце, Ісус Хрыстос пасціў сорак дзён перад пропаведдзю. Па Яго прыкладу ўстаноўлены саракадзённы Вялікі пост.

На працягу года чатыры шматдзённыя пасты. Самы доўгі і строгі Вялікі Пост. Ён працягваецца сем тыдняў перад Вялікаднем, самыя строгія з якіх — першы і апошні. Гэты пост устаноўлены ў памяць саракадзённага посту Збавіцеля ў пустыні.

Блізкі па строгасці да Вялікага Успенскі пост, але ён карацейшы — з 14 па 27 жніўня. Гэтым постам Святая Царква ўшаноўвае Прасвятую Багародзіцу.

У строгія пасты рыбу можна есці толькі тры разы — на святы Благавешчання Прасвятой Багародзіцы (7 красавіка), Уваходу Гасподняга ў Іерусалім (за тыдзень да Вялікадня), Праабражэння Гасподняга (19 жніўня).

Калядны пост працягваецца з 28 лістапада па 6 студзеня. Рыбу есці дазваляецца, акрамя панядзелка, серады і пятніцы. Пасля свята Свяціцеля Мікалая (19 снежня) рыбу можна есці толькі па суботах і нядзелях, а перыяд з 2 па 6 студзеня трэба праводзіць у поўнай строгасці.

Пост святых апосталаў Пятра і Паўла пачынаецца з Тыдня ўсіх Святых і заканчваецца да дня памяці святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла — 12 ліпеня. Устанаўленне аб харчаванні ў гэты пост, як і ў першы перыяд Каляднага.

Дні строгага посту:

Надвячорак Хрышчэння Гасподняга — 18 студзеня,

Адсячэнне галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня,

Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга — 27 верасня.

Посцяць па серадах і пятніцах на працягу ўсяга года, акрамя ўсёядных тыдняў і Калядаў, таму што ў сераду Ісус Хрыстос быў прададзены Іудам, а ў пятніцу распяты па патрабаванню іудзеяў.

Некаторае паслабленне ў строгасці посту дапускаецца для тых, хто хварэе ці заняты цяжкай працай, для цяжарных і кормячых жанчын. Гэта робіцца дзеля таго, каб пашчэнне не прывяло да рэзкага ўпадку сіл і хрысціянін мог выконваць малітвенныя правілы і неабходную працу.

АБ ПРАВАСЛАЎНЫХ СВЯТАХ

Самым галоўным хрысціянскім святам з'яўляецца Светлае Хрыстова Уваскрасенне (Пасха), якое ў народзе называецца Вялікдзень. Затым ідуць двунадзесятыя святы (іх дванаццаць). Яны ўстаноўлены ў гонар і славу Госпада нашага Ісуса Хрыста і Прачыстай Яго Маці Дзевы Марыі:

РАСТВО ХРЫСТОВА — 7 СТУДЗЕНЯ

ХРЫШЧЭННЕ ГАСПОДНЯЕ (ВАДОХРЫШЧА) — 19 СТУДЗЕНЯ

СТРЭЧАННЕ ГАСПОДНЯЕ (ГРАМНІЦЫ) — 15 ЛЮТАГА

УВАХОД ГОСПАДА Ў ІЕРУСАЛІМ (ВЕРБНІЦА)

БЛАГАВЕШЧАННЕ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ — 7 КРАСАВІКА

УЗНЯСЕННЕ ГАСПОДНЯЕ (УШЭСЦЕ)

ДЗЕНЬ СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ (ПЯЦІДЗЕСЯТНІЦА)

ПРААБРАЖЭННЕ ГАСПОДНЯЕ (ЯБЛЫЧНЫ СПАС) — 19 ЖНІЎНЯ

УСПЕННЕ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ (ПЕРШАЯ ПРАЧЫСТАЯ) — 28 ЖНІЎНЯ

НАРАДЖЭННЕ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ (ДРУГАЯ ПРАЧЫСТАЯ) — 21 ВЕРАСНЯ

УЗДЗВІЖАННЕ КРЫЖА ГАСПОДНЯГА — 27 ВЕРАСНЯ

УВЯДЗЕННЕ Ў ХРАМ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ — 4 СНЕЖНЯ

Большая частка іх святкуецца штогод у адзін і той жа дзень і таму носіць назву неператходных. Такіх свят дзевяць (іх даты ўказаны па новаму стылю). Астатнія святы залежаць ад даты Вялікадня і называюцца пераходнымі.

Табліца пераходных свят
(даты ўказаны па новаму стылю)

Год	Вербная нядзеля	Вялікдзень	Узнясенне Гасподняе	Дзень Святой Тройцы
2005	24 красавіка	1 мая	9 чэрвеня	19 чэрвеня
2006	16 красавіка	23 красавіка	1 чэрвеня	11 чэрвеня
2007	1 красавіка	8 красавіка	17 мая	27 мая
2008	20 красавіка	27 красавіка	5 чэрвеня	15 чэрвеня
2009	12 красавіка	19 красавіка	28 мая	7 чэрвеня
2010	28 сакавіка	4 красавіка	13 мая	23 мая
2011	17 красавіка	24 красавіка	2 чэрвеня	12 чэрвеня

Светлае Хрыстова Уваскрасенне
(Пасха)

Сярод хрысціянскіх свят Пасха Гасподняя — найвышэйшая, найбольш радасная і ўрачыстая падзея. У гэты дзень успамінаецца Уваскрасенне Госпада нашага Ісуса Хрыста пасля Яго смерці на Крыжы. Уваскрэснуўшы, Хрыстос асвяціў, благаславіў і зацвердзіў агульнае Уваскрасенне ўсіх людзей.

Сілай Свайго Уваскрасення Ён вызваліў усіх веруючых ад улады грэху і сатаны. «Я есмь Воскресение и Жизнь. Верующий в меня, если и умрет, оживет» (Ін. 11, 25—26).

Пасля суботы ноччу адбылося моцнае землетрасенне. Ангел Гасподні, сышоўшы з неба, адваліў камень ад магільных дзвярэй, і Гасподзь Ісус Хрыстос уваскрэс і падняўся з магілы!

На світанні жанчыны-міраносіцы прыйшлі ў сад, дзе была пячора, каб памазаць цела Ісуса духмянасцямі, якія яны прынеслі з сабой.

Пакуль жанчыны ішлі, бедавалі і са смуткам гаварылі: «Хто адваліць нам камень ад дзвярэй пячоры ў магілу?» Падышоўшы да пячоры, яны здзівіліся, убачыўшы, што камень, якім былі прывалены дзверы, адвалены, хоць і быў ён даволі вялікі. Увайшоўшы ў пячору, жанчыны ўбачылі Ангела, апранутага ў белае адзенне. Усіх ахапіў жах, але Ангел сказаў: «Не бойцеся! Я ведаю, што вы шукаеце Ісуса ўкрыжаванага. Яго тут няма. Ён уваскрэс, як і казаў. Падыдзіце і зірніце на месца, дзе ляжаў Гасподзь. Ідзіце хутчэй і накажыце Яго вучням, што Ён уваскрэс з мёртвых».

Жанчыны з вялікай радасцю пабеглі абвясціць вучням аб Уваскрасенні Хрыстовым. Многія тады не паверылі ў гэта, нават вучні Хрыста. Але Збавіцель не раз з'яўляўся людзям, і сэрцы іх напаўняліся радасным чаканнем агульнага Уваскрасення.

Як жа Праваслаўная Царква святкуе Светлае Хрыстова Уваскрасенне? Перад самай поўначчу ўрачысты звон апавяшчае аб наступленні вялікай часіны Святланоснага Свята Уваскрасення Хрыстова. Свяшчэннаслужыцелі з Крыжам, свяцільнікамі і фіміямам выходзяць з алтара і разам з народам абыходзяць Царкву са спевам: *«Воскресение Твое Христе Спасе! Ангели поют на Небеси! И нас на земли сподоби чистым сердцем Тебе славити...»*

Веруючыя ідуць з запаленымі свечкамі, выказваючы гэтым духоўную радасць. Спыніўшыся перад зачыненымі дзвярыма, свяшчэннік тройчы спявае Пасхальны трапар:

«ХРИСТОС ВОСКРЕСЕ ИЗ МЕРТВЫХ, СМЕРТИЮ СМЕРТЬ ПОПРАВ И СУЩИМ ВО ГРОБЕХ ЖИВОТ ДАРОВАВ».

Пасля гэтага дзверы расчыняюцца, і ўсе ўваходзяць. «Христос Воскресе!» — абвяшчае свяшчэннік. «Воистину Воскресе!» — радасна адказваюць веруючыя. Гэтымі ж словамі яны вітаюць адзін аднаго і тройчы цалуюцца.

Светлае Хрыстова Уваскрасенне — свята перамогі Любові над нянавісцю, Жыцця — над смерцю, свята нашай надзеі на агульнае Уваскрасенне.

Раство Хрыстова

У горадзе Назарэце, што на поўначы Ізраіля, жыла Дзева Марыя. Яе бацькамі былі праведныя Іаакім і Ганна. Калі дзяўчынцы было тры гады, Іаакім і Ганна прывялі яе ў храм. З гэтага моманту жыццё Марыі было прысвечана служэнню Богу. Марыя жыла пры храме гадоў адзінаццаць. Вырасла глыбока набожнай, пакорнай Богу і сціплай. Яна вырашыла прысвяціць жыццё толькі аднаму Богу і для гэтага дала зарок ніколі не выходзіць замуж.

Калі Дзеве Марыі споўнілася чатырнаццаць год, пры храме Ёй нельга было заставацца: трэба выходзіць замуж ці вяртацца да бацькоў. Праведныя Іаакім і Ганна да таго часу памерлі, таму свяшчэннікі хацелі выдаць Дзеву Марыю замуж. Яна аб'явіла пра сваё абяцанне Богу. Тады па ўнушэнню Божаму Яе заручылі з Іосіфам — васьмідзесяцігадовым старцам, які быў Ёй далёкім сваяком. Іосіф жыў у Назарэце і займаўся сталярнай справай.

Аднойчы Дзеве Марыі з'явіўся Ангел Гасподні, які прынёс Ёй радасную вестку аб нараджэнні Сына Божага.

Калі Марыя была цяжарная, выйшаў загад рымскага кесара Аўгуста. Дзе б хто ні жыў, дзеля перапісу павінен пайсці ў тое месца, дзе некалі жылі яго продкі. Іосіф і Марыя паходзілі з роду цара Давіда. Родным горадам Давіда быў Віфлеем. Некалі Давід цараваў над усім Ізраілем.

Іосіф і Марыя накіраваліся ў Віфлеем, у далёкую дарогу — ад Назарэта да Віфлеема больш за дзвесце кіламетраў. Такое падарожжа патрабавала некалькі дзён.

Іосіф і Марыя прыйшлі ў Віфлеем з некаторым спазненнем. У гасцініцах усе месцы былі ўжо заняты такімі ж, як яны. Іосіф і Марыя пасяліліся ў хляве, які знаходзіўся ў пячоры.

У гэтай пячоры ў Прасвятой Дзевы Марыі ноччу нарадзіўся Младзенец — Хрыстос, Збавіцель свету. Маці з вялікай любоўю і пяшчотай спавіла і палажыла Яго на салому ў яслях. Младзенца акружалі нябачныя Ангелы, і цёмнае скляпенне пячоры здавалася прыгожым азораным небам.

Вялікая таямнічая ноч, калі нарадзіўся Збавіцель, была незвычайна ціхай. Па ўсяму Сусвету адбываліся цуды. Самым вялікім цудам было з'яўленне перад віфлеемскімі пастухамі Ангелаў, якія спявалі: «Слава в вышних Богу и на земли мир, в человецех благоволение». Пастухі паспяшаліся пакланіцца Божаму Младзенцу, аб нараджэнні Якога абвясцілі Ангелы.

На паклон да Збавіцеля з Усходу прыйшлі тры мудрацы-астролагі: Гаспар, Мельхіёр і Валтасар. Яны ўбачылі ў небе новую зорку і зразумелі, што нарадзіўся Вялікі Цар. Мудрацы падарылі Яму золата, ладан і смірну. Пасля сустрэчы з Младзенцам Хрыстом мудрацы адмовіліся ад свайго ведання, звязанага з варажбой на зорках, і сталі вучнямі Хрыста.

Ва ўспамін Раства Ісуса Хрыста Царквой устаноўлена свята. У хрысціянскіх народаў стала звычаем упрыгожваць да гэтага свята елку. Лічыцца, што яна сімвалізуе Дрэва Жыцця, вернутае нам з нараджэннем Збавіцеля. Упрыгожаная запаленымі свечкамі або лямпачкамі, елка з'яўляецца сімвалам духоўнага святла, якое прасвятліла свет з прыходам Хрыста.

У дзень Раства на ўсёй зямлі ў дамах і храмах запальваюць свечкі, спяваюць песні аб народжаным на свет Богамладзенцы і Яго Прачыстай Маці.

Калядны трапар:

РОЖДЕСТВО ТВОЕ, ХРИСТЕ БОЖЕ НАШ, ВОЗСИЯ МИРОВИ СВЕТ РАЗУМА: В НЕМ БО ЗВЕЗДАМ СЛУЖАЩИЕ ЗВЕЗДОЮ УЧАХУСЯ ТЕБЕ КЛАНЯТИСЯ, СОЛНЦУ ПРАВДЫ, И ТЕБЕ ВЕДЕТИ С ВЫСОТЫ ВОСТОКА. ГОСПОДИ, СЛАВА ТЕБЕ!

ТАЯМНІЧАЯ НОЧ

(урывак з літаратурна-музычнай кампазіцыі Ф.А. Палачаніна «Пакроў Прасвятой Багародзіцы»)

На сцэне тры пастухі, якія вартуюць статкі. Убачыўшы Ангела, асветленага яркім промнем, яны моцна напалохаліся.

Другі вядучы. Ім першым начное неба
Тайну сваю адкрыла.
Ангел Гасподні раптам з'явіўся,
І слава Гасподняя іх азарыла.

Т р э ц і А н г е л. Не бойцеся!
Я абвяшчаю радасць вялікую:
Сёння нарадзіўся вам Збавіцель
У горадзе Давідавым.
Ён і ёсць Хрыстос Гасподзь.
Адзнака можа вам паслужыць:
Вы знойдзеце спавітае Дзіця,
Якое ў яслях ляжыць.

Д р у г і в я д у ч ы. Толькі радасную вестку атрымалі,
Як яшчэ Ангелы завіталі.
Яны, славячы Бога,
Весела спявалі:

А н г е л ы. Слава Богу ў вышніх,
І на зямлі мір,
А ў людзях прыхільнасць
І добрая воля.

Спеў Ангелаў аддаляецца.

П е р ш ы п а с т у х. У Віфлеем хадзем хутчэй!
Паглядзім, што там адбылося!

Д р у г і п а с т у х. Няўжо гэта праўда,
Што пачуць нам давялося?!

Усе пастухі бягуць са сцэны.

П е р ш ы в я д у ч ы. І, забыўшыся на статкі,
Яны ў Віфлеем памчалі.
Там Збавіцеля Госпада Хрыста
У пячоры на сене адшукалі.

Д р у г і в я д у ч ы. Пастухі паклонам Ісуса прывіталі,
А Яго бацькам усё,
Што бачылі і чулі ад Ангелаў,
Шчыра расказалі.

П е р ш ы в я д у ч ы. Слухаючы іх расказ,
Марыя і Іосіф моцна здзіўляліся.
У сэрцы Дзевы Марыі
Словы тыя навек захаваліся.

Д р у г і в я д у ч ы. Славячы Бога,
Пастухі да статкаў вярталіся.
Іх сэрцы вялікай радасцю
І любоўю перапаўняліся.

На сцэну вяртаюцца ўсхваляваныя пастухі.

П е р ш ы п а с т у х. Дзякуй міламу Богу за ўсё,
Што пачуць і ўбачыць давялося!

Т р э ц і п а с т у х. А маё ж сэрца ад страху
Тады ледзь не зайшлося...

Д р у г і п а с т у х. Затое, як убачылі Збавіцеля,
Сэрцы радасцю сталі напаўняцца.

Т р э ц і п а с т у х. Нам першым выпала шчасце
Пра Яго нараджэнне дазнацца.

Д р у г і п а с т у х. Гэту вясёлую вестку
Людзям трэба хутчэй перадаць!

Т р э ц і п а с т у х. Я папільную статкі,
А вы бяжыце народ радаваць!

Гучыць «Рождественская песня».

Хрышчэнне Гасподняе

Калі Ісусу Хрысту споўнілася трыццаць гадоў, Ён прыйшоў на раку Іардан, дзе Іаан хрысціў народ, і сказаў, што таксама хоча ахрысціцца. Бог адкрыў Іаану Хрысціцелю, Хто падышоў да яго, і той усклікнуў: «Мне трэба хрысціцца ў Цябе, а Ты прыходзіш да мяне». Але Ісус адказаў: «Цяпер дапусці, бо так належыць нам здзейсніць усякую праўду». З гэтымі словамі Ісус Хрыстос зайшоў у ваду.

Ахрысціўшыся, Ісус выйшаў з вады. І вось адчынілася Яму неба, і ўбачыў Іаан Духа Божага, Які сыходзіў, як голуб, і на Ісуса апускаўся. І голас Бога Айца гучна прамовіў: «Гэты ёсць Сын Мой узлюблены, у Якім Мая добрая воля». Так у час Хрышчэння Ісуса Хрыста Бог упершыню адкрыўся людзям адначасова ва ўсіх трох Іпастасях Святой Тройцы: Бог Айцец гаварыў з неба, Бог Сын хрысціўся, Бог Дух Святы ў выглядзе галуба сыходзіў на Бога Сына.

19 студзеня, у дзень Хрышчэння Гасподняга (Вадохрышча), вада асвячаецца як у храмах, так і ў рэках, вадаёмах, студнях. Вернуючыя, памаліўшыся, карыстаюцца гэтай вадой кожную раніцу нашча, а таксама акрапляюць ёю храмы, жыллё.

Трапар:

ВО ИОРДАНЕ КРЕЩАЮЩУСЯ ТЕБЕ, ГОСПОДИ, ТРОИЧЕСКОЕ ЯВИСЯ ПОКЛОНЕНИЕ: РОДИТЕЛЕВ БО ГЛАС СВИДЕТЕЛЬСТВОВАШЕ ТЕБЕ, ВОЗЛЮБЛЕННАГО ТЯ СЫНА ИМЕНУЯ; И ДУХ В ВИДЕ ГОЛУБИНЕ, ИЗВЕСТВОВАШЕ СЛОВЕСЕ УТВЕРЖДЕНИЕ. ЯВЛЕЙСЯ, ХРИСТЕ БОЖЕ, И МИР ПРОСВЕЩЕЙ, СЛАВА ТЕБЕ!

Стрэчанне Гасподняе

(Грамніцы)

Праз сорак дзён пасля Свайго нараджэння Ісус Хрыстос, згодна з Законам Майсеевым, быў прынесены ў Ерусалімскі храм. Таму і мы праз сорак дзён пасля Раства (2/15 лютага) святкуем у Царкве Стрэчанне Гасподняе.

Сустрэча Дзіцяці Хрыста са старцам Сімяонам і прарочыцай Аннай — галоўная падзея гэтага свята. Сімяону было прадказана Духам Святым, што ён не памрэ, пакуль не ўбачыць Хрыста Гасподня. Натхнёны Духам, ён прыйшоў у Храм, дзе і сустрэў нованароджанага Месію. Сімяон узяў на рукі Хрыста, падзякаваў Богу і сказаў: «Цяпер адпускаеш раба Твайго, Уладар, паводле слова Твайго, з мірам, бо ўбачылі вочы мае выратаванне Тваё, якое Ты падрыхтаваў перад абліччам усіх народаў, — Святло для прасвятлення язычнікаў і для славы народа Твайго Ізраіля».

Прарочыца Анна прысутнічала пры гэтым, славіла Госпада і гаварыла пра Яго ўсім, хто чакаў збаўлення ў Іерусаліме.

Потым Сімяон благаславіў Іосіфа і Марыю. З прарочымі словамі святы звярнуўся да Марыі: «Гэты Младзенец — на падзенне і паўстанне многіх у Ізраілі. Ён будзе падставай для спрэчак: адны будуць сцвярджаць, што Ён дзеля дабра, іншыя, наадварот, — што Ён падманвае ўсіх. І зробяць Яго, паводле прарока Іераміі, мішэнню, у якую страляюць, павесіўшы на дрэве крыжовым, і, як стрэлы, будуць пранізваць Яго цвікі. У той час і Табе Самой, Бязмужняя Маці, пройдзе скрозь душу зброя тугі і хваробы сардэч-

най, калі пабачыш Ты Сына Твайго ўкрыжаваным і калі Яго нібыта будзеш праводзіць са свету з вялікай скрухаю і слязьмі, і ўзрадуешся Яго Уваскрасенню, і будуць Табе адкрыты помыслы многіх сэрцаў» (Лк. II, 34—35).

Тады Марыя не ведала, якімі будуць гэты жах і гэтая пакута. Пазней, стоячы каля Крыжа Гасподняга на Галгофе, Яна пераЖыве ўсё да канца: смутак і гора Маці, Якая бачыць Свайго Сына распятым на Крыжы паводле неправеднага суда, нянавісць людзей, дзеля якіх Ён жыў, прапаведаваў, дзеля якіх Бог стаў чалавекам. Бачыла Яна, як паступова згасала Яго жыццё. І, нарэшце, прыняла Яна Яго памерлага на Свае рукі. Гэта Ёй прадказаў Сімяон Богапрыімец. Калі мы святкуем гэты дзень, радуемся аб нашым выратаванні. Успомнім жа і аб раздзіраючым душу смутку Божай Маці.

На Беларусі існуе звычай асвячаць свечкі, якія выкарыстоўваюцца не толькі падчас грому ці навальніц, але і калі на нас находзіць гром нябеснага пакарання ці навала ад нячыстага, калі гора і бяда прыходзяць у нашу хаціну знянацку. Шчырай малітвай і запальваннем стрэчанскіх свечак перад святымі іконамі мы павінны духоўна граміць усё нядобрае і грахоўнае, што спакушае і адводзіць нас ад Збавіцеля, ад святасці жыцця і веры праваслаўнай. Вось чаму гэтае свята вядома на Беларусі пад назвай «Грамніцы».

Трапар:

РАДУЙСЯ, БЛАГОДАТНАЯ БОГОРОДИЦЕ ДЕВО, ИЗ ТЕБЕ БО ВОЗСИЯ СОЛНЦЕ ПРАВДЫ, ХРИСТОС БОГ НАШ, ПРОСВЕЩАЯЙ СУЩИЯ ВО ТЬМЕ. ВЕСЕЛИСЯ И ТЫ, СТАРЧЕ ПРАВЕДНЫЙ, ПРИЕМЫЙ ВО ОБЬЯТИЯ СВОБОДИТЕЛЯ ДУШ НАШИХ, ДАРУЮЩАГО НАМ ВОСКРЕСЕНИЕ.

Уваход Госпада ў Іерусалім
(Вербніца)

Уваход Госпада ў Іерусалім інакш называецца Вербнай Нядзеляй, або Вербніцай. Менавіта за тыдзень да Вялікадня Збавіцель уехаў у горад на асле, у простым адзенні. Нягледзячы на такую сціпласць, Яго сустракалі, як Цара. На шляху Збавіцеля пасцілалі вопратку і пальмавыя галінкі з воклічам: «Асанна Сыну Давідаваму! Благаславёны, хто ідзе ў імя Гасподняе! Асанна ў вышніх!»

Ісус Хрыстос глядзеў на горад і смуткаваў, не аб Сабе — аб горадзе: «...О, калі б ты хоць у гэты дзень твой даведаўся, што служыць твайму міру! Але гэта цяпер схавана ад вачэй тваіх. Бо настануць дні, калі ворагі твае абложаць цябе акопамі і акружаць цябе, і сціснуць цябе адусюль, і разбураць цябе, і паб'юць дзяцей тваіх у табе, і не пакінуць у табе каменя на камені за тое, што ты не даведаўся часу твайго наведвання» (Лк. 19, 42—44).

Фарысеі забаранялі людзям лічыць Хрыста Царом. Але людзі не слухалі іх, радаваліся. Тады фарысеі сказалі Ісусу, каб Ён забараніў вучням праслаўляць Яго. Збавіцель адказаў: «Кажу вам, калі яны замоўкнуць, то камяні загалосяць».

Людзі хацелі бачыць у Ім правадыра, які змог бы вызваліць іх ад улады рымлян. Але Ісус ішоў у іудзейскую сталіцу не дзеля таго, каб стаць зямным царом і ўзвысіць народ яўрэйскі над іншымі народамі, а каб Самому прыняць пакуты і памерці за ўсе народы.

У нас не растуць пальмы, таму мы прыходзім у Царкву з галінкамі вярбы, у якой лісцікі распускаюцца раней, чым у іншых раслін. Адсюль і назва — Вербная Нядзеля.

Трапар:

ОБЩЕЕ ВОСКРЕСЕНИЕ ПРЕЖДЕ ТВОЕЯ СТРАСТИ УВЕРЯЯ, ИЗ МЕРТВЫХ ВОЗДВИГА ЕСИ ЛАЗАРЯ, ХРИСТЕ БОЖЕ. ТЕМЖЕ И МЫ, ЯКО ОТРОЦЫ, ПОБЕДЫ ЗНАМЕНИЯ НОСЯЩЕ, ТЕБЕ, ПОБЕДИТЕЛЮ СМЕРТИ, ВОПИЕМ: «ОСАННА В ВЫШНИХ, БЛАГОСЛОВЕН ГРЯДЫЙ ВО ИМЯ ГОСПОДНЕ».

БЛАГАВЕШЧАННЕ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ

Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы — адно з вялікіх свят, якое адзначаецца Святой Праваслаўнай Царквой 7 красавіка. Слова «благавешчанне» азначае добрая, радасная вестка, вестка аб тым, што пачалося вызваленне чалавечага роду ад грэху і вечнай смерці.

Прасвятая Дзева Марыя жыла ў доме праведнага Іосіфа і ў вольны ад работы час малілася, чытала Свяшчэннае Пісанне. Аднойчы ёй з'явіўся Архангел Гаўрыіл, пасланец Божы, і сказаў: «Радуйся, ласкаю абдараваная! Гасподзь з табою, Блаславёная ты паміж жанчынамі». Марыя, убачыўшы Ангела, засаромелася. Ён сказаў: «Не бойся, Марыя, бо ты атрымала мілату ад Бога. І вось ты зачнеш ва ўлонні і народзіш Сына, і дасі Яму імя: Ісус. Ён назавецца Сынам Усявышняга, і дасць Яму Гасподзь Бог прастол Давіда, бацькі Яго. І будзе Ён цараваць над домам Якава вечна, і Царству Яго не будзе канца».

Марыя тады яшчэ не была замужам, але была заручана з Іосіфам. Яна спытала ў Ангела: «Як гэта будзе, калі я мужа не знаю?» Ангел адказаў: «Дух Святы сыдзе на Цябе і сіла Усявышняга асяніць Цябе, таму народзіцца Святое і назавецца Сынам Божым». Тады Марыя з пакорлівасцю сказала: «Я — раба Гасподня! Хай сказанае збудзецца».

Даведаўшыся, што Марыя чакае дзіця, Іосіф хацеў пакінуць яе, але Ангел Гасподні явіўся яму ў сне і сказаў: «Іосіф, Давідаў сын! Не бойся і прымі Марыю, жонку тваю, бо тое, што нараджаецца ў ёй, ёсць ад Духа Святога. Народзіш Сына, і дасі Яму імя Ісус, бо Ён збавіць людзей ад грахоў іх».

У Госпада ніякае слова не застаецца бяссільным. Марыя нарадзіла Дзіця, і назвалі Яго Ісусам.

Трапар:

ДНЕСЬ СПАСЕНИЯ НАШЕГО ГЛАВИЗНА, И ЕЖЕ ОТ ВЕКА ТАИНСТВА ЯВЛЕНИЕ: СЫН БОЖИЙ СЫН ДЕВЫ БЫВАЕТ, И ГАВРИИЛ БЛАГОДАТЬ БЛАГОВЕСТВУЕТ. ТЕМЖЕ И МЫ С НИМ БОГОРОДИЦЕ ВОЗОПИИМ: «РАДУЙСЯ, БЛАГОДАТНАЯ, ГОСПОДЬ С ТОБОЮ».

УЗНЯСЕННЕ ГАСПОДНЯЕ

(Ушэсце)

Узнясенне Госпада нашага Ісуса Хрыста святкуецца Святой Праваслаўнай Царквой як адно з вялікіх свят на саракавы дзень ад першага дня Вялікадня.

Пасля ўваскрасення Ісус яшчэ сорак дзён з'яўляўся вучням і гаварыў ім пра Царства Божае. Урэшце, сабраўшы іх, сказаў: «Не пакідайце Іерусаліма, але чакайце абяцанага ад Айца, пра што вы чулі ад Мяне. Бо Іаан хрысціў вадою, а вы праз некалькі дзён пасля гэтага будзеце ахрышчаныя Духам Святым... Вы прымеце сілу, калі сыдзе на вас Святы Дух, і будзеце Мне сведкамі ў Іерусаліме і ва ўсёй Іудзеі, і Самарыі, і нават па краі зямлі... Ідзіце па ўсім свеце і прапаведуйце Евангелле ўсім жывым. Хто будзе вераваць і хрысціцца, выратуецца; а хто не будзе вераваць, будзе асуджаны. Хто паверыць, таму будуць спадарожнічаць знаменні: імем Маім злых духаў выганяць будуць, гаварыць новымі мовамі будуць; дакранацца да змей будуць; і калі што смертаноснае вып'юць, ім не пашкодзіць. Ускладуць рукі на хворых, і яны здаровымі будуць».

Ісус Хрыстос, падняўшы рукі Свае, благаславіў вучняў Сваіх і ўзняўся на неба. Воблака засланіла Збавіцеля, і яны больш не бачылі Яго.

Вучні пакланіліся Госпаду і яшчэ доўга стаялі і глядзелі ўслед Яму. Тады з'явіліся перад імі два Ангелы ў белым адзенні і сказалі: «Мужы галілейскія! Што вы стаіце і глядзіце на неба? Гэты Ісус, што ўзнёсся ад вас на неба, прыйдзе такім самым чынам, якім і бачылі вы, калі Ён узыходзіў на неба».

Трапар:

ВОЗНЕСЛСЯ ЕСИ ВО СЛАВЕ, ХРИСТЕ БОЖЕ НАШ, РАДОСТЬ СОТВОРИВЫЙ УЧЕНИКОМ, ОБЕТОВАНИЕМ СВЯТАГО ДУХА, ИЗВЕЩЕННЫМ ИМ БЫВШИМ БЛАГОСЛОВЕНИЕМ, ЯКО ТЫ ЕСИ СЫН БОЖИЙ, ИЗБАВИТЕЛЬ МИРА.

ДЗЕНЬ СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ
(Пяцідзесятніца)

Праваслаўная Царква адзначае дзень Святой Тройцы, калі адбылося Сашэсце Святога Духа на апосталаў. Назва дня Святой Тройцы тлумачыцца тым, што Сашэсцем Святога Духа на апосталаў праявіліся Трэцяя Іпастась і адзінства Прасвятой Тройцы — Айца, Сына і Святога Духа. Гэты дзень яшчэ называецца Пяцідзесятніцай, таму што прыпадае на пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня. Вось што адбылося ў той памятны дзень.

У дзень Пяцідзесятніцы Божая Маці разам з апосталамі знаходзілася ў Іерусаліме, дзе чакала абяцанага сашэсця Святога Духа. Раптам пачуўся шум з неба як бы ад моцнага ветру і напоўніў увесь дом, дзе сабраліся апосталы. Потым з'явіліся языкі, як бы вогненныя і падзеленыя. Спачылі яны на кожным апостале. І адразу ўсе натхніліся Духам Святым і пачалі гаварыць на іншых мовах, чаго раней ніколі не было. Апосталы адчулі незвычайную радасць і натхненне. Відаць, перад іх унутраным зрокам з'явіліся ўсе справы і словы Хрыстовы, усё, чаму Ён вучыў з самага пачатку. Ім стала ясна тое, чаго яны не разумелі раней. З гэтай мінуты і да канца свайго жыцця апосталы сталі новымі людзьмі. Цяпер яны былі напоўнены непахіснай верай і вялікай сілай у пропаведзі Евангелля Хрыстова.

Аднак у той час, калі апосталы прынялі Духа Святога і заставаліся ўсе разам у пакоі, народ, што сабраўся па-за сценамі дома, заставаўся ў няведанні. Многія накіраваліся да дома апосталаў. Тады апостал Пётр і ўсе іншыя выйшлі да народа і пачалі сваю першую пропаведзь аб Хрысце Распятым і Уваскрэслым. Яны сталі гаварыць на мовах тых паломнікаў, якія ў той час напаўнялі Іерусалім, ніколі не вучыўшыся мовам. Гэта ўразіла ўсіх.

Спасылаючыся на сведчанні прарокаў Іаіля і Давіда, апостал Пётр натхнёнымі словамі заклікаў усіх да веры ў Хрыста, як Сына Божага і Збавіцеля, распятага і ўваскрэслага з мёртвых. Многія слухачы былі ўзрушаны тым, што пачулі, і звярнуліся да Пятра і іншых апосталаў з пытаннем: «Што нам рабіць, мужы-браты?» Апостал Пётр адказаў: «Пакайцеся, і хай хрысціцца кожны з вас у імя Ісуса Хрыста, каб дараваліся вам грахі, — і атрымаеце дар Святога Духа, бо абяцанае належыць вам і дзецям вашым, і ўсім

далёкім, каго толькі і ўважыць Гасподзь Бог наш» (Дзеі 2,37—38). У той дзень каля трох тысяч чалавек далучыліся да Царквы Хрыстовай. Гэтыя новыя члены Царквы цвёрда трымаліся вучэння апосталаў і былі ў брацкіх зносінах адзін з адным.

З гэтага вялікага дня і бярэ пачатак Царква Хрыстова. Дары Духа Святога былі пасланы ўсёй Царкве, перш за ўсё апосталам, а праз іх — усім веруючым.

У дзень Святой Тройцы з даўніх часоў хрысціяне ўпрыгожвалі храмы і свае дамы свежымі зялёнымі галінкамі дрэў. І самі стаялі ў храме з кветкамі. Дух Святы дае жыццё ўсяму. Свежая зеляніна і кветкі, якія ўпрыгожваюць зямлю, нагадваюць нам пра міласць Божую і пра дзеянне Святога Духа ва ўсім тварэнні Божым.

У гэты дзень Царква асабліва заклікае веруючых пакланіцца Трыадзінаму Богу — Айцу, Сыну і Святому Духу.

Трапар:

БЛАГОСЛОВЕН ЕСИ, ХРИСТЕ БОЖЕ НАШ, ИЖЕ ПРЕМУДРЫ ЛОВЦЫ ЯВЛЕЙ, НИСПОСЛАВ ИМ ДУХА СВЯТАГО, И ТЕМИ УЛОВЛЕЙ ВСЕЛЕННУЮ, ЧЕЛОВЕКОЛЮБЧЕ, СЛАВА ТЕБЕ.

ПРААБРАЖЭННЕ ГАСПОДНЯЕ
(Яблычны Спас)

Слаўнае Праабражэнне Госпада нашага Ісуса Хрыста святкуецца Святой Праваслаўнай Царквой 19 жніўня.

Каб падтрымаць веру ў вучнях перад Яго пакутамі, Ісус Хрыстос паказаў ім Сваю Божую славу.

Незадоўга да Сваіх пакут Ісус Хрыстос узяў Сваіх вучняў Пятра, Якава, Іаана і ўзышоў з імі на высокую гару памаліцца.Там Ісус пераўтварыўся перад імі: аблічча Яго заззяла, як сонца, адзенне пабялела, як святло. Нечакана для вучняў з'явіліся Майсей і Ілія. Яны размаўлялі з Ісусам пра тое, што Яму трэба будзе зрабіць у Іерусаліме. Тады Пётр сказаў Ісусу: «Госпадзе! Хораша нам тут

быць; калі хочаш, зробім тут тры намёты: Табе адзін, і Майсею адзін, і адзін Іліі». Сказаў ён гэта таму, што баяўся і ад страху не ведаў, што кажа. Калі ён гаварыў, светлае воблака накрыла іх, і вось голас з воблака сказаў: «Гэты ёсць Сын Мой Узлюблены, у Якім Мая добрая воля, Яго слухайце».

Пачуўшы гэты голас, вучні вельмі напалохаліся і ўпалі ніцма. Ісус Хрыстос, падышоўшы, дакрануўся да іх і сказаў: «Устаньце і не бойцеся». Вучні ўсталі і ўбачылі Ісуса Хрыста ў звычайным выглядзе.

Калі яны спускаліся з гары, Ісус сказаў: «Нікому не кажыце пра тое, што бачылі, пакуль Сын Чалавечы не ўваскрэсне з мёртвых».

Сваім праабражэннем Збавіцель паказаў нам, якімі стануць людзі ў будучым жыцці, у Царстве Нябесным, і як пераўтворыцца тады ўвесь наш зямны свет.

У свята Праабражэння Гасподняга ў Царкве асвяшчаюць яблыкі.

Трапар:

ПРЕОБРАЗИЛСЯ ЕСИ НА ГОРЕ, ХРИСТЕ БОЖЕ, ПОКАЗАВШИЙ УЧЕНИКОМ ТВОИМ СЛАВУ ТВОЮ, ЯКОЖЕ МОЖАХУ; ДА ВОЗСИЯЕТ И НАМ ГРЕШНЫМ СВЕТ ТВОЙ ПРИСНОСУЩИЙ, МОЛИТВАМИ БОГОРОДИЦЫ, СВЕТОДАВЧЕ, СЛАВА ТЕБЕ.

Успенне Прасвятой Багародзіцы

(Першая Прачыстая)

Пасля Уваскрасення Збавіцеля Прасвятая Багародзіца стала Маці для ўсіх Яго вучняў. Часта вучні прыходзілі да Маці Божай, слухалі павучальныя словы і разам з Ёю маліліся.

Калі вера хрысціянская распаўсюдзілася і ў іншых краінах, Багародзіца сустракала з далёкіх краёў многіх хрысціян. Яны спяшаліся з розных бакоў, каб убачыць Прасвятую Маці Божую і

пачуць Яе праўдзівыя словы пра Збавіцеля і Яго вучэнне. Калі ў Іерусаліме пачаліся іудзейскія ганенні на Царкву, Маці Божая з Іаанам Багасловам перасяліліся ў Эфес. Адтуль Яна наведала праведнага Лазара на востраве Кіпр і Афонскую гару, якую благаславіла.

Незадоўга да сваёй смерці Багародзіца вярнулася ў Іерусалім. Тут Яна часта наведвала месцы, з якімі былі звязаны найважнейшыя падзеі ў жыцці Яе Сына, асабліва апошнія дні Яго на зямлі, — Віфлеем, Галгофу, Труну Хрыста, Гефсіманію, Елеон. Успамінаючы пра Яго пакуты, Багародзіца плакала і шчыра малілася, а на месцы ўваскрасення і ўзнясення вельмі радавалася. Калі Маці Божая малілася на Елеонскай гары і схілялася ў зямных паклонах, адначасова з Ёю дрэвы схілялі свае верхавіны да зямлі.

Іудзеі рыхтавалі замах на жыццё Багародзіцы. Яны выстаўлялі сваю варту ля магілы Ісуса Хрыста. Але калі Маці Божая наведвала магілу Сына, варта была аслеплена.

Прасвятая Багародзіца жадала адысці да Свайго Сына. Аднойчы ў час Яе малітвы на Елеоне Архангел Гаўрыіл паведаміў, што праз тры дні закончыцца Яе жыццё зямное, і ўручыў Ёй райскую галінку — сімвал нятлення і перамогі над смерцю. Пачуўшы гэту вестку, Маці Божая ўзрадавалася і пачала рыхтавацца да хуткай смерці. Яна расказала свайму нарачонаму сыну Іаану пра гэтую вестку і дала яму несці перад ложам райскую галінку.

Пра дзень блізкай смерці Божай Маці апостал Іаан паведаміў апосталу Якаву, які ў той час быў епіскапам Іерусалімскай Царквы. Той загадзя абвясціў аб гэтым іерусалімскіх і навакольных хрысціян, і яны прыйшлі на пахаванне. Багародзіца пераказала ім словы архангела, паказала райскую галінку, потым зрабіла апошнія распараджэнні. З уласнай маёмасці Яна мела толькі два хітоны, якія завяшчала дзвюм бедным удовам, што шчыра служылі Ёй. Пахаваць сябе Божая Маці завяшчала ў Гефсіманіі паміж магіламі сваіх праведных бацькоў і абручніка Іосіфа.

Іншых апосталаў у той час у Іерусаліме не было. Яны разышліся ва ўсе канцы свету, дзе прапаведавалі вучэнне Ісуса Хрыста. Прасвятая Багародзіца вельмі хацела развітацца з імі. Пачуўся шум, які па сіле напамінаў раскаты грому. Гэта па загаду Збавіцеля Ангелы падхапілі і прынеслі на воблаках апосталаў. Убачыўшы адзін аднаго, яны выказвалі здзіўленне з нагоды незвычайнай падзеі. Сабраны былі не толькі 12 апосталаў, але і 70. З'явіўся і апостал Павел.

Даведаўшыся, чаму Бог іх сабраў, апосталы моцна засумавалі па Маці Божай. Багародзіца, як магла, усіх шчыра суцяшала, абяцала пасля смерці не пакідаць іх і ўсіх хрысціян, заўсёды за іх маліцца. Затым Маці Божая ўсіх благаславіла.

Прасвятая Багародзіца ляжала на ложы, усыпаным кветкамі, і чакала з'яўлення Свайго Сына. Раптам зазззяла невыказнае святло, дах пакоя адкрыўся, і сышоў Хрыстос з мноствам Ангелаў, са святымі праайцамі і прарокамі. Маці Божая звярнулася да Яго са словамі: «Велічае душа мая Госпада» — і прасіла благаславіць тых, хто шануе Яе памяць, абараніць Яе ад цёмнай сатанінскай сілы (г. зн. ад паветраных мытарстваў). Затым Яна аддала Сваю душу ў рукі Госпада, і ў той жа час раздаўся спеў Ангелаў. Апосталы позіркамі суправаджалі адыходзячую да Госпада душу Багародзіцы.

У час пахавання Маці Божай адбываліся цуды. Дакрануўшыся да Яе ложа, хворыя ацаляліся. Апосталы са спевам псалмоў і малітваў, са свечкамі і кадзіламі на сваіх руках перанеслі Яе цела з Іерусаліма ў Гефсіманію. Над ложам з'явілася воблачнае кола ў выглядзе вянца, азоранага ззяннем. Гэты вянец плыў над працэсіяй да месца пахавання пад спевы Ангелаў. За прачыстым целам Багародзіцы бясконца ішлі людзі. Там былі і іудзеі, якія ў Хрыста не верылі. Даведаўшыся пра гэта, іудзейскія святары і начальнікі страшна лютавалі. Яны паслалі слуг і воінаў разагнаць шэсце, вучняў Хрыста забіць, а цела Багародзіцы спаліць. Калі наблізілася пагоня, воблачны вянец апусціўся на зямлю і як сцяной акружыў хрысціян. Ганіцелі чулі спеў, але нічога не бачылі за воблакам; многія з іх былі аслеплены. Адны разбівалі галовы аб гарадскія сцены, другія шукалі сабе павадыроў. Іудзейскі святар Афоній хацеў перакуліць ложа. Толькі схапіўся за яго, як застаўся без рук. У той жа момант ён раскаяўся, і апостал Пётр яго ацаліў. Сярод аслепленых ганіцеляў настала шчырае раскаянне, пасля якога яны ўсе таксама атрымалі выздараўленне.

Апосталы палажылі цела Багародзіцы ў грабніцу і заставаліся пры ёй трое сутак, спяваючы днём і ноччу псалмы. Увесь гэты час у паветры чуўся спеў нябесных сіл.

Апостал Фама прыбыў у Іерусалім праз тры дні пасля пахавання. На яго сэрцы была вялікая туга, што не змог развітацца з Божай Маці. Апосталы злітаваліся над ім і адвалілі камень ад магільнай пячоры, каб даць магчымасць пакланіцца Прачыстаму целу Багародзіцы. Увайшоўшы ў пячору, яны ўбачылі, што цела

Багародзіцы не стала. На яго месцы ляжала пахавальнае пакрывала. Моцна здзіўленыя, апосталы ўсе разам вярнуліся ў дом і маліліся Богу, каб адкрыў ім, што стала з целам.

У час вячэрняй малітвы апосталы пачулі ангельскі спеў і ўбачылі ў паветры Багародзіцу, якая стаяла ў ззянні нябеснай славы. Яна сказала: «Радуйцеся! Я з вамі ва ўсе дні і заўсёды буду вашай малітвеніцай перад Богам». Апосталы разам ускрыкнулі: «Прасвятая Багародзіца, дапамагай нам!»

Так Ісус Хрыстос праславіў Сваю Прасвятую Маці: уваскрасіўшы і ўзяўшы да Сябе, паставіў вышэй усіх Ангелаў Сваіх.

Успенне Прасвятой Уладычыцы нашай Багародзіцы святкуецца Праваслаўнай Царквой 28 жніўня. Да гэтага свята належыць рыхтавацца двухтыднёвым постам. Свята называецца Успеннем, таму што Божая Маці памерла ціха, нібы заснула, а праз тры дні была ўваскрэшана Госпадам і ўзнесена на неба.

Трапар:

В РОЖДЕСТВЕ ДЕВСТВО СОХРАНИЛА ЕСИ, ВО УСПЕНИИ МИРА НЕ ОСТАВИЛА ЕСИ, БОГОРОДИЦЕ, ПРЕСТАВИЛАСЯ ЕСИ К ЖИВОТУ, МАТИ СУЩИ ЖИВОТА, И МОЛИТВАМИ ТВОИМИ ИЗБАВЛЯЕШИ ОТ СМЕРТИ ДУШИ НАША.

НАРАДЖЭННЕ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ

(Другая Прачыстая)

Кожны год 21 верасня Святая Праваслаўная Царква святкуе Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы. У гарадку Назарэце, што ў Палесціне, у праведных Іаакіма і Ганны нарадзілася дачка, Якую Царква ва ўсім Свеце праслаўляе як Маці Божую.

Дзева Марыя нарадзілася ў маленькім гарадку, які размясціўся ў паўночнай частцы Палесціны, удалечыні ад дарог і караванных шляхоў. Паломнікі, якія наведвалі Назарэт, кажуць, што неба над ім нейкага асаблівага, не параўнальнага ні з чым блакітнага колеру.

Блакітны колер — сімвал Божай Маці, Яе духоўнасці і чысціні, маўчання і нявіннасці, глыбокіх, як блакіт, нябёсаў.

Бацькі Божай Маці ўсё сваё доўгае жыццё малілі Бога, каб паслаў ім дзіця. Яны далі зарок прысвяціць сваё дзіця Богу. У састарэлых Іаакіма і Ганны ўжо на закаце іх жыцця нарадзілася дачка. Бацькі стараліся, каб усё гаварыла дзіцячай душы пра Бога. Нішто дрэннае не трапіла Ёй ні на слых, ні на вочы. На восьмы ад нараджэння дзень Ёй далі імя Марыя, што азначае «ўзвышаная».

Першыя словы, якія навучылася вымаўляць дзяўчынка, былі імя Божае і малітва. З узростам раскрывалася ў Яе сэрцы любоў да Бога.

Усё жыццё Прасвятой Багародзіцы — яркі промень дабра і святла. Ніякая цёмная сіла да Яе не наблізілася. Яна адзіная дзева, душа Якой не была затуманена ні на момант ніводным грахом.

Трапар:

РОЖДЕСТВО ТВОЕ, БОГОРОДИЦЕ ДЕВО, РАДОСТЬ ВОЗВЕСТИ ВСЕЙ ВСЕЛЕННЕЙ: ИЗ ТЕБЕ БО ВОЗСИЯ СОЛНЦЕ ПРАВДЫ ХРИСТОС БОГ НАШ И, РАЗРУШИВ КЛЯТВУ, ДАДЕ БЛАГОСЛОВЕНИЕ, И, УПРАЗДНИВ СМЕРТЬ, ДАРОВА НАМ ЖИВОТ ВЕЧНЫЙ.

Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга

У памяць аднойдзення Крыжа Хрыстова і Яго ўздзвіжання Святая Праваслаўная Царква ўстанавіла свята Уздзвіжання Пачэснага і Жыватворчага Крыжа Гасподняга. Яно святкуецца 27 верасня.

У 326 г. маці роўнаапостальнага Канстанціна Вялікага царыца Алена па даручэнні свайго сына адправілася ў Іерусалім, каб знайсці Крыж, на якім быў распяты Ісус Хрыстос. Доўгі час пошукі былі беспаспяховымі. Адзін састарэлы яўрэй, імя якога Іуда, паведаміў, што Крыж кінуты ў пячору і завалены смеццем і зямлёй, а зверху пабудаваны язычніцкі храм. Царыца Алена загадала разбурыць будынак і адкапаць Крыж.

Пасля раскопак пячоры знайшлі тры крыжы і дошчачку з надпісам: «Ісус Назаранін, Цар Іудзейскі», якая ляжала асобна ад іх. На адным з крыжоў быў распяты Збавіцель, на двух іншых — два разбойнікі. Але як пазнаць Святы Крыж Гасподні? Іерусалімскі патрыярх Макарый і царыца Алена цвёрда верылі і спадзяваліся, што Бог укажа на Святы Крыж Збавіцеля.

Здарылася, што ў гэты час па дарозе рухалася пахавальная працэсія. Патрыярх Макарый па чарзе стаў ускладаць крыжы на памерлага. Калі Крыж Гасподні дакрануўся да памерлага, той ажыў. Родныя ўваскрэшанага заплакалі ад радасці. Жыватворчы Крыж быў падняты так высока, каб яго здалёк маглі бачыць усе, хто прыйшоў на Галгофу, і пакланіцца яму.

Трапар:

СПАСИ, ГОСПОДИ, ЛЮДИ ТВОЯ И БЛАГОСЛОВИ ДОСТОЯНИЕ ТВОЕ, ПОБЕДЫ НА СУПРОТИВНЫЯ ДАРУЯ И ТВОЕ СОХРАНЯЯ КРЕСТОМ ТВОИМ ЖИТЕЛЬСТВО.

Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы

Святая Праваслаўная Царква штогод 4 снежня святкуе Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы. Свята ўстаноўлена ў памяць таго дня, калі праведныя Іаакім і Ганна прывялі ў Іерусалімскі храм сваю трохгадовую дачку Марыю, каб па дадзеным абяцанні прысвяціць Яе служэнню Богу. У гэты дзень Прасвятая Дзева ўступіла ў Святая Святых.

Пры ўваходзе ў храм было пятнаццаць прыступак. Іаакім і Ганна паставілі Дзеву Марыю на першую і на развітанне далі Ёй бацькоўскі наказ: «Дзіця, ідзі і будзь Таму, Хто ўсё Табе даў, узнясеннем і салодкай духмянасцю! Увайдзі ў тую глыбіню, уступі ў тую тайну, дзе няма ніякіх дзвярэй. Рыхтуйся стаць месцам усялення Самога Бога...»

Прасвятая Дзева пакінула бацькоў, з якімі Ёй было так добра, сваіх сяброўак і пры ўсеагульным здзіўленні сама па сабе ўзышла да самай высокай прыступкі. Там Яе сустрэў першасвятар, благаславіў і сказаў, што па натхненні Духа Святога ўвядзе ў Святая Святых, бо Дзева Марыя дастойная ступіць у свяшчэннае месца: Яна прызначана стаць Маці Збавіцеля.

Прасвятая Багародзіца першая ступіла ў Святая Святых. Некранутая ні адным грахом, Яна сэрцам адклікаецца на святыню.

Праведныя Іаакім і Ганна вярнуліся дадому, а Прасвятая Дзева засталася ў храме. Там Яна разам з іншымі дзяўчынкамі вучыла Закон Божы, чытала Свяшчэннае Пісанне, займалася рукадзеллем, строга захоўвала пост і многа малілася.

Трапар:

ДНЕСЬ БЛАГОВОЛЕНИЯ БОЖИЯ ПРЕДОБРАЖЕНИЕ И ЧЕЛОВЕКОВ СПАСЕНИЯ ПРОПОВЕДАНИЕ: В ХРАМЕ БОЖИИ ЯСНО ДЕВА ЯВЛЯЕТСЯ И ХРИСТА ВСЕМ ПРЕДВОЗВЕЩАЕТ. ТОЙ И МЫ ВЕЛЕГЛАСНО ВОЗОПИЕМ: «РАДУЙСЯ, СМОТРЕНИЯ ЗИЖДИТЕЛЕВА ИСПОЛНЕНИЕ!»

К ЦАРУ НЯБЕСНАМУ

(урывак з драмы Ф.А. Палачаніна «Доўгачаканая радасць»)

КАРЦІНА АДЗІНАЦЦАТАЯ

Дэкарацыі без змен. У пакоі шмат гасцей. Дзева Марыя ў цэнтры ўвагі. Усе Ёю любуюцца.

Е л і з а в е т а (з замілаваннем). Я ніяк не магу налюбавацца Марыяй! Якая ж яна прыгожая! Нават нейкая незвычайная...

С а р а. У гэтым убранні Яна падобная на Царыцу.

І с а а к. Няўжо вы не заўважылі, што Марыя ўпрыгожана не толькі незвычайным убраннем, але і ўсёй магчымай для Яе ўзросту дасканаласцю?

Е л і з а в е т а. Бацькі, што вы сабе думаеце? Ці не зараней вы рашылі прысвяціць сваю дачушку Богу? Марыя — адзінае ваша дзіця. Няхай бы самі яшчэ пацешыліся Яе ласкамі, уволю налюбаваліся Ёй. Яшчэ быў бы час і для выканання зароку!

С а р а. І сапраўды... Няхай бы яшчэ падрасла, умацавалася ў сіле, а потым адвялі б Марыю ў храм Божы. Тады і прысвяцілі б Яе Богу!

І а а к і м (з гонарам). Марыя ўжо здольная сваім чыстым сэрцам, незатуманеным розумам адклікнуцца на святыню, на славу, на дзівоснасць Божую.

Г а н н а (узрадавана). Цяпер я выконваю той самы зарок, які дала Госпаду ў час майго смутку. Я радуюся і весялюся, што Бог даў мне выканаць свой зарок. Для гэтай урачыстасці я сабрала шмат дзяўчат, свяшчэннікаў і сваякоў. Я ўсім кажу: «Радуйцеся са мной!» Стаўшы маці, я прыводжу сваю Дачку не к зямному цару, а к Цару Нябеснаму. Аддаю Яе самому Богу.

І а а к і м. Паклічце сюды дзяўчат і няхай яны возьмуць свечкі.

У пакоі з'яўляюцца сяброўкі Дзевы Марыі з запаленымі свечкамі. Яны выходзяць наперад. За імі становіцца Дзева Марыя, якую трымаюць за рукі Святыя бацькі, ззаду сваякі, суседзі. Ва ўсіх на тварах ззяе радасць. З духоўнай песняй шэсце выходзіць з дому. Каля Святога Храма Божага ўрачыстае шэсце з духоўнымі песнямі сустракаюць свяшчэннікі.

І а а к і м і Г а н н а (да Дзевы Марыі). Дзіця, ідзі! І будзь Таму, Хто ўсё Табе даў, узнясеннем і салодкай духмянасцю! Увайдзі ў тую глыбіню, уступі ў тую тайну, дзе няма ніякіх дзвярэй. Рыхтуйся стаць месцам усялення Самога Бога...

Г а н н а. Захарыя! Прымі прыгажуню гэту.
Свяшчэннік! Прымі бязгрэшны Каўчэг.
Прарок! Прымі Кадзільніцу вугалю нематэрыяльнага.
Праведнік! Прымі Кадзіла духоўнае.
Прарок! Прымі Дачку — дар мой Божы.
Прымі і ўвядзі Яе ў храм Тварца майго.

Пры ўваходзе ў храм пятнаццаць прыступак. Праведныя бацькі Іаакім і Ганна ставяць Дзеву Марыю на першую прыступку. Святая Дзева пры ўсеагульным здзіўленні сама па сабе ўзыходзіць да самай высокай прыступкі.

З а х а р ы я (урачыста). Благаславёны Гасподзь! Ты ўводзіш у храм сапраўдную Маці жыцця, якую Прарокі Божыя выразна прадказалі Багародзіцай. У Яе, як у Богаўмяшчальную Палату,

пажадае ўсяліцца Цар усіх народаў — Хрыстос. Якім жа чынам змесціць Яе храм?

Г а н н а. З'яўляючыся рабою Божаю, я малілася з верай, каб Гасподзь даў мне дзіця. І тады дала зарок, што народжаную прысвячу Таму, Хто даў Яе. Прымі ж гэту найдабрэйшую Дзеву.

З а х а р ы я. Сапраўды гэта так. Аднак мне новым і незвычайным прадстаўляецца, што Яна толькі ўводзіцца ў дом Божы і ўжо Боскай ласкай перавышае Святая Святых. (Пасля паўзы.) Цяпер я даведаўся, што пасярод храма ўзрасце дрэва. На ім вырасце Божы плод, які ўвядзе ў рай выгнаных з яго спажывай тлення. (Да Дзевы Марыі.) Чыстая Дзева! Твая душа на самай справе будзе словам незвычайнага вучэння. Дзева! Ты паселішся ў гэты Божы храм! (Пасля паўзы.) А для нас запалілася святланосная свечка, якая разлівае ў храме, нібы промні святла, найвялікшую радасць.

Першасвятар Захарыя ўводзіць Дзеву Марыю ў Святая Святых. Гучыць царкоўны песнаспеў.

Нараджэнне Іаана Прадцечы

Як прадказаў Архангел Гаўрыіл, у Захарыі і Елізаветы нарадзіўся сын. Яны вельмі ўсцешыліся. Разам з імі радаваліся сваякі. У тыя далёкія часы былі мнагадзетныя сем'і. Калі па якой-небудзь прычыне дзяцей не было, як у Захарыі і Елізаветы, гэта лічылася вялікім няшчасцем.

На восьмы дзень па закону іудзейскаму належала даць імя младзенцу. Сваякі і знаёмыя, што сабраліся разам, хацелі даць яму імя Захарыя — па яго бацьку. У той час дзецям давалі імёны бацькоў і сваякоў. Елізавета сказала: «Не, трэба назваць яго Іаанам». Ёй запярэчылі: «Нікога няма сярод тваіх родзічаў... хто называўся б гэтым імем». Звярнуліся да Захарыі і спыталі ў яго, як ён хацеў бы назваць сына. Захарыя папрасіў дошчачку і напісаў на ёй: «Іаан імя яму». Усе здзівіліся. І адразу яго нямота пакінула, ён загаварыў і ўславіў Бога.

Натхнёны Святым Духам, Захарыя прарочыў: «Благаславёны Гасподзь Бог Ізраілеў, што Ён наведаў народ Свой, і прынёс яму

збавенне, і ўзнёс жазло выратавання нам у доме Давіда, пасланца Свайго, як абвясціў праз пракрокаў Сваіх святых, што былі адвеку... І ты, дзіця, будзеш называцца прарокам Усявышняга, бо сваім прышэсцем папярэдзіш прышэсце Госпада — падрыхтуеш Яму шляхі, дапаможаш зразумець народу Яго ратунак праз дараванне ягоных грахоў па добрасардэчнай міласэрнасці нашага Госпада, які наведаў наш Усход зверху, каб прасвятліць тых, што сядзяць у цемры і смяротным ценю, каб накіраваць ногі нашыя на шлях міру».

Усе, хто чуў пра гэту падзею, са здзіўленнем прынялі ўсё блізка да сэрца і сказалі: «Што будзе з гэтага младзенца?»

Гасподзь ахоўваў младзенца, які рос і ўмацоўваўся духам. Іаан Прадцеча жыў у пустынях да дня з'яўлення свайго народу.

Нараджэнне святога слаўнага прарока Іаана Прадцечы святкуецца 7 ліпеня.

ПАКРОЎ ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ

Прачыстая Божая Маці пастаянна распасцірае свой малітвены Пакроў над намі. Яна ўмольвае Сына Свайго, Госпада нашага Ісуса Хрыста аб збаўленні нас ад усіх бед і аб дараванні нам вечнага выратавання.

Божая Маці асабліва праяўляе Свой малітвены Пакроў у час вялікага Божага гневу, калі Гасподзь карае людзей за грахі.

У сярэдзіне X ст. грэчаскі горад Канстанцінопаль быў акружаны сарацынамі. Жыхары горада малілі Госпада аб дапамозе.

У час начнога Богаслужэння ва Улахернскім храме блажэнны Андрэй раптам убачыў, што Прасвятая Дзева ідзе па паветры. Яна ззяла, як сонца, і была акружана прарокамі, апосталамі, Ангеламі і мноствам іншых святых. Багародзіца доўга малілася. Падышоўшы да Прастола, Яна зняла са Сваёй галавы пакроў і распасцёрла над тымі, хто маліўся ў храме. Святы Андрэй з хваляваннем назіраў гэта і спытаў у блажэннага Епіфанія: «Видишь ли, брат, Царицу и Госпожу, молящуюся о всем мире?» Епіфаній адказаў: «Вижу, святый отче, и ужасаюсь». Калі Божая Маці адышла, Пакроў стаў

нябачным. Дзякуючы заступніцтву Царыцы Нябеснай жыхары Канстанцінопаля адбілі нападзенне ворагаў.

У памяць аб гэтай падзеі было ўстаноўлена свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы, якое з вялікай любоўю адзначаецца Праваслаўнай Царквой 14 кастрычніка.

Хто з пакаяннем і шчырай малітвай звяртаецца да Божай Маці, хто па жыцці ідзе зісціннай верай, таму Яе Пакроў больш праяўляецца.

Трапар:

ДНЕСЬ, БЛАГОВЕРНИИ ЛЮДИЕ, СВЕТЛО ПРАЗДНУЕМ, ОСЕНЯЕМИ ТВОИМ, БОГОМАТИ, ПРИШЕСТВИЕМ И К ТВОЕМУ ВЗИРАЮЩЕ ПРЕЧИСТОМУ ОБРАЗУ УМИЛЬНО ГЛАГОЛЕМ: «ПОКРЫЙ НАС ЧЕСТНЫМ ТВОИМ ПОКРОВОМ И ИЗБАВИ НАС ОТ ВСЯКАГО ЗЛА, МОЛЯЩИ СЫНА ТВОЕГО, ХРИСТА БОГА НАШЕГО, СПАСТИ ДУШИ НАША».

ДЗІЎНАЯ МІЛАСЭРНАСЦЬ

(урывак з літаратурна-музычнай кампазіцыі Ф.А. Палачаніна «Пакроў Прасвятой Багародзіцы»)

На сцэне злева частка хаты (акно і дзверы). Справа у глыбіні сцэны — стог саломы.

Вядучыя стаяць на ранейшых месцах. Марыя з клункам у руках падыходзіць і асцярожна стукае ў акно. Адчыняюцца дзверы. На ганак выходзіць Гаспадар, а за ім і Гаспадыня высунула з дзвярэй галаву.

П е р ш ы в я д у ч ы. Час старажытны — далёкі.
Вуліца злога сяла.
Прачыстая Дзева Марыя
Падарожніцай Божай была.

Д р у г і в я д у ч ы. Вечар халодны, марозны.
Завіруха гуляла кругом.
Нясмела стукалася Марыя
Перад кожным акном.

М а р ы я. Добрыя, мілыя людцы!
Дазвольце ўвайсці ў дом,
Крыху адпачыць з дарогі,
Сагрэцца вашым цяплом.
Мне больш нічога не трэба!
Толькі б дачакацца святла.

П е р ш ы в я д у ч ы. Такая слёзная просьба
У Прачыстай Дзевы была.

Г а с п а д а р (са злосцю).
Многа тут розных ходзіць!
Цяпла ты ад нас не чакай...

Г а с п а д ы н я (перабівае яго).
Холадна нам тут з табою...
Хутчэй адсюль ступай!

Гаспадар і Гаспадыня вярнуліся ў хату. Марыя павольна пакрочыла да стога саломы.

П е р ш ы в я д у ч ы. Колькі чэрствасці, злосці
Было ў тых людзях,
Быццам не сэрца, а камень
Біўся ў іхніх грудзях.

Д р у г і в я д у ч ы. Прачыстая Дзева Марыя
Прытулку нідзе не знайшла.
З цяжкаю ношай на сэрцы
Пакрочыла з сяла.
Прыйшла да стога саломы,
Што быў недалёк ад сяла,
Стомлена там прысела
І волю слязам дала.

П е р ш ы в я д у ч ы. Плакала Божая Маці,
Бо крыўда трывожыла зноў.
Дайшлі Яе горкія слёзы
Да райскіх нябесных садоў.
Першы пачуў тыя слёзы
З горных высот быцця
Даўні прарок, граманосец,
Галоўны карацель Ілля.

Чуваць раскаты грому, удары перуна. Відаць водблескі маланак і пажараў.

Д р у г і в я д у ч ы. Імчацца крылатыя коні
Над тым нячыстым сялом.
У вогненнай ён калясніцы
Махае вогненным мячом.

П е р ш ы в я д у ч ы. Ляцяць грамавыя раскаты,
Сыплецца каменны град
Там, дзе цёплыя стрэхі,
Дзе падарожнікаў гоняць з хат.

Д р у г і в я д у ч ы. Ад запылаўшых пажараў
Усё наваколле азарылася.
Мальба аб выратаванні
Да Божай Маці дакацілася.

З хаты выскачылі Гаспадар і Гаспадыня з дзецьмі. Да іх далучыліся іншыя жыхары сяла.

Г а с п а д а р. Прасвятая Багародзіца,
Наведай нас хутчэй!
Сваёй дабрынёй і ласкай,
Сваім цяплом сагрэй!

Г а с п а д ы н я (слёзна).
Уратуй нас і дзетак нашых
Ад гэтай неспадзяванай навалы!
Збаў нас ад пажару,
Ад гэтай страшнай хмары!

Марыя ўстае, ідзе на авансцэну і разгортвае свой Пакроў.

П е р ш ы в я д у ч ы. Сэрца запоўніла жаласць.
М а р ы я. Божа, даруй ім усё зло!
П е р ш ы в я д у ч ы. З плеч Пакроў разгарнула
І прыкрыла сяло.

Д р у г і в я д у ч ы. Міласцю невыказнай
Грозны змякчыўся Ілля.
Маці Святая! Ты ўсіх уратавала.
Дзіўная міласэрнасць твая!

Раптоўна ўсталёўваецца цішыня, тухнуць пажары. Марыя павольна ідзе ў глыбіню сцэны.

Гучыць песня «Пакроў Божай Маці».

ІСУС ХРЫСТОС — НАШ НАСТАЎНІК

(урыўкі з літаратурна-музычнай кампазіцыі Ф.А. Палачаніна)

Гучыць грамзапіс песні «Мой духоўны сад». На авансцэну злева і справа выходзяць вядучыя — юнак і дзяўчына.

П е р ш ы   в я д у ч ы. У кожнага чалавека свой духоўны сад, створаны ўласнымі ўчынкамі, словамі, думкамі.

Д р у г і   в я д у ч ы. У нас ёсць уяўленне пра сябе, што мы сумленныя, праведныя і бязгрэшныя.

П е р ш ы   в я д у ч ы. Але ж колькі зла, крыўды, несправядлівасці, маральнай разбэшчанасці ёсць у нашым грамадстве!

Д р у г і   в я д у ч ы. Як часта мы бачым абуральныя ўчынкі разбэшчаных, злых людзей і ўсклікваем: «Гасподзь! Чаму Ты цяпер не пакараеш злых людзей? Чаму Ты даеш ім магчымасць карыстацца ўсімі дабротамі свету? Чаму яны адцясняюць, прыгнятаюць добрых?»

П е р ш ы   в я д у ч ы. На ўсе гэтыя пытанні дадзены адказ у прытчы Ісуса Хрыста пра пшаніцу і пустазелле. Царства Нябеснае ў ёй упадобнена чалавеку, які на сваім полі пасеяў добрую пшаніцу.

З глыбіні сцэны набліжаюцца два слугі, якія сеюць пшаніцу. У небе спяваюць жаўранкі.

П е р ш ы   с л у г а (стоячы на авансцэне). Дзякуй Богу, пасеялі!

Д р у г і   с л у г а (выціраючы пот з ілба). Цяпер і адпачыць крыху можна.

П е р ш ы   с л у г а. Ды не пашкодзіла б... Нямала папрацавалі.

Д р у г і   с л у г а. Няхай толькі родзіць пшанічка!

Слугі ідуць на край поля, здымаюць з сябе сявенькі, стомлена падаюць на траву і засынаюць. Чуваць крык крумкача. На полі з'яўляецца Вораг-чалавек з торбай на плячы. У яго страшны выгляд. Ён паспешліва штосьці сее.

В о р а г-ч а л а в е к (здзекліва). Пшанічкі захацелі!.. Зямельку выпытлявалі... На пух зрабілі... Во вам пшанічкі! Во! Во! Расці, пустазелейка! Расці! (Рагоча.) Заглушы іх пшанічку! (Убачыўшы людзей на ўскрайку поля, кідаецца наўцёкі.)

Зацямненне. Калі загараецца святло, на сцэне Гаспадар і яго слугі.

П е р ш ы с л у г а. На пшанічным полі столькі пустазелля...

Д р у г і с л у г а. Можа, насенне было нядобрае?

П е р ш ы с л у г а. Ці ж ты не памятаеш, якім мы сеялі?! Пшаніца была, як золата.

Д р у г і с л у г а. Дык адкуль жа пустазелле? Мы ж зямельку добра вырабілі.

П е р ш ы с л у г а. Здаецца, усё рабілі акуратна...

Г а с п а д а р. Я вас ні ў чым не віню. Гэта зрабіў Вораг-чалавек.

Д р у г і с л у г а. У нас жа няма ніякіх ворагаў.

П е р ш ы с л у г а. Ды і зла мы ніколі нікому не рабілі.

Г а с п а д а р. На вялікі жаль, на зямлі ёсць такія людзі, якіх вельмі раздражняюць чужыя радасць, поспех, удача...

П е р ш ы с л у г а. Мы выберам пустазелле да каліўца.

Д р у г і с л у г а. Ачысцім ад яго нашу пшаніцу.

Г а с п а д а р. Не трэба.

П е р ш ы і д р у г і с л у г і (разам). Чаму?

Г а с п а д а р. Каб, выбіраючы пустазелле, вы не павырывалі разам з ім пшаніцу.

П е р ш ы с л у г а. Мы яе акуратненька праполем.

Д р у г і с л у г а. Выратуем ад пустазелля.

Г а с п а д а р. Усё пакіньце разам да жніва. А ў час жніва я скажу жнеям, каб спачатку сабралі пустазелле і звязалі яго ў вязанкі для спальвання, а пшаніцу ўбралі ў жытніцу маю.

Гаспадар і слугі выходзяць.

П е р ш ы в я д у ч ы. Ісус Хрыстос вучыў, што ў Царстве Яго на зямлі — у Царкве Хрыстовай — да апошняга дня свету будуць знаходзіцца і грэшнікі. Такая воля Божая. Таму што Гасподзь даў чалавеку вобраз і падабенства Сваё — свабодную волю.

Д р у г і в я д у ч ы. Зло з’явілася ў свеце ад д’ябла, які пастаянна і хітра сее зло ў свеце — распаўсюджвае сярод людзей нявер’е і ўсялякую беззаконнасць.

П е р ш ы в я д у ч ы. У свабодным выбары дабра і адхіленні ад зла чалавек узвялічвае Бога, праслаўляе Яго і ўдасканальваецца сам.

Д р у г і в я д у ч ы. Церпячы пакуты ад злых, чалавек атрымлівае ад Бога вышэйшую ўзнагароду ў Царстве Нябесным.

П е р ш ы в я д у ч ы. Такім чынам Бог без усякага прымусу дае людзям з добрай воляй магчымасць заслужыць вечнае шчаслівае жыццё ў Царстве Нябесным.

Д р у г і в я д у ч ы. А людзям са злой воляй — вечныя пакуты ў пекле.

П е р ш ы в я д у ч ы. Таму, як збіраюць і спальваюць пустазелле, так будзе і ў час канца свету. Пашле Сын Чалавечы Ангелаў Сваіх, і збяруць з Царства Яго ўсіх спакуснікаў і тых, хто творыць беззаконнасць, і ўкінуць іх у печ вогненную. Там будзе плач і скрыгатанне зубоў.

Д р у г і в я д у ч ы. А праведнікі засвецяцца, як сонца, у Царстве вечнага блажэннага жыцця.

П е р ш ы в я д у ч ы. Аб грахоўнасці людзей, аб неабходнасці пакаяння і вяртання да Бога Ісус Хрыстос часта казаў народу і вучням Сваім у прытчах, на прыкладах, у вобразах.

Д р у г і в я д у ч ы. Аднойчы апостал Пётр спытаў у Ісуса Хрыста: «Госпадзе! Колькі разоў можна дараваць брату майму, які саграшае супроць мяне? Ці не сем разоў?»

Г о л а с І с у с а. Я табе не кажу сем разоў, але семдзесят разоў па сямі. Таму Царства Нябеснае ўпадобнена Цару, які надумаў разлічыцца з рабамі сваімі.

На сцэне Цар сядзіць на троне. Каля яго стаіць слуга са спісам даўжнікоў. Ахоўнік прыводзіць Раба-даўжніка.

Ц а р (паказваючы на спіс даўжнікоў). Ты мне вінен дзесяць тысяч талантаў.

Р а б - д а ў ж н і к. Памятаю, што вінен...

Ц а р. Ты павінен вярнуць іх мне цяпер.

Р а б - д а ў ж н і к. Я не маю чым аддаць.

Ц а р (слугам). Прадаць яго, жонку, дзяцей і ўсё, што ён мае, і вярнуць доўг!

Раб-даўжнік падае пад ногі Цару і кланяецца.

Р а б - д а ў ж н і к. Цару! Пашкадуй мяне і маю сямейку. Мы будзем і далей шчыра служыць. Злітуйся над намі! Пацярпі на мяне, усё табе заплачу.

Ц а р (падумаўшы). Я дарую табе доўг. (Слугам.) Адпусціце яго!

Ахоўнік выводзіць Раба-даўжніка. Той на вуліцы ўбачыў свайго Даўжніка.

Р а б - д а ў ж н і к. Эй ты, Даўжнік! (махае рукой.) Сюды хадзі!

Даўжнік падыходзіць. Раб-даўжнік абедзвюма рукамі хапае яго за шыю і пачынае душыць з крыкам:

Аддавай мне доўг! Ты, можа, ужо забыўся на яго?!

Д а ў ж н і к (упаўшы пад ногі). Я памятаю, што вінаваты сто дынарыяў...

Р а б - д а ў ж н і к (перапыняе яго). Калі памятаеш, чаму ж не аддаеш?

Д а ў ж н і к. Каб жа было чым аддаць...

Р а б - д а ў ж н і к. Ты, можа, спадзяешся, што я забудуся на іх?

Д а ў ж н і к. Не!..

Р а б - д а ў ж н і к. Я табе іх не дарую ні за што!

Д а ў ж н і к. Пацярпі на мяне! Я ўсё аддам...

Р а б - д а ў ж н і к (са злосцю). Чакаць больш не буду! Адпраўлю цябе ў цямніцу і будзеш там, пакуль не аддасі доўг.

Зацямненне. Калі загараецца святло, на сцэне зноў Цар на троне, а перад ім Ахоўнік і Раб-даўжнік.

Ц а р. Мне сказалі, што ты за сто дынарыяў доўгу пасадзіў у цямніцу свайго таварыша. Гэта праўда?

Р а б - д а ў ж н і к. А што ён думаў?! Калі пазычыў, дык няхай аддае! Я яму іх так не дарую.

Ц а р (злосна). Ліхі раб! Я дараваў табе ўвесь доўг. Ці не след было і табе пашкадаваць твайго брата, як і я пашкадаваў цябе?! Ці ведаеш, што твае таварышы за гэта вельмі пакрыўдзіліся на цябе?

Р а б - д а ў ж н і к. Калі яны яго так шкадуюць, няхай скінуцца на доўг.

Ц а р (строга). Аддаць яго ў кабалу! Не вызваляць, пакуль не аддасць мне доўгу ўсяго!

Ахоўнік выводзіць Раба-даўжніка. Потым выходзіць Цар.

Г о л а с І с у с а. Вось так і Айцец мой Нябесны зробіць з вамі, калі не будзеце ад сэрца дараваць свайму бліжняму ягоных грахоў.

На сцэне Пан. Перад ім тры рабы.

П а н. Я адпраўляюся ў чужую краіну. Даручаю вам свой маёнтак. І па вашай сіле кожнаму даю таланты. Табе даю пяць талантаў (аддае першаму рабу), табе — два (аддае другому), а табе — адзін (аддае трэцяму). Бывайце!

Р а б ы (разам). Шчаслівага вяртання дадому!

Зацямненне. Калі загараецца святло, на сцэне Пан і тры рабы.

П а н. Я хачу даведацца, як вы распарадзіліся тымі талантамі, што атрымалі перад маім ад'ездам.

П е р ш ы р а б (падышоўшы да пана). Пан! Пяць талантаў ты даў мне. (Паказвае ў адной руцэ.) А вось гэтыя пяць талантаў (паказвае ў другой) я набыў за іх.

П а н. Пахвальна, добры і верны раб! У асноўным ты паступіў правільна. Цяпер табе многае даручу. Будзеш у радасці з панам тваім.

Д р у г і р а б (падышоўшы да пана). Пан! Два таланты ты даў мне. (Паказвае.) Я набыў за іх яшчэ два.

П а н. Пахвальна, добры і верны раб! У асноўным ты паступіў правільна. Цяпер табе многае даручу. Будзеш у радасці з панам тваім.

Т р э ц і р а б (падышоўшы да пана). Пан, я ведаў, што ты чалавек жорсткі: жнеш, дзе не сеяў, і збіраеш, дзе не рассыпаў. Я, спалохаўшыся гэтага, пайшоў і зарыў твой талант у зямлю. Вось табе тваё. (Аддае адзін талант.)

П а н. Хітры і лянівы раб! Тваімі словамі буду судзіць цябе. Ты ведаў, што я жну, дзе не сеяў, і збіраю, дзе не рассыпаў. Таму і павінен быў ты аддаць серабро маё тым, хто гандлюе. І я, вярнуўшыся, атрымаў бы сваё з прыбыткам. Вазьміце ў яго талант і дайце таму, у каго дзесяць талантаў, бо кожнаму, хто мае, дабавіцца і прымножыцца. А ў таго, хто не мае, адбярэцца і тое, што ёсць. А нягоднага раба кіньце ў цемру пякельную.

Другі Раб бярэ і аддае талант першаму. Той кланяецца Пану. Потым першы і другі Рабы бяруць за падрукі трэцяга Раба і выводзяць. Пасля выходзіць і Пан.

П е р ш ы в я д у ч ы. Гэта прытча азначае: усе людзі атрымліваюць ад Госпада розныя дары, як жыццё, здароўе, сілы, душэўныя здольнасці, дары Святога Духа, жыццёвыя даброты і інш., каб гэтымі дараваннямі служыць Богу і бліжнім.

Д р у г і в я д у ч ы. Усе гэтыя дары Божыя і разумеюцца ў прытчы пад талантамі. Бог ведае, колькі трэба даць кожнаму па яго здольнасцях. Таму і атрымліваюць — адзін больш, другі менш.

П е р ш ы в я д у ч ы. Кожны чалавек павінен будзе адказаць Госпаду ў час Яго другога прышэсця, як выкарыстаў дары Божыя.

Д р у г і в я д у ч ы. Хто скарыстаў іх на карысць сабе і іншым, той атрымае пахвалу ад Госпада і вечныя нябесныя радасці, а лянівыя і нядбайныя людзі будуць асуджаны Госпадам на вечныя пакуты.

СЛОВА ДА ЧЫТАЧА

Вось і перагорнуты апошнія старонкі кнігі. Я маю надзею, што прачытанае знайшло дастойнае месца ў вашай памяці і сэрцы і вы не засталіся раўнадушнымі. Напэўна, кніга выклікала роздум аб сэнсе жыцця, можа, нават прымусіла задумацца, якім шляхам крочыць далей. Магчыма, вы ўжо зрабілі свой выбар. Народная мудрасць вучыць: добра быць у дарозе, якую сам сабе выбіраеш. Галоўнае, каб гэты выбар быў правільны, каб абраны шлях прывёў да шчасця і радасці.

Буду вельмі рады, калі кніга пасадзейнічае ўратаванню вашых думак, душы і сэрца ад зла і крыўды, несправядлівасці, здрады, нянавісці, калі яна дапаможа ўпэўнена рухацца да Сонца Праўды — да Хрыста. Галоўнае — не збочыць з гэтага шляху. Няхай шчырая вера ў Бога напоўніць сэрцы нязгасным святлом дабрыні, міласэрнасці, любові. Любіце Госпада, жыццё, Радзіму. Даражыце кожным імгненнем. Спяшайцеся рабіць толькі добрыя справы. Памятайце, што сэрца, напоўненае любоўю і дабрынёй, — самы вялікі скарб.

ЗМЕСТ

Ад аўтара 5

ПАЧАТКОВЫЯ ЗВЕСТКІ АБ ПРАВАСЛАЎНАЙ ВЕРЫ 7
Пра Свет 8
Пра Бога 9
Ісус Хрыстос — наш Збавіцель 10
Пра святых Ангелаў 11
Пра грэх 12
Пра крыж і знак крыжа 14
Пра храм 14
Паводзіны ў храме 15
Свечка 16
Кадзіла пахучае 18
Як рыхтавацца да Святога Прычашчэння 19
Благаславенне свяшчэнніка 20
Чаму мы называемся праваслаўнымі хрысціянамі 20
Благадатны Агонь Велікодны 21
Чаму праваслаўныя багаслужэнні вядуцца на царкоўнаславянскай мове . . . 22

СВЯТЫЯ 23
Пра святых 24
Святы прарок Ілія 25
Святы апостал Андрэй Першазваны 27
Святыя першавярхоўныя апосталы Пётр і Павел 28
Свяціцель Мікалай Цудатворац 29
Свяціцель Кірыла, епіскап Тураўскі 30
Святы велікамучанік і лекар Панцеляіман 31
Прападобны Сергій Раданежскі, Цудатворац 32
Прападобны Серафім Сароўскі, Цудатворац 34
Прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая 36
Святы дабраверны вялікі князь Аляксандр Неўскі 39
Святыя праведныя Іаакім і Ганна 40
Радасная вестка 41
Святы праведны Іаан Кармянскі 45
Святая блажэнная Ксенія Пецярбургская 46
Святыя бяссрэбранікі Касьма і Даміян 48

ІКОНЫ 49
Пра святыя іконы 50
Нерукатворны абраз Збавіцеля 51
Чанстахоўская ікона Божай Маці 52
Ікона Божай Маці «Скорапаслушніца» 54

Мінская ікона Божай Маці . . . 54
Жыровіцкая ікона Божай Маці . . . 55

МАЛІТВЫ . . . 57
Пра малітву . . . 58
Кароткія малітвы . . . 60
Розныя малітвы . . . 61
Самыя галоўныя малітвы . . . 64
Праваслаўны сімвал веры . . . 65

ПРАВАСЛАЎНЫЯ ПАСТЫ І СВЯТЫ . . . 67
Аб праваслаўных пастах . . . 68
Аб праваслаўных святах . . . 70
Светлае Хрыстова Уваскрасенне (Пасха) . . . 71
Раство Хрыстова . . . 73
Таямнічая ноч . . . 74
Хрышчэнне Гасподняе . . . 76
Стрэчанне Гасподняе (Грамніцы) . . . 77
Уваход Госпада ў Іерусалім (Вербніца) . . . 79
Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы . . . 80
Узнясенне Гасподняе (Ушэсце) . . . 81
Дзень Святой Тройцы (Пяцідзесятніца) . . . 82
Праабражэнне Гасподняе (Яблычны Спас) . . . 83
Успенне Прасвятой Багародзіцы (Першая Прачыстая) . . . 84
Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы (Другая Прачыстая) . . . 87
Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга . . . 88
Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы . . . 89
К Цару Нябеснаму . . . 90
Нараджэнне Іаана Прадцечы . . . 92
Пакроў Прасвятой Багародзіцы . . . 93
Дзіўная міласэрнасць . . . 94
Ісус Хрыстос — наш Настаўнік . . . 97
Слова да чытача . . . 102

Навукова-папулярнае выданне

ПАЛАЧАНІН ФЁДАР АНТОНАВІЧ

ШКОЛЬНІКАМ АБ ПРАВАСЛАЎНАЙ ВЕРЫ

Рэдактар *Т.І. Паснянкова*. Мастак і мастацкі рэдактар *В.Г. Загародні.*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютэрная вёрстка *Ж.М. Голікавай.*
Карэктары *Л.А. Адамовіч, Л.Р. Кузьміна, Л.К. Сямёнава*

Падпісана да друку 23.11.2006. Фармат 70×90 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура «Таймс».
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 7,6+2,63 укл. Ул.-выд. арк. 4,53+2,68 укл. Тыраж 4000 экз. Зак. 3160.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0056828 ад 02.03.2004. 220004, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.

Адкрытае акцыянернае таварыства "Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня".
225409, Баранавічы, Савецкая, 80.

11050

ISBN 985-01-0675-1
9 789850 106759